Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

26 ЛІПЕНЯ 2008 г.
СУБОТА
№ 138
(26251)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Надвор'е

На наступным тыдні пахаладае

У выхадныя тэрыторыя Беларусі трапіць пад уплыў Скадынаўскага антыцыклона, таму ў гэтыя дні пераважна будзе без ападкаў, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга Фядотава.

Толькі сёння ў асобных раёнах Брэсцкай і Гомельскай абласцей, а ў нядзелю па паўночным усходзе краіны магчымыя кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Вецер паўночна-ўсходні памераны, удзень парывісты. Тэмпература ў суботу 23—29, у нядзелю ўначы 12—17, удзень 22—28 градусаў.

Напачатку наступнага тыдня паўночныя ветры прынясуць да нас адносна халоднае паветра. Чакаецца, што ў панядзелак — па паўночным усходзе краіны, а ў апошнія дні ліпеня месцамі пройдуць невялікія дажджы. У апошнія два дні месяца тэмпература ўначы знізіцца да 8—11 цяпла, удзень — 16—21, па паўднёвым усходзе — да 24 градусаў.

Сяргей КУРКАЧ.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«У БЕЛАРУСІ ЁСЦЬ РЭЗЕРВЫ ДЛЯ РАДЫКАЛЬНАГА ЎЗДЫМУ ЭКАНОМІКІ ГАСПАДАРАК»

Аб'ём экспарту беларускай сельгаспрадукцыі можна падвоіць. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў час справаздачы Брэсцкага аблвыканкама аб ходзе выканання Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі на 2005—2010 гады.

Паводле яго слоў, у 2007 годзе за межы Беларусі прададзена сельгаспрадукцыі на суму больш як $2 млрд. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што прыняцце дзяржпраграмы адраджэння і развіцця вёскі было своечасовым і правільным крокам. «Сёння мы больш ясна разумеем значнасць і своечасовасць прыняцця праграмы. Нашай задачай было выратаваць вёску, прымусіўшы працаваць па сучасных тэхналогіях на супертэхналагічных прадпрыемствах і стварыўшы нармальныя ўмовы для жыхароў», — сказаў беларускі лідар.

Паводле яго слоў, сёння ва ўмовах крызісу на сусветным харчовым рынку Беларусь можа забяспечыць не толькі сваю харчовую бяспеку, але і мае магчымасць добра зарабіць.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што цяпер неабходна рэальна ацаніць, наколькі эфектыўна ажыццяўляецца гэты вельмі важны агульнадзяржаўны інвестыцыйны праект і на прыкладзе Брэсцкай вобласці падвесці вынікі зробленага за тры гады, вызначыць, што не ўдалося рэалізаваць, і ўстараніць прычыны недапрацовак, прыняць меры не толькі па выкананні, але і перавыкананні дзяржпраграмы, удакладніць тактыку дзеянняў і задачы на перспектыву.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што ў Беларусі ёсць рэзервы для радыкальнага ўздыму эканомікі гаспадарак.

Прэзідэнт падкрэсліў, што вынікам рэалізацыі дзяржпраграмы павінна стаць комплекснае развіццё сацыяльнай і вытворчай сферы, фарміраванне ўмоў для ўстойлівага вядзення сельскагаспадарчай вытворчасці, забеспячэнне вытворчасці канкурэнтаздольнай сельгаспрадукцыі і прадуктаў харчавання ў аб'ёмах, дастатковых для ўнутранага спажывання. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу таксама на тое, што разам са значным паляпшэннем эканамічных паказчыкаў не трэба забываць і аб уладкаванні быту сельскага насельніцтва, паляпшэнні ўмоў іх працы і павышэнні даходаў.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу з заўтрашняга дня пачаць масавую ўборку ўраджаю ва ўсіх рэгіёнах краіны.

«Час не церпіць. Пачалося хуткае выспяванне пасеваў. Злачынна будзе не пачаць масавую ўборку з заўтрашняга дня. Уся тэхніка заўтра павінна быць выведзена на палі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ёсць праблемы з уборкай збожжавых. Аднак, нягледзячы на іх палегласць, якая ў сярэднім па рэспубліцы складае 25 працэнтаў, тэхніка, што ёсць у гаспадарках, дае магчымасць падняць пасевы.

Фота БЕЛТА.

Многае ў паспяховым развіцці гаспадарак залежыць ад паваротлівасці кіраўнікоў, адзначыў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка даручыў кіраўніку Адміністрацыі Прэзідэнта прааналізаваць практыку назначэння на кіруючыя пасады. «У бліжэйшы час праверым і дадзім ацэнку кожнаму», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

На выкананне праграмы развіцця вёскі ў 2005—2007 гадах накіравана практычна Br46 трлн, або 125 працэнтаў да прадугледжанага аб'ёму фінансавання. З іх на развіццё сацыяльнай сферы затрачана Br11 трлн, вытворчай — амаль Br35 трлн, паведаміў Аляксандр Лукашэнка.

«Гэтыя інвестыцыі далі вынік. Гэта трэба прызнаць. Атрыманыя ў АПК паказчыкі гарантуюць харчовую бяспеку нашай краіны. Асноваі дасягнутых вынікаў стала інтэнсіўная мадэрнізацыя вытворчай базы», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён з задавальненнем адзначыў, што аблічча беларускай вёскі змянілася ў станоўчы бок, павысіўся ўзровень жыцця вяскоўцаў.

Паводле яго слоў, у 2005—2007 гадах ажыццёўлена рэканструкцыя больш як 900 жывёлагадоўчых фермаў, комплексаў і птушкафабрык. Актыўна ідзе новае будаўніцтва. «У бліжэйшыя два гады ў Беларусі будзе пабудавана ў кожным са 118 раёнаў па адной сучаснай малочнатаварнай ферме. У кастрычніку 2009 года кожны губернатар мне за гэтыя фермы адкажа. Я спецыяльна даваў даручэнні прапрацаваць будаўніцтва найбольш сучаснай у тэхналагічных адносінах і разам з тым незатратнай фермы. 7 праектаў адабралі — выбірайце і будуйце. Але лішніх грошай у гэтыя фермы ніхто ўкладваць не будзе», — падкрэсліў беларускі лідар.

Прэзідэнт таксама адзначыў, што ў сельскай мясцовасці павінны быць створаны нармальныя ўмовы для жыцця і дзяржава сёння можа гэта забяспечыць.

Прадуктовая кампанія, якая будзе ажыццяўляць экспарт сельскагаспадарчай прадукцыі, можа быць створана да канца 2008 года ў Беларусі.

Прэзідэнт наведаў выстаўку прадукцыі вядучых вытворцаў Брэсцкай вобласці. У час размовы з кіраўніком дзяржавы кіраўнікі перапрацоўчых прадпрыемстваў выказалі скаргі адносна праблем, што ўзнікаюць пры экспарце беларускіх тавараў на расійскі рынак. На іх думку, многіх цяжкасцяў можа было б пазбегнуць, калі дзейнічаць разам, стварыўшы своеасаблівы холдынг.

«Гэту прадуктовую кампанію вы мне пакажыце ў снежні», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка ў размове з вытворцамі.

У час наведвання Камянецкага раёна Прэзідэнт настойліва заклікаў кіраўнікоў у тэрміновым парадку прыняць меры па змяненні стылю кіравання.

Аляксандр Лукашэнка крытыкаваў урад за адсутнасць сістэмы па фінансавым аздараўленні сельгасарганізацый.

«Ураду, аблвыканкамам неабходна выпрацаваць дакладную сістэму па фінансавым аздараўленні сельгасарганізацый. Пакуль што вы ігнаруеце вырашэнне гэтага пытання», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу на тым, што галоўнае ў рабоце па выкананні дзяржпраграмы не знешні лоск, а стварэнне развітой высокаэфектыўнай вытворчасці. Неабходна пераадольваць вузкаведамасныя падыходы пры арганізацыі дзейнасці сельскагаспадарчых прадпрыемстваў.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на праблему занятасці сельскага насельніцтва. Паводле слоў Прэзідэнта, у перспектыве колькасць рабочай сілы ў вёсцы будзе скарачацца, што ўжо і назіраецца, у тым ліку і ў замежных краінах. «Гэта аб'ектыўны працэс, спыніць які мы не ў сілах. Аднак людзей выпіхваць з аграрадкоў нельга, іх трэба заняць», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што разам з рэалізацыяй Дзяржпраграмы адраджэння і развіцця вёскі не трэба забываць і пра праграму развіцця малых населеных пунктаў. На думку Прэзідэнта, выконваць іх трэба комплексна.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

Жыллё

СТАЛІЧНЫЯ КВАТЭРЫ БУДУЦЬ ТАННЕЦЬ І НАДАЛЕЙ

Згодна з падлікамі экспертаў рынку жыллёвай нерухомасці, за першае паўгоддзе сёлета цэны на мінскія кватэры знізіліся прыкладна на 6—7 працэнтаў. Разам з тым на працягу некалькіх тыдняў ліпеня назіралася стабілізацыя цэнаў па стандартных, не вельмі старых кватэрах. Аб якой сітуацыі на другасным рынку сталічнага жылля сёння ідзе гаворка? Ці чакае нас далейшае патанненне кватэр, або восенню нас чакае чарговая хваля падаражання жыллёвай нерухомасці? Сваімі меркаваннямі на гэты конт падзяліўся старшыня Савета Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ.

«СЛАБЕНЬКІЯ» КВАТЭРЫ ПРАЦЯГВАЮЦЬ ТАННЕЦЬ

Размова ідзе, галоўным чынам, аб невялікіх кватэрах з вельмі дрэннай планіроўкай у старых пяціпавярховых дамах. Зараз таннеюць усе віды «хрушчовак», ад аднапакаёвых да трохпакаёвых кватэр, за выключэннем любога па якасці жылля, якое знаходзіцца непасрэдна ў цэнтры сталіцы.

Згодна з табліцай статыстыкі інфармацыйнага каталога рэспубліканскага выдання «Нерухомасць Беларусі», сярэдні кошт квадратнага метра агульнай плошчы аднапакаёвых кватэр Мінска складае зараз 1920 долараў. Сярэдні кошт «аднапакаёўкі» сёння — 67 300 долараў. Невялікія па плошчы кватэры гэтай катэгорыі на крайніх паверхах прапануюцца зараз ужо толькі за 53—54 тысячы долараў. Увогуле, у разрад танных аднапакаёвак трапляюць кватэры коштам ад 55 да 60 тысяч долараў. Самы распаўсюджаны кошт аднапакаёвых кватэр у Мінску сёння складае ад 60 да 66 тысяч долараў. Менавіта па стандартных кватэрах гэтых катэгорый цяпер назіраецца спыненне тэндэнцыі на патанненне, аднак... Мікалай Прасталупаў лічыць, што пры афармленні рэальных здзелак і ў гэтым сегменце жыллёвай нерухомасці прадаўцы скідваюць каля 2—3 тысяч долараў. Эксперты рынку нерухомасці адзначаюць, што за апошнія 6 месяцаў больш за астатнія патаннелі менавіта аднапакаёвыя кватэры — прыкладна на 7 працэнтаў або на 4—4,5 тысячы долараў.

Працягваюць таннець і двухпакаёўкі. Сярэдні кошт квадратнага метра гэтых кватэр складае зараз 1910—1919 долараў. Сярэдні кошт «двушкі» ў сталіцы цяпер 95 800 долараў. Зусім слабенькія з агульнай плошчай да 44 квадратных метраў прапануюцца прадаўцамі ўжо толькі за 67—69 тысяч долараў. Звычайны цэннік стандартных двухпакаёвых кватэр у спальных раёнах сталіцы вагаецца ад 73 да 85 тысяч долараў. Падлічана, што двухпакаёвыя кватэры за паўгоддзе патаннелі крыху больш чым на 5 працэнтаў.

Вядома, што самы танны квадратны метр агульнай плошчы ў памеры 1880 долараў прапануецца прадаўцамі па сегменце трохпакаёвых кватэр. Самыя танныя трохпакаёўкі коштам 83—85 тысяч долараў прапануюцца ў пяціпавярховых дамах на крайніх паверхах. Кошт «квадрата» ў такіх трохпакаёвых «хрушчоўках» знізкаецца да 1600—1700 долараў. А вось сярэдні кошт трохпакаёвых кватэр усіх тыпаў складае цяпер 127 800 долараў.

ПАТАННЕННЕ ПРАЦЯГНЕЦЦА МІНІМУМ ДА КАСТРЫЧНІКА

Пакуль колькасць рэальных здзелак застаецца на вельмі малым узроўні, што адпавядае летняму варыянту развіцця жыллёвага рынку. Разам з тым, спецыялісты канстатуюць, што другасны рынак кватэр зноў пачаў працаваць. Праз механізм куплі-продажу нерухомасці працягваецца працэс абмену кватэр паміж рознымі сацыяльнымі групамі насельніцтва. Вядома, што каля 90 працэнтаў здзелак на сталічным другасным рынку нерухомасці ажыццяўляецца такім чынам, калі прадаўцы адначасова з'яўляюцца і пакупнікамі жылля іншай плошчы ці ў дамах іншых мікрараёнаў.

Летам на рынку жылля назіраецца зацішша, таму патанненне жылля працягнецца мінімум на некалькі месяцаў. Сталічныя спецыялісты жыллёвай нерухомасці ўпэўненыя, што кватэры ў Мінску павінны патаннець да той цаны, па якой яны сёння рэальна прадаюцца пры канкрэтных здзелках у сістэме чыстага продажу. Гэта цана цяпер вагаецца ў межах 1600—1700 долараў за квадратны метр агульнай плошчы.

ІПАТЭКА ПЛЮС БУДАЎНІЦТВА ЖЫЛЛЯ

Як будзе развівацца другасны рынак жыллёвай нерухомасці, калі сапраўды рэальна запрацуе механізм іпатэкі? Паводле меркавання Мікалая Прасталупава, гэты механізм пакуль, бадай, ніяк не паўплывае на цэны другаснага жылля ў сталіцы. Справа ў тым, што прыняты закон па іпатэцы не абмяжоўвае банкі па гранічных памерах ставак жыллёвых крэдытаў для насельніцтва. Чалавеку стане лягчэй атрымаць такія крэдыты пад заклад свайго будучага жылля, але крэдытныя рэсурсы ад гэтага для яго танней не стануць. Будавацца пад вялікія працэнты сёння згодзяцца толькі адзінкі. Набываць гатовае жыллё праз сістэму іпатэкі

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— таксама застаецца даволі дарагой справай. Толькі сапраўды маленькія працэнты жыллёвых крэдытаў уключаць зялёнае святло для бескватэрных жыхароў сталіцы, якія ў масавым парадку пачнуць вырашаць сваё жыллёвае пытанне. Гэта, у сваю чаргу, магло б справакаваць павышаны попыт на ўжо пабудаваныя кватэры, што выклікала б падаражэнне кватэр на другасным рынку сталіцы і іншых буйных гарадоў Беларусі. Пакуль такі сцэнарый развіцця падзей застаецца малаверагодным.

Эксперты лічаць, што, хутчэй за ўсё, больш рэальным стане зусім іншы сцэнарый — патанненне жыллёвай нерухомасці на другасным рынку сталіцы. Так, згодна з даручэннем Прэзідэнта краіны, у 2011 годзе штогадовая планка ўзвядзення жылля павінна дасягнуць 10 млн квадратных метраў. Зараз на 2009 год плануецца пабудаваць не 5,7 млн квадратных метраў жылля, а 6 млн «квадратаў»; у 2010 годзе — выйсці на 7,5 млн кв. метраў жылля. Істотнае павелічэнне тэмпаў будаўніцтва жылля можа сапраўды спыніць апетыты ўласнікаў лішняга жылля ў Мінску. **Начальнік упраўлення жыллёвага будаўніцтва Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Аляксандр ГОРВАЛЬ** упэўнены, што ўжо праз паўгода істотна актывізуецца сістэма долевага будаўніцтва, якая адцягне ў свой бок ільвіную долю патэнцыяльных пакупнікоў жылля, у якіх існуюць рэальныя фінансавыя сродкі. Справа ў тым, што зараз будаўніцтва сучаснага камфортнага жылля карыстаецца большым попытам, чым старыя «хрушчоўкі» і «панэлькі». З другога боку, будаўнічыя карпарацыі і банкі наладзілі сумеснае будаўніцтва шматпавярховых жыллёвых комплексаў у прыгарадных населеных пунктах сталіцы. Так, будаўнічыя трэсты ў Бараўлянах прапануюць кватэры ў пабудаваным доме па кошце 1550 долараў за квадратны метр, а таксама будаўніцтва трохпакаёвых кватэр па 1400 долараў за «квадрат». Нагадаю, што з Бараўлян у сталіцу курсіруе хуткі гарадскі аўтобус...

Сяргей КУРКАЧ.

Заўтра — Дзень работнікаў гандлю

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«Мы любім сваю прафесію і лічым, што нарадзіліся для яе, – кажуць прадавец з трохгадовым стажам працы Вольга БУЛАТАВА (на фота злева) і загадчыца секцыі з трыццацігадовым стажам Галіна ЖУК (на фота справа). — А яшчэ мы вельмі ганарымся сваім прадпрыемствам». Вольга і Галіна працуюць у краме, назва якой вядома кожнаму мінчаніну — "1000 дробязяў". Сёлета гэтае гандлёвае прадпрыемства адзначае сваё 45-годдзе і па-ранейшаму з'яўляецца любімым месцам пакупак у многіх гараджан.

Харчуемся ўсё больш якасна

У Беларусі назіраецца тэндэнцыя ў якасным змяненні структуры спажывання харчовых тавараў. Аб гэтым паведаміла прэс-сакратар Міністэрства гандлю Алена Кавалёва.

Паводле яе слоў, у апошнія гады ў рэспубліцы павялічваецца спажыванне бялагічна каштоўных харчовых прадуктаў. Так, у 2007 годзе спажыванне на душу насельніцтва рыбы склала 17,5 кг, алею — 15,8 кг, бульбы — 188 кг, агародніны — 141 кг, садавіны — 57 кг, мяса і мясапрадуктаў — 69 кг, малакапрадуктаў — 233 кг, цукру — 34,4 кг, хлебапрадуктаў — 93 кг, яек — 275 штук. Удзельная вага продажу магазінамі тавараў айчыннай вытворчасці ў аб'ёме рознічнага тавараабароту гандлёвай сеткі склала 78,5 працэнта, у тым ліку харчовых — 85,2 працэнта, нехарчовых — 69,1 працэнта.

БЕЛТА.

Сярод абітурыентаў-«лірыкаў» барацьба больш жорсткая, чым сярод «фізікаў»

2,6 чалавека на месца — сёлета менавіта такі конкурс на дзённую бюджэтную форму склаўся ў БДУ, паведамілі ў прэс-службе ўніверсітэта.

«Гуманітарыі» ў гэтым годзе аблюбавалі Інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій: менавіта там найбольшы конкурс сярод факультэтаў гуманітарнага профілю— 5,8 чалавека на месца. За ім ідуць гуманітарны — 5,4, эканамічны — 4,1, міжнародных адносінаў — 3,6, і юрыдычны — 3,5.

Што датычыцца прыродазнаўчага накірунку, то самае вялікае жаданне атрымаць студэнцкі білет маюць будучыя біёлагі — 2,6 чалавека на месца. На геаграфічным, механіка-матэматычным і хімічным факультэтах — 1,7 чалавека на месца.

Самым «гарачым» будзе паступленне, напэўна, для тых абітурыентаў, хто падаў дакументы на спецыяльнасць «дызайн» (напрамак «камунікатыўны дызайн») гуманітарнага факультэта, бо конкурс там сёлета складае 16,6 чалавека на месца. Стабільна высокім застаюцца конкурсы і на спецыяльнасці факультэта міжнародных адносінаў: 6,3 чалавека на «міжнародныя адносіны», 6,9 — на «міжнароднае права».

Дарэчы, сярод абітурыентаў БДУ былі «заўважаны» Міс Беларусь 2008, а таксама 124 пераможцы міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд і шэсць прызёраў чэмпіянатаў свету і Еўропы.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Паступіла 448 заяў на рэгістрацыю ініцыятыўных груп па вылучэнні кандыдатаў

Завяршылася падача заяў на рэгістрацыю ініцыятыўных груп па вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты шляхам збору подпісаў выбаршчыкаў. У акруговыя выбаркамы паступіла 448 адпаведных заявак. Аб гэтым паведаміў сакратар Цэнтральнай камісіі Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Мікалай Лазавік.

«Не ўсе ініцыятыўныя групы могуць быць зарэгістраваны. Акрамя таго, з'явяцца вылучэнцы ад палітычных партый і працоўных калектываў. Не выключана, што жадаючыя балатавацца прадублююць сваё вылучэнне некалькімі спосабамі», — сказаў Мікалай Лазавік.

У Беларусі налічваецца 110 акруг. Таму сярэдні конкурс па краіне складае больш як чатыры заявы на адну акругу ад жадаючых вылучацца шляхам збору подпісаў.

Сакратар Цэнтрвыбаркама канстатаваў, што 114 заяў паступіла ад членаў палітычных партый і 334 — ад беспартыйных. У ліку партый, якія маюць намер вылучаць сваіх прадстаўнікоў у парламент шляхам збору подпісаў грамадзян, — Аграрная (1 заява), Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада) (18), Кампартыя Беларусі (18), Ліберальна-дэмакратычная (1), Аб'яднаная грамадзянская партыя (29), Партыя «Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада» (6), БНФ (22), Партыя камуністаў Беларуская (18), Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці (1).

БЕЛТА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

МЗС РФ АБВІНАВАЦІЎ УКРАІНУ Ў НЕПРЫЯЗНЫХ ДЗЕЯННЯХ

МЗС Расіі абвінаваціў Украіну ў невыкананні дамоўленасцяў у сувязі з забаронай намесніку старшыні камітэта Дзярждумы РФ па справах СНД Канстанціну Затуліну на ўезд у краіну.

Нагадаем, Затулін быў затрыманы ў аэрапорце Сімферопаля ў чацвер. Яго не пусцілі на тэрыторыю Украіны па патрабаванні Службы бяспекі. Паводле інфармацыі СМІ, СБУ ўзбудзіла крымінальную справу ў дачыненні да Затуліна за спробу дэстабілізацыі сітуацыі падчас святкавання 1020-ых угодак Хрышчэння Русі. Адзначым, Затулін ужо быў абвешчаны персонай нон-грата ва Украіне, аднак у 2007 годзе Кіеў і Масква ліквідавалі спісы непажаданых персон.

ПАЙШОЎ З ЖЫЦЦЯ ЗНАКАМІТЫ АКЦЁР МІХАІЛ ПУГАЎКІН

У кіно знакаміты комік савецкага кіно праславіўся ролямі праараба ў фільме «Аперацыя «Ы» і іншыя прыгоды Шурыка» і айца Фёдара ў «12 крэслах». У Гільдыі акцёраў кіно Расіі паведамілі, што Міхаіл Іванавіч памёр у пятніцу днём з прычыны доўгай і працяглай хваробы.



У Гільдыі адзначылі, што пакуль няма рашэння аб тым, дзе і калі будзе пахаваны акцёр, а пытаннямі яго пахавання непасрэдна будзе займацца Саюз кінематаграфістаў Расіі.

У апошні час у Міхаіла Пугаўкіна, які толькі нядаўна адсвяткаваў 85-годдзе, былі сур'ёзныя праблемы са здароўем. Паводле некаторай інфармацыі, акцёр шмат гадоў пакутаваў ад цукровага дыябету.

3700 ДОЛАРАЎ ЗА АРЫШТ КАНДАЛІЗЫ РАЙС

Новазеландскія студэнты, якія праходзяць супрацоўніцтва амерыканскай ваеннай аперацыі ў Іраку, прапанавалі ўзнагароду ў 3700 долараў за арышт дзяржсакратара ЗША Кандалізы Райс падчас яе візіту ў краіну.

Гаворка ідзе аб працэдуры так званага грамадзянскага арышту, калі затрыманне праводзіцца не супрацоўнікамі праваахоўных органаў, а простымі грамадзянамі.

ВІЧ БОЛЬШ НЕ СМЯРОТНЫ: ХВАРЭЦЬ МОЖНА ДА СТАРАСЦІ

Дзякуючы ўдасканаленым метадам лячэння, у 90-х гадах працягласць жыцця для людзей з ВІЧ павялічылася на 41 год, а ў 2003—2005 гадах — у сярэднім яшчэ на 13 гадоў.

Навукоўцы лічаць, што ВІЧ ужо можна перавесці ў катэгорыю «доўгатэрміновых хранічных захворванняў», накшталт дыябету.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» по поручению комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства, при Мядельском райисполкоме

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенного в доход государства административного корпуса со встроенными гаражами (общ. пл. 941,7 кв.м). расположенного: г. Мядель, ул. Интернациональная, 17. Начальная цена — 175 052 000 бел. руб. Задаток 5 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Оплата за объект осуществляется в течение 2 месяцев и 25-ти дней с даты проведения торгов. Объект продается без условий. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 26.08.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 , к. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 25.08.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 224 61 34.
Сайт в Интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

на право заключения договора аренды земельного участка общей площадью 10,0000 га сроком на 50 лет для строительства производственного объекта различного назначения, расположенного в районе д. Раков Воложинского района. Начальная цена предмета аукциона – 747 034 840 бел. рублей. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 21.03.2008 г. **Аукцион состоится 14.08.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 13.08.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt.by

УНП 690324015

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 08138

Рэзананс

«СПАЧАТКУ БУЛЬДОЗЕР — ПОТЫМ СХОД»

Публікацыі пад гэтай назвай «Звязда» 14 мая г.г. расказала аб канфлікце жыхароў дамоў №№ 4, 6, 10, 30, 36 па вуліцы Максіма Танка ў Мінску і гарадскіх уладаў. Прычынай непаразумення стала рашэнне аб узвядзенні побач з гэтымі дамамі першых у гісторыі сталіцы хмарачосаў кампаніяй расійскага паходжання «Ітэра». Адказ Мінгарвыканкама на праблемны артыкул у «Звяздзе» за подпісам намесніка яго старшыні Н.А. Ладуцькі не задаволіў рэдакцыю газеты. Па сутнасці, гэта была банальная чыноўніцкая адпіска. Яна і рэдакцыйны каментарый былі надрукаваны ў «Звяздзе» 8 ліпеня г.г. у газету ад неабыякавых чытачоў прыйшлі пісьмы, звароты па Інтэрнэце і тэлефоне. Вытрымкі з рэдакцыйнай пошты мы сёння публікуем.

«На прыкладзе будаўніцтва вышыннага шматфункцыянальнага бізнэс-цэнтра мы, на жаль, сутыкнуліся з тыповай праявай бюракратычных адносінаў адміністрацыйных структур да меркавання грамадзян. Так, у адказе намесніка старшыні Мінгарвыканкама Н.А. Ладуцькі паведамляецца, што «па найбольш хвалюючых тэмах жыхарам гэтага квартала неаднаразова давалася пісьмовая інфармацыя па будаўніцтве згаданага аб'екта». Але абсалютна ніякай дадатковай інфармацыі мы не атрымлівалі!

Складваецца ўражанне, што ўсімі праўдамі і няпраўдамі гарадскія ўлады стараюцца без уліку крытычных меркаванняў грамадзян дабіцца рэалізацыі гэтага праекта. Без сумненняў, будаўніцтва бізнэс-цэнтра ў вельмі зручным месцы горада прынясе інвестару (расійская нафтагазавая кампанія «Ітэра») вялікі прыбытак, а Мінгарвыканкам атрымае дадатковыя сродкі для рэалізацыі іншых праектаў. Але не за кошт зручнасцяў, здароўя і бяспекі тысяч грамадзян.

Бо невыпадкова аб неабходнасці ўважлівых адносінаў да людзей у працэсе рэканструкцыі гарадоў гаварыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы ў Мінску з архітэктарамі ў гарадской ратушы ў маі г.г. Ён падкрэсліў, што цяпер няма праблем з інвестыцыямі ў добраўпарадкаванне горада. Задача ўлады, па яго словах, у гэтай сітуацыі зводзіцца да выбару такіх праектаў, якія ўпрыгожаць горад і зробяць яго яшчэ больш зручным для жыцця.

А праект будаўніцтва бізнэс-цэнтра, мяркую, не адпавядаецца арыгінальнасцю і не ўпрыгожыць горад, а, хутчэй, пагоршыць сацыяльна-эканамічныя ўмовы жыцця тысяч грамадзян».

В. Вільтоўскі.

***

«Як удзельніца сустрэчы жыхароў дамоў №№ 4, 6, 10, 30, 36 па вуліцы Максіма Танка з прадстаўнікамі зацікаўленых арганізацый, сведчу, што ніякага «грамадскага абмеркавання» будаўніцтва бізнэс-цэнтра не было. Усе выступленні чыноўнікаў зводзіліся да падкрэслівання адной думкі: рашэнне аб узвядзенні бізнэс-цэнтра прынята даўно аўтарытэтнымі органамі і будзе абавязкова выканана ў намечаныя тэрміны. Такі характар насяць і адказы адміністрацыі Цэнтральнага райвыканкама і Мінгарвыканкама на пісьмы жыхароў дамоў па вуліцы Максіма Танка. У пісьмах, лічу, няма адказаў на пастаўленыя пытанні».

Ларыса.

***

«Ці варта ўзводзіць хмарачосы ў густанаселеным раёне горада, не маючы адпаведнага вопыту і нарматыўна-прававой базы? Зразумела, не, скажа амаль кожны мінчанін. Адна з дзвюх вежаў бізнэс-цэнтра будзе вышынёй 217 метраў. Гэта ў два з паловай разы вышэй, чым будынак Нацыянальнай бібліятэкі. А яна, між іншым, адна з самых высокіх пабудоў сталіцы.

20—21 мая г.г. у Мінску праходзіла міжнародная канферэнцыя «Вопыт узвядзення вышынных будынкаў і будаўніцтва ўнікальных аб'ектаў у краінах СНД і Еўрасаюза». На ёй выступіў намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва Анатоль Нічкасаў, які, у прыватнасці, заявіў, што ў бліжэйшы час трэба ўвесці ў дзеянне нормы праектавання і будаўніцтва будынкаў вышынёй звыш 75 метраў. Яны, па яго словах, павінны ахапіць увесь спектр праблем узвядзення вышынных будынкаў: вялікія нагрузкі, складаныя інжынерныя сістэмы, сістэмы бяспекі і эвакуацыі ў надзвычайных сітуацыях і г.д. Такая нарматыўная база, згодна з выступленнем А. Нічкасава, знаходзіцца пакуль у працэсе распрацоўкі.

Няцяжка заўважыць, што выступленне намесніка міністра закранала найперш тэхнакратычны бок гэтых нарматыўных патрабаванняў. У іх не ўтрымліваецца сацыяльна-гуманітарных крытэрыяў і патрабаванняў, звязаных з асаблівасцямі пэўных раёнаў, павышэннем якасці жыцця іх насельнікаў, абаронай іх фізічнага і псіхічнага здароўя, забеспячэннем іх бяспекі не толькі ўнутры вышынных будынкаў, але і вакол іх.

Улічваючы складанасць і шматграннасць гэтай праблемы, было б правільным увядзенне ў практыку судоў усіх ступеняў, у тым ліку Канстытуцыйнага і Вярхоўнага, строгі кантроль за працэсам распрацоўкі і рэалізацыі зацвярджаных Прэзідэнтам і Урадам Беларусі нарматыўных патрабаванняў да вышыннага будаўніцтва».

Н. Гардзееў.

***

«Здзіўляе перакананасць чыноўнікаў у тым, што будаўніцтва на месцы сквера дзвюх вежаў-хмарачосаў, паркінга і 30-павярховага жылога дома «адпавядае сучасным тэндэнцыям развіцця горадабудаўнічага асяроддзя сталічнага цэнтра».

Наколькі мне вядома, ні ў адной еўрапейскай сталіцы хмарачосы не ўзводзіліся ў раёнах жылой забудовы 6—9-павярховых дамоў, як гэта робіцца па вуліцы Максіма Танка. Хмарачосы па эстытычных меркаваннях і меркаваннях бяспекі патрабуюць вакол сабе адкрытай прасторы. Нездарма ні ў Санкт-Пецярбургу, ні ў Парыжы гэтага сабе не дазволілі. У Парыжы быў створаны асаблівы раён для вышынных будынкаў: бізнэс-цэнтраў і гатэляў».

Алег.

***

«Шаноўны спадар Ладуцька! Няўжо вы думаеце, што нам, жыхарам яшчэ пакуль прыгожага горада, абрыдзеў яго натуральны зялёны ландшафт, які мудра зберагліся славутыя архітэктары Кароль, Заборскі, Грыгор'еў? Няўжо вы лічыце, што нам будзе прыемна і радасна хадзіць на станцыю метро «Фрунзенская» не па алейках нашага сквера, а па «штучным ландшафце», «другім паверсе», «другой зямлі», праз «крыты скразны праход». Запэўніваю, нам яшчэ не надакучыла хадзіць па зямлі, створанай Богам, а не чыноўнікамі».

Svetlana.

***

«Мы вельмі ўдзячныя вам за аб'ектыўную ўвагу да праблемы, якая ўжо 6 месяцаў грукоча экскаватарамі і дае ведаць аб сабе клубамі пылу ў нас пад вокнамі. Праблема гэта — будаўніцтва бізнэс-цэнтра, бачыцца нам сур'ёзнай вартай грунтоўнага абмеркавання.

З адказу намесніка старшыні Мінгарвыканкама са здзіўленнем даведаліся, што САТ «Ітэрабелбуд» выбрала зямельны ўчастак у сакавіку 2004 года і атрымала дазвол на правядзенне там праектна-пошукавых работ у верасні таго ж года. Такім чынам, больш як 4 гады таму Мінгарвыканкам зацвердзіў будаўніцтва першых у сталіцы хмарачосаў, якія, згодна з адказам «Звяздзе» спадара Ладуцькі, зробяць больш «багатым сілуэт цэнтральнай часткі горада і змогуць завяршыць горадабудаўнічую перспектыву». І ўсе гэтыя 4 гады аб такім грандыёзным будаўніцтве, аб стварэнні новых контураў горада, якія разам з будынкамі Прывакзальнай плошчы і абеліскам Перамогі гатовыя стаць яго сімваламі (ці замест іх), няма шырокай інфармацыі. І толькі пасля сабранага ў экстранным парадку сходу жыхароў дамоў №№ 4, 6, 10, 30, 36 па вуліцы Максіма Танка для «грамадскага абмеркавання праекта», перспектывы будаўніцтва бізнэс-цэнтра трохі праясніліся. Аказалася, на тэрыторыі, супастаўнай з плошчай сярэдняга памеру стадыёна, будуць узведзены гіганцкія аб'екты. У гадзіны пік тут будзе велізарнае стоўпатварэнне.

Ларыса Карсакова.

Водгукі тых, хто прачытаў артыкул, атрымаліся некалькі аднатыпныя, але размова пра важны аспект нашага гарадскога жыцця працягваецца. Пішыце!

Падрыхтаваў Леанід ЛАХМАНЕНКА.

ПАМЕР ДАПАМОГІ ПА ДОГЛЯДЗЕ ІНВАЛІДАЎ І САСТАРЭЛЫХ ПАВЯЛІЧЫЎСЯ

Памер дапамогі па доглядзе інвалідаў I групы, а таксама асобаў, якія дасягнулі 80-гадовага ўзросту, павялічыўся. Як паведаміла **БЕЛТА** вядучы спецыяліст аддзела назначэння і выплаты пенсій Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Лілія Корчык, памер дапамогі цяпер складае 65 працэнтаў бюджэту пражыткавага мінімуму — 136 290 рублёў. Калі чалавек даглядае дваіх і больш людзей, то дапамога выплачваецца ў памеры 100 працэнтаў БПМ (209 680 рублёў).

КАНДУКТАР, ЯКАЯ ВЫПАЛА З АЎТОБУСА, ПАМЕРЛА Ў БАЛЬНІЦЫ

У цяжкім стане яна трапіла ў рэанімацыйнае аддзяленне абласной клінічнай бальніцы. А здарылася гэта ў Гомелі ў аўтобусе, што ходзіць па трэцім маршруце. Выдаючы білет чарговаму пасажыру і не трымаючыся пры гэтым за поручні, калі аўтобус рабіў паварот з адной вуліцы на другую, кандуктар страціла раўнавагу і яе кінула спінай на дзверы, якія нечакана адчыніліся. Жанчына моцна ўдарылася аб асфальт.

— Калі яе даставілі ў бальніцу, — расказвае намеснік галоўнага ўрача гэтай установы Аляксандр Шукайлаў, — урачы змагаліся за яе жыццё, хоць сітуацыя была безнадзейнай. Жанчына так і не прыйшла ў прытомнасць. Трэба заўважыць, што гэта першы такі выпадак у рабоце транспартнікаў вобласці. Таму вядзецца расследаванне: чаму так здарылася, чаму не вытрымалі дзверы? З кандуктарамі ўсіх аўтобусаў горада праведзены дадатковы інструктаж.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

«ДАЎГІ» ПАЦЯГНУЛІ ЗА МІЛЬЯРД...

Прадпрымальны гамяльчанін крыху больш як за два гады паспеў «накапіць» падаткаў, якіх не плаціў дзяржаве, на мільярд рублёў.

Паводле звестак прэс-службы Камітэта дзяржкантролю, падазроны ў студзені 2006 года стварыў і зарэгістраваў таварыства з дадатковай адказнасцю «СаторыСэрвіс», аднак пры гэтым ён не меў намеру ажыццяўляць статутную дзейнасць. Паводле інфармацыі праваахоўнікаў, у выніку дзейнасці згаданага прадпрыемства дзяржаве быў нанесены ўрон у выглядзе нявыплаты падаткаў у асабліва буйным памеры ў суме 1,3 мільярда рублёў.

Ігар ГРЫШЫН.

Абзац

■ 18 пашкоджаных паваленымі дрэвамі машын, 53 жылыя дамы, што засталіся без электрычнасці, — такія наступствы града, што на працягу 15 хвілін ішоў у Брэсце. Град суправаджаўся парывамі ветру да 21 метра ў секунду. Кавалачкі лёду, што ляцелі з неба, дасягалі ў дыяметры 1,5 см. Паколькі град выпаў у горадзе, грамадскія палі не пацярпелі.

■ Каля пяці гадзін шукалі вадалазы цела 12-гадовай дзяўчынкі, якая патанула ў водаканале па вуліцы Каліноўскага ў Мінску. Нясчасны выпадак адбыўся ў чацвер, каля 19 гадзін. Вадалазы прыбылі на месца здарэння праз некалькі хвілін пасля паведамлення, але толькі ў пачатку першай гадзіны ночы знайшлі цела.

■ Аўтобус з турыстамі з Беларусі, што ехалі ў Крым на адпачынак, урэзаўся ў дрэва на горнай дарозе каля Судака. У аўтобуса маркі «Неаплан» сапсаваліся тармазы, вадзіцелю ўдалося выруліць у тупік. Аўтобус урэзаўся ў дрэва і спыніўся. Вадзіцель атрымаў чэрапна-мазгавую траўму. Пасажыры не пацярпелі.

■ Пінскія памежнікі затрымалі 12 грамадзян Украіны за 1,4 км ад дзяржаўнай мяжы. Усе яны заявілі, што збіралі ў памежжы грыбы і ягады. Парушальнікі затрыманыя на трое сутак для разбору.

Поўны абзац

■ Кітайскія біёлагі выступаюць супраць новага захаплення сярод мясцовай моладзі: жывыя рыбкі сталі модным упрыгажэннем. Дзяўчаткі-падлеткі проста змятаюць з прылаўкаў пластыкавыя кулоны з рыбкамі ўнутры. Гэтыя «акварыўмы» ўтрымліваюць унутры ваду, корм і кісларод у дастатковай на тры месяцы колькасці. Па заканчэнні гэтага тэрміну кулон можна адчыніць і выпусціць рыбку на волю. Каштуе такі кулон каля 40 цэнтаў за штуку. Вучоныя-біёлагі лічаць такую моду жорсткай і патрабуюць забараніць продаж упрыгажэнняў.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Нататкі звычайнага грамадзяніна

Вам — у дыспансэр!

Сяджу дома, як кажуць, нікога не чапаю. Званок ў дамафон. Чую, на вуліцы вельмі эмацыянальна гавораць маці і нейкая незнаёмая жанчына. Быццам бы спрачаюцца. Таямнічая жанчына пенсійнага ўзросту, калі ўвайшла ў кватэру, убачыўшы мяне, адразу прапанавала распісацца на нейкім дакуменце.

«Што, навошта?» У адказ: «Вы — Аляксандр? Мяне прасілі проста даставіць гэтую паперу, так што распісвайцеся». Далей было яшчэ больш цікава.

Працягвае мая нечаканая госця мне паперу, а там... штамп скурна-венерычнага дыспансэра.

— Ды гэта, напэўна, не мне?

— Вам!

— А што здарылася?

— Не ведаю, я проста павінна была вам прынесці гэты дакумент, распісвайцеся!

— Ды не мне. Не буду распісвацца, калі не ведаю, у чым прычына.

— Вам... Распісвайцеся!!!

Не буду далей цытаваць доўгі дыялог. Паглядзеў я ўважліва на назву: прозвішча зусім іншае, як і нумар дома. У мяне 17, а тут указаны суседні. Адзінае, што нас «звязвае» з патэнцыйным кліентам дыспансэра, дзе лечаць хваробы ад «задавальнення», — гэта імя і нумар кватэры. Чаму не спыталі маё прозвішча? Няўжо цяжка ветліва папрасіць пашпарт? Ды наогул, пераблытаць нумар дома... Ну чым не сюжэт для камедыі? Пры гэтым быць такой настойлівай.

Уяўляю сабе рэакцыю, напрыклад, жанатага мужчыны, калі б яму па памылцы такое прынеслі, а дома якраз знаходзілася жонка. Вядома ж, памыляюцца ўсе. У тым жа дыспансэры, наколькі я ведаю, ёсць спецыяльнае «падраздзяленне» па «выяўленні» ланцужка палавых сувязяў пацыента, у якога знайшлі, напрыклад, сіфіліс. І, безумоўна, прафесіяналаў там больш, чым такіх, якая прыйшла да мяне. Казус, але не смешна.

Як бацька двух малых перыядычна бываю ў дзіцячай паліклініцы. Чэргі там, на жаль, — норма, як і недахопы ў рабоце. Ну а як назваць наступнае?

— Вось амбулаторная кніжка вашага хлопчыка, толькі калі пойдзеце ў наступны кабінет, нікому не паказвайце. Схавайце, — сказала ўрач.

— Чаму?

— Так трэба!

Аказваецца, кніжку павінен перадаць калегу непасрэдна работнік паліклінікі. Ніколі, дарэчы, не забуду выказвання медперсаналу бліз рэгістратуры: «Ну, дасталі гэтыя дзеці!». Безумоўна, настрой можа быць дрэнны ў кожнага з нас. Але ж нельга, напэўна, так адкрыта выказваць незадаволенасць сваёй «нялёгкай доляй», тым больш у прысутнасці бацькоў і дзяцей. Між іншым, там жа ўжо ў наступны раз я выпадкова пачуў вельмі нечаканую гучную размову мясцовага начальства з падначаленымі: «Заўтра да нас прыязджае камісія, так што пастарайцеся. Усміхаемся і так далей». А, выходзіць, завершыць сваю работу камісія, і добрыя ўрачы перайтворацца ў «монстраў» у белых халатах?

Медыкам павышаюць зарплату. Добра. А як пры гэтым пракантраляваць — ці павысілася эфектыўнасць іх работы ў кожным канкрэтным выпадку? Ды ніяк, напэўна! Толькі не падумайце, што я супраць урачоў. Дзякуй тым, хто стараецца працаваць сумленна. Безумоўна, крытыкаваць прасцей? Але ж не трэба забываць, што добрыя адносіны з боку ўрача дапамогуць і ў лячэнні пацыента.

Дарэчы, пра заробкі. Па мясцовым тэлебачанні паказвалі сюжэт. Адзін з кіраўнікоў аблвыканкама прымае насельніцтва. Паказваюць урача, які прыйшоў на прыём са сваёй бабуляй-ветэранам. Апошняя вельмі хоча, каб ва ўнука было ўсё добра. Раней ён займаў нядрэнную пасаду. Нешта не атрымалася, перавялі ў іншае месца з зарплатай, калі не памыляюся, 1,8 мільёна. Зноў праблемы. І чуо, што дадуць яму апошні шанц — папрацуе там, куды накіруюць, а потым паглядзяць, мо новую добрую пасаду прапануюць?.. Во які кар'ерны рост у перспектыве.

Вось неаднаразова даводзілася чуць ад медыкаў, што калі ўпраўленне аховы здароўя ўзначаліў новы чалавек з правінцыі, «цяжка працаваць стала». Ганяе. Думаецца, правільна робіць. Безумоўна, здароўе больш будзе цікавіць радавых грамадзян, калі ў паліклініках і іншых медыцынскіх установах іх будуць якасна і ветліва абслугоўваць. А пакуль што не вельмі хочацца ісці ў тыя ж паліклінікі. Колькі б ні гаварылі па тэлебачанні пра агульную дыспансэрызацыю і іншае.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

АВІЯРЭЙС «ГРОДНА—КАЛІНІНГРАД» — ТРЫ РАЗЫ НА ТЫДЗЕНЬ

Авіярэйс «Гродна—Калінінград» з 2 па 30 жніўня будзе ажыццяўляцца тры разы ў тыдзень замест двух. Аб гэтым паведаміў начальнік Гродзенскага філіяла рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белаэранавігацыя» Анатоль Купрашэвіч.

Паводле яго слоў, акрамя панядзелка і пятніцы, гродзенскі аэрапорт увядзе дадатковы рэйс па суботах. Час вылету з Гродна ранейшы — 16.05. Не зменіцца і кошт авіябілета (59 еўра). Такое рашэнне прынята ў сувязі з павышаным попытам на авіярэйс. Перамяшчаючыся на самалёце з Беларусі ў Расію праз паветраную прастору Літвы, пасажыры эканомяць на Шэнгенскай візе, адзначыў субяседнік. **БЕЛТА**.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

на право заключения договора аренды для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

Организатор аукциона: Октябрьский сельский исполнительный комитет

222013, д. Прошика, ул. Центральная, д. 9 Крупского района Минской области

№ лота	Кадастровый номер, адрес земельного участка, номер участка	Целевое назначение	Площадь (га)	Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений	Начальная цена земельного участка (бел. руб.)	Размер задатка и реквизиты для его внесения	Расходы по подготовке документации, необходимой для проведения аукциона	Дата и время проведения аукциона	Окончательный срок приема документов
1	Земельный участок с кадастровым номером 623084008601000098, расположенный по адресу: Минская обл., Крупский р-н, д. Худово, участок № 1	Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома	0,1000	Отсутствие инженерных коммуникаций и сооружений	12680	1270 бел. руб. р/с 3602618000003 в ф-ле № 610 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Крупки, код 517, УНП 600095089, код платежа 04901, получатель платежа: финансовый отдел Крупского райисполкома	546716	26.08.2008 г. в 15.00	22.08.2008 г. до 17.00
2	Земельный участок с кадастровым номером 623084008601000097, расположенный по адресу: Минская обл., Крупский р-н, д. Худово, участок № 2	Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома	0,1500	Отсутствие инженерных коммуникаций и сооружений	19020	1900 бел. руб. р/с 3602618000003 в ф-ле № 610 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Крупки, код 517, УНП 600095089, код платежа 04901, получатель платежа: финансовый отдел Крупского райисполкома	546716	26.08.2008 г. в 15.00	22.08.2008 г. до 17.00
3	Земельный участок с кадастровым номером 623084008601000099, расположенный по адресу: Минская обл., Крупский р-н, д. Худово, участок № 3	Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома	0,1500	Отсутствие инженерных коммуникаций и сооружений	19020	1900 бел. руб. р/с 3602618000003 в ф-ле № 610 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Крупки, код 517, УНП 600095089, код платежа 04901, получатель платежа: финансовый отдел Крупского райисполкома	546716	26.08.2008 г. в 15.00	22.08.2008 г. до 17.00
4	Земельный участок с кадастровым номером 623084007101000030, расположенный по адресу: Минская обл., Крупский р-н, д. Сторожище, участок № 5	Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома	0,0515	Отсутствие инженерных коммуникаций и сооружений	8580	860 бел. руб. р/с 3602618000003 в ф-ле № 610 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Крупки, код 517, УНП 600095089, код платежа 04901, получатель платежа: финансовый отдел Крупского райисполкома	546716	26.08.2008 г. в 15.00	22.08.2008 г. до 17.00
5	Земельный участок с кадастровым номером 623084007101000032, расположенный по адресу: Минская обл., Крупский р-н, д. Сторожище, участок № 6	Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома	0,0583	Отсутствие инженерных коммуникаций и сооружений	9710	970 бел. руб. р/с 3602618000003 в ф-ле № 610 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Крупки, код 517, УНП 600095089, код платежа 04901, получатель платежа: финансовый отдел Крупского райисполкома	546716	26.08.2008 г. в 15.00	22.08.2008 г. до 17.00
6	Земельный участок с кадастровым номером 623084007101000033, расположенный по адресу: Минская обл., Крупский р-н, д. Сторожище, участок № 15	Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома	0,2500	Отсутствие инженерных коммуникаций и сооружений	31702	3170 бел. руб. р/с 3602618000003 в ф-ле № 610 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Крупки, код 517, УНП 600095089, код платежа 04901, получатель платежа: финансовый отдел Крупского райисполкома	546716	26.08.2008 г. в 15.00	22.08.2008 г. до 17.00
7	Земельный участок с кадастровым номером 623084007101000034, расположенный по адресу: Минская обл., Крупский р-н, д. Сторожище, участок № 4	Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома	0,1500	Отсутствие инженерных коммуникаций и сооружений	19021	1900 бел. руб. р/с 3602618000003 в ф-ле № 610 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Крупки, код 517, УНП 600095089, код платежа 04901, получатель платежа: финансовый отдел Крупского райисполкома	546716	26.08.2008 г. в 15.00	22.08.2008 г. до 17.00
8	Земельный участок с кадастровым номером 623084007101000035, расположенный по адресу: Минская обл., Крупский р-н, д. Сторожище, участок № 11	Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома	0,1500	Отсутствие инженерных коммуникаций и сооружений	19021	1900 бел. руб. р/с 3602618000003 в ф-ле № 610 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Крупки, код 517, УНП 600095089, код платежа 04901, получатель платежа: финансовый отдел Крупского райисполкома	546716	26.08.2008 г. в 15.00	22.08.2008 г. до 17.00
9	Земельный участок с кадастровым номером 623084008601000096, расположенный по адресу: Минская обл., Крупский р-н, д. Худово, участок № 8	Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома	0,1000	Отсутствие инженерных коммуникаций и сооружений	12680	1270 бел. руб. р/с 3602618000003 в ф-ле № 610 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Крупки, код 517, УНП 600095089, код платежа 04901, получатель платежа: финансовый отдел Крупского райисполкома	546716	26.08.2008 г. в 15.00	22.08.2008 г. до 17.00
10	Земельный участок с кадастровым номером 623084008601000095, расположенный по адресу: Минская обл., Крупский р-н, д. Худово, участок № 9	Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома	0,1000	Отсутствие инженерных коммуникаций и сооружений	12680	1270 бел. руб. р/с 3602618000003 в ф-ле № 610 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Крупки, код 517, УНП 600095089, код платежа 04901, получатель платежа: финансовый отдел Крупского райисполкома	546716	26.08.2008 г. в 15.00	22.08.2008 г. до 17.00
11	Земельный участок с кадастровым номером 623084007101000031, расположенный по адресу: Минская обл., Крупский р-н, д. Сторожище, участок № 12	Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома	0,1089	Отсутствие инженерных коммуникаций и сооружений	18450	1840 бел. руб. р/с 3602618000003 в ф-ле № 610 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Крупки, код 517, УНП 600095089, код платежа 04901, получатель платежа: финансовый отдел Крупского райисполкома	546716	26.08.2008 г. в 15.00	22.08.2008 г. до 17.00
12	Земельный участок с кадастровым номером 623084008601000094, расположенный по адресу: Минская обл., Крупский р-н, д. Худово, участок № 13	Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома	0,1000	Отсутствие инженерных коммуникаций и сооружений	12680	1270 бел. руб. р/с 3602618000003 в ф-ле № 610 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Крупки, код 517, УНП 600095089, код платежа 04901, получатель платежа: финансовый отдел Крупского райисполкома	546716	26.08.2008 г. в 15.00	22.08.2008 г. до 17.00
13	Земельный участок с кадастровым номером 623084006601000038, расположенный по адресу: Минская обл., Крупский р-н, д. Прошика, участок № 14	Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома	0,2500	Отсутствие инженерных коммуникаций и сооружений	66550	6650 бел. руб. р/с 3602618000003 в ф-ле № 610 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Крупки, код 517, УНП 600095089, код платежа 04901, получатель платежа: финансовый отдел Крупского райисполкома	546716	26.08.2008 г. в 15.00	22.08.2008 г. до 17.00
14	Земельный участок с кадастровым номером 623084008601000093, расположенный по адресу: Минская обл., Крупский р-н, д. Худово, участок № 16	Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома	0,1000	Отсутствие инженерных коммуникаций и сооружений	12680	1270 бел. руб. р/с 3602618000003 в ф-ле № 610 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Крупки, код 517, УНП 600095089, код платежа 04901, получатель платежа: финансовый отдел Крупского райисполкома	546716	26.08.2008 г. в 15.00	22.08.2008 г. до 17.00
15	Земельный участок с кадастровым номером 623084008601000092, расположенный по адресу: Минская обл., Крупский р-н, д. Худово, участок № 17	Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома	0,1000	Отсутствие инженерных коммуникаций и сооружений	12680	1270 бел. руб. р/с 3602618000003 в ф-ле № 610 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Крупки, код 517, УНП 600095089, код платежа 04901, получатель платежа: финансовый отдел Крупского райисполкома	546716	26.08.2008 г. в 15.00	22.08.2008 г. до 17.00

Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории отсутствуют.

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома для проведения аукциона на право заключения договора аренды:

— внести плату за право заключения договора аренды земельного участка;

— возместить расходы, связанные с проведением аукциона и подготовкой документации, необходимой для его проведения;

— заключить с Октябрьским сельским исполнительным комитетом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок после принятия решения исполкома о предоставлении земельного участка государственную регистрацию права на земельный участок;

— получить в установленном порядке разрешение отдела по архитектуре и строительству Крупского райисполкома на проведение проектно-изыскательных работ и строительство объекта;

— осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

1. Аукцион состоится по адресу: Минская обл., Крупский р-н, д. Прошика, ул. Заречная, д. 5-а (здание Прошикского сельского клуба).

2. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: Минская обл., Крупский р-н, д. Прошика, ул. Центральная, д. 9 (здание Октябрьского сельского исполнительного комитета).

3. Для участия в аукционе приглашаются граждане и юридические лица. Гражданин, юридическое лицо должны подать заявление об участии в аукционе и подписать соглашение с организатором аукциона. К заявлению прилагается:

— для граждан — копия документа, содержащего идентификационные сведения гражданина;

— для представителей гражданина — нотариально удостоверенная доверенность;

— для представителей или уполномоченных должностных лиц юридического лица — доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

— заверенная банком копия платежного поручения о внесении задатка.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

4. Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Граждане, юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для земельного участка с наибольшей начальной ценой. Не допускается начало торгов по начальной цене. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участка трижды и объявляет проданным земельный участок, а участника аукциона — победителем.

5. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра местности земельного участка, выставляемого на аукцион.

6. Возмещение расходов, связанных с подготовкой и проведением аукциона, и расходов по подготовке документации, необходимой для его проведения, производится победителем аукциона.

7. Контактные телефоны: (801796) 4 91 10, 4 91 38.

УНН 600176883

Гайненский сельский исполнительный комитет Логойского района (Продавец)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже 2 (двух) земельных участков для индивидуального жилищного строительства:

Лот 1 — земельный участок № 1 в д. Гайна, площадь участка — 0,1945 га, кадастровый номер 623280801601000167, начальная цена — 4 862 500 белорусских рублей.

Лот 2 — земельный участок № 2 в д. Гайна, площадь участка — 0,2500 га, кадастровый номер 623280801601000168, начальная цена — 6 250 000 белорусских рублей.

Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на расчетный счет № 3600619020025 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Логойск, МФО 153001518, УНП 600181697.

Прием документов на участие в аукционе — до 24 августа 2008 года включительно.

Ознакомление с участками — среда, четверг.

Аукцион состоится 28.08.2008 года в 11.00 по адресу: Логойский район, д. Гайна, ул. Советская, 14.

Дополнительные сведения можно получить по телефонам: (801774) 58 2 35; 56 4 98; 128 34 67. УНП 600181697.

УП «Минский городской центр недвижимости» сообщает:

В извещении о проведении 76-го открытого аукциона на право заключения договора аренды (сроком на 5 лет) нежилых неиспользуемых помещений коммунальной собственности г. Минска, опубликованном в газете «Звязда» 18.07.2008:

строку 23 исключить;

в строках 21, 48, 50, 92 читать соответственно:

21	Ул. Физкультурная, 26а, помещения на 2 этаже (17,22 кв.м, 25,34 кв.м, 27,05 кв.м, 16,0 кв.м), имеется естественное освещение, отопление, энергоснабжение, вход с другими арендаторами, требуется косметический ремонт (под **фотоуслуги**)	85,61	1450
48	Ул. Харьковская, 86а, 1 этаж жилого дома, имеются все удобства (под непроизводственное – офис)	**122,3**	**2070**
50	Ул. Дунина-Марцинкевича, 4, корп. 2, 1 этаж жилого дома, имеются все удобства (под непроизводственное – офис)	**87,89**	**1490**
92	пр. Независимости, 40 (под объект общественного питания, **с оборудованием**, с условием сохранения наименования «Берёзка» и ассортимента белорусской кухни)	890,4	45000

Телефоны для справок: (017) 227 40 22, 227 48 36. УНП 190398583

ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
АБ ПРАВІЛАХ БЕЛАРУСКАЙ АРФАГРАФІІ І ПУНКТУАЦЫІ

Прыняты Палатай прадстаўнікоў *24 чэрвеня 2008 года*
Адобраны Саветам Рэспублікі *28 чэрвеня 2008 года*

Артыкул 1. Зацвердзіць Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі (прыкладаюцца).

Артыкул 2. Дзяржаўныя органы, іншыя арганізацыі, грамадзяне Рэспублікі Беларусь, а таксама замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пастаянна ці часова пражываюць або часова знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, павінны кіравацца Правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі, зацверджанымі гэтым Законам, ва ўсіх сферах і выпадках выкарыстання пісьмовай беларускай мовы.

Артыкул 3. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь да 1 верасня 2010 года:

забяспечыць прывядзенне актаў заканадаўства ў адпаведнасць з гэтым Законам;

прыняць іншыя меры, неабходныя для рэалізацыі палажэнняў гэтага Закона.

Артыкул 4. Гэты Закон уступае ў сілу з 1 верасня 2010 года, за выключэннем гэтага артыкула і артыкула 3, якія ўступаюць у сілу з дня афіцыйнага апублікавання гэтага Закона.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь
А. ЛУКАШЭНКА.

23 ліпеня 2008 года, г. Мінск.
№ 420—З

ЗАЦВЕРДЖАНА
Закон Рэспублікі Беларусь
23.07.2008 № 420-3

ПРАВІЛЫ БЕЛАРУСКАЙ АРФАГРАФІІ І ПУНКТУАЦЫІ

РАЗДЗЕЛ І
АРФАГРАФІЯ

ГЛАВА 1
ПРАВАПІС ГАЛОСНЫХ

§ * 1. Галосныя літары

1. У беларускім алфавіце 10 галосных літар: *а*, *о*, *у*, *ы*, *э*, *е*, *ё*, *і*, *ю*, *я*.

2. Літары *а*, *о*, *э*, *у* пішуцца ў пачатку слова і пасля цвёрдых зычных для абазначэння адпаведных галосных гукаў. Літара *і* пішацца ў пачатку слова, пасля зычных пішацца *ы* або *і* ў залежнасці ад цвёрдасці або мяккасці зычных. Літары *е*, *ё*, *ю*, *я* ў пачатку слова, у сярэдзіне слова пасля галосных, ў (у нескладовага), раздзяляльнага мяккага знака і апострафа абазначаюць на пісьме спалучэнне зычнага гука [й] з галоснымі [э], [о], [у], [а]: *елка — [йэ]лка*, *юны — [йу]ны*, *яма — [йа]ма*; *паехаў —па[йэ]хаў*, *паёк — па[йо]к*, *саюз — са[йу]з*; *здароўе — здароў[йэ]*; *льеш — ль[йэ]ш*; *аб'ездзіць — аб[йэ]здзіць*, *б'ю — б[йу]*, *сям'я — сям[йа]*.

3. Літары *я*, *ё*, *е*, *ю*, *і* пасля зычных абазначаюць мяккасць зычных і адпаведныя галосныя гукі [а], [о], [э], [у], [і]: *сяду — [с'а]ду*, *вязу — [в'а]зу*, *мёд — [м'о]д*, *лета — [л'э]та*, *люты — [л'у]ты*, *ліст — [л'і]ст*.

4. Кропкі над літарай *ё* абавязковыя. Кропка над літарай *і* малой абавязковая. Над літарай *І* вялікай у друкаваных тэкстах кропка не ставіцца, а ў рукапісных тэкстах кропка абавязковая.

§ 2. Літары *о*, *ё*

1. Літара *о* пішацца толькі пад націскам: *год*, *кот*, *скрозь*, *шоўк*, *колас*, *мова*, *доўга*, *посуд*, *арол*, *шолах*, *плячо́*, *дарога*, *разго́рткаваць*, *дапамо́га*, *дадатко́ва*, *жнівё*, *дэпо́*, *во́дар*, *о́каннае*, *о́да*, *о́пт*ам, *о́рдэн*, *о́фіс*, *о́пера*, *Об*, *Орша*, *Омск*, *Обнінск*, *Осла*, *Оксфард*, *Орск*, *То́кіа*, *Ватэрло́а*.

2. Літара *ё* пішацца пад націскам: *лёс*, *вёска*, *сёстры*, *цёмны*, *цёплы*.

Літара *ё* пішацца не пад націскам у словах з коранем *ёд-* і *ёт-*: *ёдапірыі́н*, *ётацыя*, *ётаванне*.

3. Літара *ё* пішацца ў складаных словах з першай часткай *радыё-*: *радыёстанцыя*, *радыёграма*, *радыёантэна*.

Калі першая частка складанага слова ўтворана ад назвы хімічнага элемента *радый*, то пішацца літара *е*, якая з'яўляецца злучальнай галоснай: *радыебіялогія*, *радыеактыўнасць*, *радыеметрычны*, *радыеізатоп* і інш. У першым складзе перад націскам у гэтым выпадку пішацца *я*: *радыяме́трыя*, *радыяхі́мія*, *радыялогія*, *радыяграфія*.

§ 3. Літары *э*, *е*

1. Літара э пішацца:

у пачатку выключнікаў э, *эге*, *эге-ге*, *эй*, *эх*;

пасля прыстаўной літары *г* у слове *гэты* і выточных ад яго (*дагэтуль*), а таксама ў выключніках *гэ*, *гэй* і назвах літар (*бэ*, *вэ* і інш.);

пасля шыпячых, [р], [д], [т] і цвёрдага [ц]: *жэрдка*, *жэмчуг*, *шэры*, *нашэсце*, *чэрствы*, *чэк*, *нараднэнне*, *абудзэнне*, *рэкі*, *рэзаць*, *халадэча*, *сардэчны*, *пустэча*, *мястэчка*, *цэны*, *у руцэ*.

2. У пачатку запазычаных слоў літары э, *е* як пад націскам, так і не пад націскам пішуцца ў адпаведнасці з літаратурным вымаўленнем: *э́ра*, *эсэ́*, *э́рыка*, *э́пас*, *э́тыка*, *Эўклід*, *Эўрыпі́д*, *Эліста*; *е́гер*, *е́рась*, *ерэ́тык*, *Еўро́па*, *еўрапе́йскі*, *Еўпато́рыя*, *Ерэ́ван*, *ерэ́ванец*, *Еўфра́т*.

На канцы запазычаных нязменных слоў, а таксама ўласных імён і геаграфічных назваў пасля зычных, акрамя *л*, *к*, пішацца э: *купэ́*, *рэзюмэ́*, *рэнамэ́*, *кафэ́*, *галіфэ́*, *кашнэ́*, *каберне́*, *фрыкасэ́*, *плісэ́*, *каратэ́*, *дэкальтэ́*; *Струўвэ*, *Мерымэ́*, *Эйвэ́*, *Хасэ́*, *Мо́рээ*, *Табі́дээ*, *Брыгвадээ*, *Каба-Ве́рдэ*, *Душанбэ́*, *Сан-Тамэ́*; але: *са́льта-марта́ле*, *філе́*, *камюніке́*, *піке́*.

3. Літара э ў запазычаных словах пасля губных зычных, а таксама пасля *з*, *с*, *н* пішацца згодна з літаратурным вымаўленнем. Так, словы *капэ́ла*, *сурвэ́тка*, *экзэмпля́р*, *маянэ́з*, *тунэ́ль*, *сэ́рвіс*, *інтэрнэ́т* пішуцца з літарай э, а словы *медаль*, *ме́неджмент*, *не́рвы*, *парла́мент*, *перспекты́ва*, *газе́та*, *сервіз* — з літарай *е*.

4. У запазычаных словах, адзначаных у пунктах 2 і 3 гэтага параграфа, напісанне э, *е* вызначаецца па слоўніку.

§ 4. Перадача акання на пісьме

1. Галосныя гукі [о], [э] ў ненаціскным становішчы чаргуюцца з [а]: *дом — дамы́*, *мо́ва — маўле́нне*, *цэ́гла — цагля́ны*, *шэпт — шапта́ць*.

2. Незалежна ад паходжання слова гук [о] ў ненаціскных складах вымаўляецца як [а], што перадаецца на пісьме: *гара́*, *вада́*, *баранава́нне*, *ко́лас*, *хо́лад*, *балота́*, *Бандарэ́нка*, *Ко́ханава*, *Ку́нцава*, *Гаме́р*, *Сакра́т*, *арганізацыя*, *педагагі́чны*, *электара́т*, *харэаграфія*, *заалогія*.

Не падпарадкоўваюцца акання словы са спалучэннямі *ро*, *ло*, якія чаргуюцца з *ры*, *лы*: *кроў — крыві́ — крыва́вы*, *дро́вы — дрывоце́нь*, *кро́шка — крышы́ць*, *бро́вы — брыво́*, *гром — грымо́ты — грыме́ць*, *брод — брысці́*, *глотка — глыта́ць*, *блохі — блыха́*.

3. У словах славянскага паходжання і запазычаных словах, цалкам адаптаваных у беларускай мове, галосны [э] ва ўсіх ненаціскных складах чаргуецца з [а] і абазначаецца на пісьме літарай *а*: *стрэхі — страха́*, *шэры — шарэ́ць*, *чэ́ргі — чарга́*, *крэмль — крамлёўскі*, *жэ́мчуг —жамчу́жына*, *арэ́нда — арандава́ць*, *майстэ́рня — ма́йстар*.

Ва ўласных імёнах са славянскай лексічнай асновай і ў даўно запазычаных словах з неславянскіх моў у ненаціскных складах гук [э] падпарадкоўваецца агульным правілам акання — пасля цвёрдых зычных ён чаргуецца з [а] і абазначаецца на пісьме літарай *а*: *Беразіно́*, *Чарапаве́ц*, *Жамчу́жнікаў*, *Чарныша́ўскі*, *Шаўчэ́нка*, *Чалю́скін*, *лі́тара*, *транслітара́цыя*.

4. Перадача на пісьме [э] ў іншых запазычаных словах у ненаціскных складах асновы вызначаецца наступнымі правіламі:

у пачатку слова [э] перадаецца на пісьме літарай э ў адпаведнасці з беларускім літаратурным вымаўленнем: *экано́мія*, *экза́мен*, *экватар*, *этажэ́рка*, *элеме́нт*. Літара э пішацца пасля прыставак і ў другой частцы складанага слова: *праэкзаменава́ць*, *трохэле́ментны*, *квінтэсэ́нцыя*;

пасля шыпячых, [р], [д], [т] і цвёрдага [ц] пішацца э: *жэто́н*, *Жэнэ́ва*, *Жэра́р*, *жэлацін*, *чэкме́нь*, *рэспу́бліка*, *рэфо́рма*, *Рэма́рк*, *рэкла́ма*, *рэ́актар*, *рэві́зія*, *агрэга́т*, *ржэ́сым*, *рэко́рд*, *рэ́стр*, *рэвалю́цыя*, *дэта́ль*, *гардэро́б*, *Дэтро́йт*, *Дэфо́*, *дэлега́т*, *дэманстра́цыя*, *о́рдэн*, *тэо́рыя*, *тэа́тр*, *тэлегра́ф*, *тэлефо́н*, *ветэра́н*, *ка́тэт*, *тэрмо́метр*, *тэарэ́ма*, *цэнтралі́зм*, *цэві́та*.

5. У запазычаных словах напісанне э і *а* пасля зычных, акрамя шыпячых, [р], [д], [т] і цвёрдага [ц], вызначаецца па слоўніку: *панэ́ль*; але: *шынэ́ль*.

6. Ненаціскныя фіналі *-эль*, *-эр* у запазычаных словах пераходзяць як *-аль*, *-ар*: *шні́цель*, *шпа́таль*, *мі́таль*, *фо́рталь*, *ка́рцар*, *грэ́йдар*, *лі́дар*, *камп'ю́тар*, *пэ́йджар*, *рэ́йсфе́дар*, *эспа́ндар*, *тэ́ндар*, *о́рдар*, *ме́неджар*, *фарва́тар*, *а́льма-ма́тар*, *кра́тар*, *прэсві́тар*.

Ненаціскныя фіналі *-эль*, *-эр* ва ўласных імёнах іншамоўнага паходжання перадаюцца нязменна: *Ландэр*, *Одэр*, *Пітэр*, *Юпітэр*.

§ 5. Правапіс літар *а, о, э* у складаных словах

1. У складаных словах можа быць адзін асноўны і адзін або некалькі пабочных націскаў. Калі ў другой частцы складанага слова націск на першым складзе, то ў першай частцы замест *о* пішацца *а*: *дабрадзе́й*, *скараго́д*, *салявар́*, *дабрая́касны*, *галавало́мка*, *вадасхо́вішча*, *малатабо́ец*, *бамбасхо́вішча*, *раўнапра́ўе*.

Літара *о* захоўваецца ў складаных словах, першай часткай якіх з'яўляюцца *слова-*, *што-*, *фота-*, *мота-*: *словафо́рма*, *словатво́рчасць*; *штодзённы*, *штомяса́ц*, *штого́д*; *фотаздымак*, *фотако́пія*, *фотаплёнка*, *фотака́мера*, *фотавыстаўка* і г.д.; але: *фатаграфія* і вытворныя ад яго; *мотагонкі*, *мотакро́с*, *мотаспо́рт* і г.д.; але: *матавоз*, *матацыкл* і вытворныя ад іх.

2. Калі ў другой частцы складанага слова націск не на першым складзе, то ў першай частцы захоўваецца *о*: *аснòвапалажэ́нне*, *бавдўнапрадзільны*, *вдгнетрывалы*, *вòдараз мерка вальнік*, *вагòнарамо́нтны*, *вòстракамбінацыйны*, *высòкаідэ́йны*, *галдўнакама́ндуючы*, *кòрманарыхто́ўка*, *кòнегадо́ўля*.

У першай частцы некаторых складаных слоў, асабліва навуковых тэрмінаў, можа выразна праяўляцца пабочны націск і тады, калі асноўны націск падае на першы склад другой часткі. У такім выпадку пад пабочным націскам у першай частцы захоўваецца напісанне *о*: *агдрафо́бія*, *аздонасто́йкі*, *аздотнакі́слы*, *здбожжасхо́вішча*, *кòксагазавы*, *мангдлазна́ўства*, *мдвазна́ўства*, *мòвазна́ўчы*, *матòразбо́рка*, *работадаве́ц*, *слдватво́рчасць*, *фòндасхо́вішча* і інш.

Ва ўсіх іншых выпадках напісанне падобных слоў вызначаецца па слоўніку.

3. Літара *о* пішацца ў першай частцы складаных слоў, калі другая частка пачынаецца з *ў* (у нескладовага): *марозаўсто́йлівы*, *торфаўбо́рачны*, *вогнеўсто́йлівы*, *збожжаўбо́рка*.

4. Лічэбнікі ад 600 да 800 утвараюць асобны тып складаных слоў, у якіх першая частка складаецца і пішацца як самастойнае слова.

Напрыклад*:

Н.	*шэсцьсот*	*семсот*	*восемсот*
Р.	*шасцісот*	*сямісот*	*васьмісот*
Д.	*шасцістам*	*сямістам*	*васьмістам*
В.	*шэсцьсот*	*семсот*	*восемсот*
Т.	*шасцюстамі*	*сямюстамі*	*васьмюстамі*
М.	*(аб) шасцістах*	*сямістах*	*васьмістах*

5. Гук [э] ў першай частцы складаных слоў захоўваецца і абазначаецца літарай э: *мэтанакіраваны*, *мэтазгодна*, *рэдказубы*, *шэравокі*, *арэхападобны*, *крэдыта́здольнасць*, *тэлебачанне*.

6. У складаных словах, утворных ад лічэбніка ў форме роднага склону і іншага слова, першая частка пішацца так, як яна пішацца ў родным склоне лічэбніка: *трохдзённы*, *чатырохпавярховы*, *шасцістольны*, *шасцісоты*, *пяцідзённа*, *дзесяцігодка*, *сямікласні́к*, *васьмігадовы*, *васьмісоты*, *дзевяцігрудсны*, *саракагоддзе*, *саракапяцітонны*, *двухсотметровы*.

7. Калі складаныя словы маюць у сваім складзе больш за дзве часткі, то кожная з іх пішацца як асобна ўзятае слова: *авіяматорабудаванне*, *аўтатрактарабудаванне*, *аэрафотамрыбор*.

§ 6. Перадача якання на пісьме

1. Галосныя *е*, *ё* ў першым складзе перад націскам абазначаюцца на пісьме літарай *я*: *зе́млі — зямля́*, *зе́лень — зялёны*, *се́м'і — сям'я́*, *сёлы — сяло́*, *сёстры — сястра́*, *вёслы — вясло́*, *вёска — вясковы*, *ёлка — яліна*, *ёздзіць — язда́*, *ёмкі — ямчэ́й*, *ёрш — яршо́*, *лён — ляно́к*, *мёд — мядо́к*, *дзе́нь — дзянёк*, *лес — лясны́*, *снег — снягі́*, *вёцер — вятры́*, *сцёны — сцяна́*, *дзе́вяць — дзявя́ты*, *дзе́сяць — дзяся́ты*, *сем — сямна́ццаць*, *во́сем — васямна́ццаць*, *цецеруко́ў — цецяруко́ў*, *перане́сці — перанясу́*.

У іншых ненаціскных складах *е* захоўваецца: *селянін*, *зеляні́на*, *вестуны́*, *леснікі*, *векавечны́*, *верацяно́*, *нерухо́мы*, *безупы́нны*, *во́зера*, *ве́села*, *во́сем*, *за́едзь*, *высветліць*, *вы́ехаць*, *во́сень*, *це́мень*, *дзевятна́ццаты*, *дзесятко́вы*.

2. Літара *я* пішацца ў першым складзе перад націскам у імёнах, прозвішчах і геаграфічных назвах са славянскай лексічнай асновай і ў даўно запазычаных словах з неславянскіх моў: *Бялы́нічы*, *Лемяшэ́вічы*, *Алякса́ндр*, *Сярге́й*, *Бялі́нскі*, *Няхо́да*, *дзяжу́рства*, *каляндар́*, *яфрэ́йтар*, *сяржа́нт*, *Яршо́ў*, *Яфі́м*.

3. Заўсёды захоўваецца *е* ў першым складзе перад націскам пасля заднеязычных *г*, *к*, *х*: *геро́й*, *Гера́сім*, *кера́міка*, *кефі́р*, *Херсо́н*.

4. Часціца *не* і прыназоўнік *без* заўсёды пішуцца з літарай *е*: *не быў*, *не браў*, *не ідзе*, *не спыніць*, *без меры*, *без жартаў*, *без прычыны*, *не без вынікаў*, *не без работы*.

Пры напісанні разам *не* і *без* становяцца прыстаўкамі і падпарадкоўваюцца агульным правілам напісання галосных літар *е*, *я*: *няха́й*, *нястро́мна*, *няшта́тны*, *бязме́жны*, *бязлю́дны*, *бяско́нца*; але: *непісьме́нны*, *безво́дны*, *безапеляцыйны*, *бескары́сны*, *беспаваро́тны*.

5. Літара *я* пішацца ў некаторых каранях слоў нязменна: *вцязь*, *сувязь*, *за́яц*, *яравы́*, *вязаць*, *завязь*, *по́вязь*, *мяккава́ты*, *цягавіты*, *цяжкава́ты*, *святкава́ць*, *ме́сяц*, *по́яс*, *па́мяць*, *дзе́вяць*, *дзе́сяць*, *ты́сяча*, *Бе́сядзь*, *Прыпяць*; *япру́к — япрука́*, *япру́ковы*; *ядло́вец — ядлаўцо́вы*.

6. Літара *я* пішацца ў паслянаціскных складах у некаторых суфіксах назоўнікаў (*ро́ўнядзь*, *бо́язь*, *дро́бязь*) і дзеясловаў (*ла́яць*, *ве́яць*, *се́яць*, *ка́шляць*, *ба́яць*, *му́ляць*), а таксама ў адзеясловых назоўніках (*ла́янка*, *ве́ялка*, *се́ялка*).

§ 7. Правапіс *е, ё, я* ў складаных словах

1. У першай частцы складанага слова літара *е* захоўваецца незалежна ад таго, на якім складзе націск у другой частцы: *сенакаці́лка*, *серпадзю́б*, *верхнеазёрскі*, *белабрысы*, *землетрасе́нне*, *светапо́гляд*, *свежавымыты*, *свежамаро́жаны*, *сенажа́ць*.

Калі першай часткай складаных слоў з'яўляецца аснова *велік-/вялік-*, напісанне літар *е* або *я* залежыць ад таго, які склад у другой частцы націскны: калі першы — пішацца *е*, калі другі — пішацца *я*: *велікадушны*, *велікару́скі*, *велікамучанік*, *велікасве́цкі*; *Вялікабрыта́нія*, *вялікадзяржа́ўны*, *вялікагало́вы*.

2. У першай частцы складанага слова літара *ё* захоўваецца пры націску не на першым складзе другой часткі і замяняецца на *е*, калі націск на першым складзе другой часткі: *лёгкаатлетычны*, *лёдадрабі́лка*, *мёртванаро́джаны*, *мёдаварэ́нне*; *ледарэ́з*, *медагго́нка*, *легкадумна*.

3. У складаных словах злучальныя галосныя *о*, *ё* пішуцца толькі пад націскам, галосная *а* — у любым ненаціскным складзе: *ільноваляко́вы*, *Вадо́хрышча*, *куро́дым*, *часо́піс*, *гелі́ограф*, *марозаўсто́йлівы*, *прыборабудаўні́чы*.

4. Злучальная галосная *е* ў складаных словах пераходзіць у *я*, калі націск на першым складзе ў другой частцы складанага слова: *баязло́льны*, *зернясхо́вішча*, *земляро́б*, *жыццяра́дасны*, *крывявто́рны*; але: *боепрыпа́сы*, *жыццеапіса́нне*, *землекарыста́нне*, *зернебабо́вы*.

Злучальная галосная *е* ў складаных словах захоўваецца, калі другая частка пачынаецца з *ў* (у нескладовага): *зернеўбо́рачны*, *вогнеўсто́йлівы*.

Складанаскарочаныя словы пры напісанні звычайна разглядаюцца як простыя словы з адным націскам: *зямфо́нд*, *лясга́с*.

§ 8. Прыстаўныя галосныя *і, а*

1. Прыстаўная галосная *і* пішацца:

у пачатку слова перад спалучэннямі зычных з першай літарай *м*: *імшара*, *імчаць*, *імгла*, *імгненне*, *імклівы*;

у пачатку некаторых слоў перад спалучэннямі зычных з першымі літарамі *р*, *л*, калі слова з такімі спалучэннямі зычных пачынае новы сказ або стаіць пасля знака прыпынку ці слова, што заканчваецца на зычную: *іржа*, *іржаць*, *ірдзенне*, *ірваць*, *іржышча*; *ілгун*, *ільдзіна*. *Іржуць коні, калёсы скрыпяць ад Дона да Бугá* (Я. Купала). *Часамі на цэлыя кіламетры рассцілалася дарога роўным, нібы выбеленым на сонцы, ільняным палатном* (Я. Колас). Калі слова з такім пачатковым спалучэннем зычных стаіць пасля слова, якое заканчваецца на галосную, і пасля яго няма знака прыпынку, то прыстаўная літара *і* не пішацца: *Азалаціла восень поле ржышчам, дрэвы лісцем, гумны снапамі* (К. Чорны). *Люблю я прыволле шырокіх палёў, зялёнае мора ржаных каласоў...* (Я. Колас).

2. У некаторых словах можа з'яўляцца прыстаўная галосная *а*: *імшара* і *амшара*, *іржаны* і *аржаны*, *іржышча* і *аржанішча*.

3. Пасля прыставак і першай часткі складанага слова, якія заканчваюцца на галосную, прыстаўныя літары *і* і *а* перад *р*, *л*, *м* не пішуцца: *заржавець*, *заржаць*, *зардзецца*, *замглёны*, *замшэлы*, *прымчацца*, *вокамгненна*.

§ 9. Спалучэнні галосных у запазычаных словах

1. Калі спалучэнні *іо*, *йо* вымаўляюцца як два склады, тады яны на пісьме абазначаюцца:

паміж зычнымі — літарамі *іё* (*ыё*) пад націскам і *ія* (*ыя*) не пад націскам: *біёлаг*, *біёграф*, *дамініён*, *Ліён*, *аксіёма*, *бібліёграф*, *Галакціён*, *Гесіёд*, *патрыёт*, *рацыён*, *радыёла*, *стадыён*, *бастыён*; *біяло́гія*, *бібліятэ́ка*, *геліятро́п*, *піянер́*, *ажыята́ж*, *перыядычны*, *патрыятызм*, *акцыянёрны*, *нацыяна́льны*, *рацыяналіза́тар*;

у пачатку слова — літарамі *іо* пад націскам і *іа* не пад націскам: *іён*, *іо́нны*, *Іосіф*; *Іанічнае мора*, *іаніційцы*, *іанізацыя*, *Іакага́ма*, *Іаркшыр*, *Іашкар-Ала*, *Іаён*.

2. Калі спалучэнні *іо*, *йо* вымаўляюцца як адзін склад, тады на пісьме яны перадаюцца:

пасля галосных — праз *ё* пад націскам і *я* не пад націскам: *раён*, *раённы*, *маёр*, *Маёраў*, *Лаёла*; *маянэ́з*, *маяра́н*, *маярат́а*, *раяні́раванне*;

у пачатку слова — праз *ё*: *ёг*, *ёгурт*, *ёд*, *ёдзісты*, *ём* (гук), *ёта* (літара), *ётацыя*, *ёдаформ*, *ёдаваты*, *ётаваны*.

3. Спалучэнне *іе* абазначаецца на пісьме літарамі *іе* (*ые*): *гігіе́на*, *кліе́нт*, *аўдые́нцыя*, *арыента́цыя*, *абітурые́нт*, *кліенту́ра*, *ієрархія*, *ія́на*, *ієрогліф*, *Іерусалі́м*, *ієрыхо́нскі*.

4. Спалучэнне *йе* заўсёды вымаўляецца як адзін склад і на пісьме ў пачатку слова і пасля галосных перадаецца праз *е*: *езуі́т*, *праект*, *канвеер*, *траекторыя*, *Феербах*, *Маерава*, *фае*.

5. Спалучэнне *іа* абазначаецца на пісьме літарамі *ія* (*ыя*) незалежна ад месца націску: *авія́цыя*, *ліяна*, *генія́льны*, *Ліія́да*, *энтузія́зм*, *фартэпія́на*, *піяні́ст*, *сацыялі́зм*, *сацыяльны*, *варыя́нт*, *матэрыя́л*, *матэрыяліза́тар*, *дыяметр*, *дыяпазо́н*, *дыяфра́гма*.

6. Спалучэнне *йа* на пісьме перадаецца:

пасля галосных і ў пачатку слова — праз *я*: *раяль*, *пляяда*, *сакваяж*, *лаяльны*, *Савоя*, *Малая*, *Мая*, *ярус*, *яхта*, *ярд*, *яхант*, *ятаган*;

пасля зычных *л*, *с*, *ц* (мяккага), *дз* і непрыставачных *н* і *з* — праз *ья*, пасля астатніх зычных — праз *'я*: *мільярд*, *мільярдны*, *кальян*, *мадзьяр*, *альянс*, *мільярдэр*, *саф'ян*.

ГЛАВА 2
ПРАВАПІС ЗЫЧНЫХ

§ 10. Зычныя літары

1. Для абазначэння зычных гукаў у беларускай мове выкарыстоўваецца 21 літара: *б*, *в*, *г*, *д*, *ж*, *з*, *й*, *к*, *л*, *м*, *н*, *п*, *р*, *с*, *т*, *ў*, *ф*, *х*, *ц*, *ч*, *ш*.

2. Асобныя гукі не маюць спецыяльных літар: афрыкаты [дж], [дз] і мяккі [дз'] перадаюцца на пісьме адпаведна спалучэннямі літар *д* і *ж*, *д* і *з*: *хаджу*, *ваджу*, *ксяндзы*, *пэндзаль*, *хадзіў*, *вадзіў*, *дзюны*, *дзень*, *дзіва*.

3. Гук [й] перадаецца або літарай *й* (на канцы склада пасля галосных: *рэйка*, *май*), або літарамі *е*, *ё*, *і*, *ю*, *я*, якія адпаведна абазначаюць спалучэнні гукаў [йэ], [йо], [йі], [йу], [йа] ў пачатку слова, пасля галосных, апострафа, раздзяляльнага мяккага знака і ў (у нескладовага): *яма*, *ёмкі*, *ехаць*, *іней*, *юшка*, *маянэз*, *аб'ява*, *пад'ём*, *пад'ехаць*, *раз'юшаны*, *уецца*, *уюн*, *маёр*, *медальён*, *салаўі*, *салюе*, *альянс*, *саюз*.

§ 11. Правапіс звонкіх і глухіх зычных

1. Чаргаванне звонкіх і глухіх зычных (акрамя прыставачнага *з*) на пісьме не адлюстроўваецца. Для праверкі правільнасці напісання звонкіх і глухіх зычных трэба змяніць слова ці падабраць іншае аднакаранёвае слова, каб пасля зычнага, які патрабуе праверкі, быў галосны або зычныя *р*, *л*, *м*, *н*, *в*: *рыбка — рыба*, *магчы — магу*, *кладка — кладак*, *даведка — даведацца*, *дзядзька — дзядзечка*, *хадзьба — хадзіць*, *казка — казаць*, *важкі — важыць*, *просьба — прасіць*, *касьба — касіць*, *носьбіт — насіць*, *малацьба — малаціць*, *рубчык — рубец*, *паўзці — паўзу*, *малодшы — малады*; *хлеб — хлеба*, *рог — рога*, *дзед — дзеда*, *поезд — поезда*, *роўнядзь — роўнядзі*, *сядзь — сядзі*, *нож — нажа*, *маж — мажаш*, *лістаж — лістажу*, *воз — воза*, *мазь — мазі*, *дождж — дажджу*, *рэж — рэжу*, а таксама *розаг — розгі*, *мозг — мазгі*, *лязг — лязгаць*, *грыб — грыбны*, *грыбніца*, *бег — беглы*, *бегма*, *загадка — загадны*, *загадваць*, *ножка — нажны*. Словы *лязг*, *лязгаць* маюць варыянты *ляск*, *ляскаць*.

2. Правапіс уласнабеларускіх і запазычаных слоў, у якіх напісанне звонкіх і глухіх зычных нельга праверыць, вызначаецца па слоўніку: *футбол*, *баскетбол*, *вакзал*, *айсберг*, *струбцына*, *экзамен*, *Афганістан*.

§ 12. Зычныя *д, т* і *дз, ц*

1. Чаргаванне цвёрдых зычных гукаў [д], [т] з мяккімі [дз'], [ц'] (дзеканне і цеканне) адлюстроўваецца на пісьме: замест *д*, *т* перад *е*, *ё*, *і*, *ю*, *я* пішуцца адпаведна *дз*, *ц*: *гарады — у горадзе*, *народы — у народзе*, *сады — у садзе*, *іду — ідзём*, *вяду — вядзі*, *вада — вадзяны*, *грудны — грудзі*, *люду — людзі*, *варта — на варце*, *хата — у хаце*, *чысты — чысцюткі*, *выток — выцякаць*, *карта — на карце*, *катлы — кацёл*, *тру — церці*, *шосты — шэсць*, *пяты — пяць*, *латынь — лацінка*.

2. Чаргаванне [д], [т] з [дз'], [ц'] адбываецца перад мяккім [в']: *два — дзве*, *дзвесце*, *рута — руцяны*, *мёртвы — мярцвяк*, *чатыры — чацвёрты*, *чэрствы — счарсцвелы*.

Літара *ц* і афрыката *дз* перад мяккім [в'] пішуцца згодна з вымаўленнем у словах: *дзверы*, *мядзведзь*, *бацвінне*, *цвёрды*, *цвяродзь*, *цвік*, *цвілы*, *цвісці*, *ліцвін*, *ліцвінка*, *яцвяг*, *Мацвей*, *Мацвеенка*, *Бацвіннік* і інш. Выключэнне: *твіст*.

3. Гукі [д] у канцы прыстаўкі і [т] у складзе суфікса перад мяккім [в'] захоўваюцца нязменна і на пісьме перадаюцца адпаведна літарамі *д* і *т*: *адвезці*, *у таварыстве*, *у агенцтве*, *у выдавецтве*, *аб прыродазнаўстве*, *у грамадстве*, *у братэрстве*.

Гук [т] вымаўляецца нязменна і на пісьме перадаецца літарай *т* перад мяккім [в'] у аддзеяслоўных назоўніках і ў словах, вытворных ад іх: *бітва — у бітве*, *брытва — брытве*, *брытвенны*, *клятва — клятве*, *клятвенны*, *пітво — у пітве*, *паства — у пастве*. Літары *д* і *т* пішуцца таксама ў некаторых іншых словах: *марова — мардве*, *марквін*, *Мардвінаў*, *Літва — у Літве*.

4. У запазычаных словах (а таксама ў вытворных ад іх) цвёрдыя *д*, *т*, як правіла, пішуцца нязменна: *рэйсфедар*, *дэлегат*, *дэманстрацыя*, *медыцына*, *апладысменты*, *індык*, *літаратура*, *майстар*, *матэрыял*, *універсітэт*, *кватэра*, *тэхніка*, *тыраж*, *скептык*, *ерэтык*, *пластык*, *тэарэтык*, *авантура*, *дыктатура*.

5. Перад суфіксамі і спалучэннямі суфіксальна паходжання *-ін-*, *-ір-*, *-ік-*, *-ёр-*, *-еец-*, *-ейск-* у словах іншамоўнага паходжання, а таксама ў словах, вытворных ад іх, [д] і [т] чаргуюцца з [дз'], [ц'], што і адлюстроўваецца на пісьме: *сульфі́ды — сульфі́дзін*, *каманда — камандзір*, *індзеец*, *індзейскі* (але: *Індыя — індыец*, *індыйскі*, *індыйцы*), *гвардыя — гвардзеец*, *гвардзейскі*, *мантаж — манцёр*, *манціроўка*, *манціраванны*, *білет — білецёр*, *білецік*, *эпізод — эпізодзік*, *жакет — жакецік*.

6. Зычныя *дз*, *ц* пішуцца ў некаторых словах, правапіс якіх вызначаецца па слоўніку: *мундзір*, *гетэрадзін*, *дзюна*, *дзюшэс*, *бардзюр*, *арцель*, *арцішок*, *цір*, *цітр*, *эцюд*, *цюль*, *нацюрморт*, *уверцюра*, *накцюрн*, *цюркскі*, *цюльпан*, *каранцін*.

7. Зычныя *д*, *т* або *дз*, *ц* пішуцца ў адпаведнасці з беларускім літаратурным вымаўленнем ва ўласных імёнах і назвах: *Дадэ*, *Дэфо*, *дэ Бальзак*, *Дэтройт*, *Тэлаві*, *Атэла*, *Тэвасян*, *Тэкля*, *Тэкерэй*, *Тэрэза*, *Шаптыцкі*, *«Юманітэ»*, *Дзяніс*, *Гарыбальдзі*, *Дзвіна*, *Дзясна*, *Барадзіно*, *Уладзівасток*, *Градзянка*, *Плоўдзіў*, *Хрысціна*, *Цютчаў*, *Кацюбінскі*, *Вучэціч*, *Целяханы*, *Цімкавічы*, *Ціхін*, *Быцень*, *Церак*, *Цюмень*, *Цюрынгія*, *Гаіці*, *Палесціна*, *Поці*, *Таіці* і інш. Правапіс такіх слоў вызначаецца па слоўніку.

§ 13. Некаторыя спалучэнні зычных

1. У асобных словах адбылося спрашчэнне груп зычных: гістарычныя спалучэнні *здн*, *згн*, *стн*, *скн*, *стл*, *рдн* вымаўляюцца як *зн*, *сн*, *сл*, *рн*, што і адлюстроўваецца на пісьме:

здн — зн: *праязны*, *выязны* (параўн.: *праязд*, *выязд*), *позна*, *спазніцца*, *Познышаў*;

згн — зн: *бразнуць* (параўн.: *бразгаць*);

стн — сн: *бязлітасны* (параўн.: *літасць*), *пачэсны* (параўн.: *чэсць*), *ненавісны* (параўн.: *нянавісць*), *існаваць* (параўн.: *істота*), *скарасны* (параўн.: *скорасць*), *колькасны* (параўн.: *колькасць*), *абласны* (параўн.: *вобласць*), *капусны* (параўн.: *капуста*), *посны* (параўн.: *пост*), *гуснуць* (параўн.: *густы*, *гусцець*), *абвесны* (параўн.: *абвестка*, *абвясціць*), *месны* (параўн.: *змястоўны*, *месца*); тое ж у запазычаных: *кантрасны* (параўн.: *кантраст*), *кампосны* (параўн.: *кампост*), *фарпосны* (параўн.: *фарпост*);

скн — сн: *бліснуць* (параўн.: *бліскаць*, *бліскавіца*, *бляск*), *пырснуць* (параўн.: *пырскаць*), *пляснуць* (параўн.: *пляскаць*), *ляснуць* (параўн.: *ляскаць*), *трэснуць* (параўн.: *трэскаць*); але: *віскнуць*, *націкны*;

стл — сл: *жаласлівы* (параўн.: *жаласць*), *шчаслівы* (параўн.: *шчасце*), *карыслівы* (параўн.: *карысць*), *няўрымслівы* (параўн.: *урымсціцца*), *помслівы* (параўн.: *помста*), *паслаць* (параўн.: *пасцялю*, *пасцель*);

рдн — рн: *міласэрны*, *міласэрнасць* (параўн.: *сардэчны*).

2. Спалучэнні зычных *ск*, *ст*, *с'ц'* на канцы кораня слова могуць чаргавацца з *шч*, што і перадаецца на пісьме: *воск — вашчыць*,

(Працяг. Пачатак на 3-й стар.)

ётаванымі галоснымі, як і ў словах уласнабеларускіх:

на пачатку слова: *Ёфе*, *Ньюёрк*;

пасля галоснага ў сярэдзіне слова: *маёр*, *маярат*, *маянэз*, *раён*, *Аюнскі*;

пасля галоснага на канцы слова: *фае*, *секвоя*, *Мая*, *Папая*.

§ 17. Падоўжаныя і падвоеныя зычныя

1. На пісьме падоўжаныя зычныя *ж*, *з*, *дз*, *л*, *н*, *с*, *ц*, *ч*, *ш*, якія стаяць паміж галоснымі, абазначаюцца падвоеным напісаннем адпаведных літар (падоўжанае *дз* на пісьме перадаецца як *ддз*): *замужжа*, *Залужжа*, *раздарожжа*, *ружжо*, *маззю*, *ыззё*, *суддзя*, *разводдзе*, *ладдзя*, *пападдзя*, *колле*, *вяселле*, *наваколле*, *карэнне*, *насенне*, *варанне*, *двукоссе*, *калоссе*, *адкрыццё*, *дзесяццю*, *жыццё*, *забыццё*, *куцця*, *мыццё*, *пятнаццаццю*, *пяццю*, *пяцюдзесяцюю*, *свацця*, *суквецце*, *ламачча*, *ноччу*, *Уручча*, *зацішша*, *узвышша*, *мышшу*.

2. У запазычаных словах, у тым ліку ва ўласных імёнах і назвах, і вытворных ад іх словах падвоеныя літары звычайна не пішуцца: *граматыка*, *група*, *калектыў*, *калекцыя*, *сума*, *карэспандэнт*, *каса*, *касір*, *тэрыторыя*, *піца*, *саміт*; *Ала*, *Васа*, *Генадзь*, *Іна*, *Нона*, *Іпаліт*, *Кірыл*, *Адэса*, *Калькута*, *Марока*, *Ніца*; але: *бонна*, *донна*, *манна*, *панна*, *ванна*, *мадонна*, *саванна*; *Ганна*, *Жанна*, *Сюзанна*, *Мекка* і інш. Напісанне такіх слоў вызначаецца па слоўніку.

3. Ва ўласных імёнах і назвах падоўжанае вымаўленне зычных адлюстроўваецца на пісьме: *Аўгіння*, *Аксіння*, *Анісся*, *Аўдоцця*, *Наталля*, *Таццяна*, *Усціння*, *Фядосся*, *Траццякоўка*; *Краснаполле*, *Залессе*, *Закарпацце* і інш.; але: *Ілья*, *Емяльян*, *Касьян*, *Ульян*, *Ульяна*, *Юльян*, *Юльяна*, *Традзякоўскі* і вытворныя ад іх: *Ільін*, *Ільіч*, *Ільінскі*, *Ільічоўка*, *Ульянаў*, *Ульянаўск*, *ульянаўскі* і інш.

ГЛАВА 3
ПРАВАПІС МЯККАГА ЗНАКА І АПОСТРАФА

§ 18. Змякчальны мяккі знак

1. Мяккі знак пішацца пасля зычных *з*, *л*, *н*, *с*, *ц* (з мяккага *т*), *дз* (з мяккага *д*):

для абазначэння на пісьме мяккасці зычнага на канцы слова: *мядзведзь*, *дзень*, *соль*, *вось*, *чытаць*, *пісаць*, *стань*, *кінь*, *лезь*, *шэсць*, *дзесяць*, *штось*, *дзесь*, *кудысь*, *чагось*, *вішань*, *кухань*, *соцень*, *песень*;

для абазначэння на пісьме мяккасці зычнага перад цвёрдым зычным: *дзядзька*, *бацька*, *касьба*, *барацьба*, *пісьмо*, *вязьма*, *Кузьма*, *восьмы*, *процьма*, *дзьмухавец*;

для абазначэння на пісьме мяккасці зычнага перад наступным мяккім зычным тады, калі пры змене формы таго ж слова (або пры замене яго другім словам таго ж кораня) гэты мяккі зычны становіцца цвёрдым, а папярэдні зычны захоўвае сваю мяккасць: *барацьбе*, *барацьбіт* (*барацьба*), *пісьменнік* (*пісьмо*), *васьмі*, *васьмю* (*восьмы*), *цьмяны* (*цьма*). Калі пры змене формы таго ж слова (або пры замене яго другім словам таго ж кораня) мяккасць зычных не захоўваецца, то мяккасць зычнага перад наступным мяккім зычным на пісьме мяккім знакам не абазначаецца: *дзве — два*, *шэсць — шосты*, *звінець — звон*.

2. Мяккі знак пішацца для абазначэння мяккасці зычных у дзеясловах загаднага ладу:

перад канчаткам першай асобы множнага ліку *-ма*: *кіньма*, *сядзьма*, *станьма*;

перад канчаткам другой асобы множнага ліку *-це*: *будзьце*, *кіньце*, *сядзьце*, *станьце*, *намыльце*;

перад зваротнай часцінай *-ся*: *кінься*, *звесься*.

3. Мяккі знак пішацца для абазначэння мяккасці зычных у назоўніках перад канчаткам творнага склону множнага ліку *-мі*: *коньмі*, *людзьмі*, *грудзьмі*, *дзецьмі*.

4. Мяккі знак пішацца:

у складаных лічэбніках: *пяцьдзясят*, *шэсцьдзясят*, *пяцьсот*, *шэсцьсот*, *дзевяцьсот*;

у часціцы *-сьці*, якая ўваходзіць у склад слова: *штосьці*, *чагосьці*, *кудысьці*, *дзесьці*, *чамусьці*, *якісьці*;

у слове *ледзьве*.

5. Мяккі знак пішацца для абазначэння на пісьме мяккасці [л] перад зычнымі: *пальцы*, *кольцы*, *відэльцы*, *сальца*, *вальцы*, *колькі*, *толькі*, *гульні*, *вельмі*, *Альф'еры*, *бразільскі* (*Бразілія*), *венесуэльскі* (*Венесуэла*), *уральскі* (*Урал*), *лепельскі* (*Лепель*), *лільскі* (*Ліль*), *Мангальф'е*.

6. Мяккі знак пішацца для абазначэння на пісьме мяккасці [н]:

перад суфіксам *-к-*, а таксама перад суфіксам *-чык-* (калі слова без суфікса *-чык-* заканчваецца мяккім знакам): *песенька*, *вішанька*, *нянька* (і *няньчыць*); *каменьчык* (*камень*), *праменьчык* (*прамень*), *карэньчык* (*корань*), *агеньчык* (*агонь*);

перад суфіксам *-ск-* у прыметніках, утвораных ад назваў месяцаў, якія заканчваюцца мяккім [н'], і назоўніка *восень*: *студзеньскі*, *чэрвеньскі*, *ліпеньскі*, *снежаньскі*, *восеньскі*, а таксама ў суадносных уласных назвах: *Чэрвеньскі раён*, *Ліпеньская школа*;

у суфіксе *-еньк-* (*-еньк-*, *-аньк-*): *маленькі*, *даражэнькі*, *прыгожанькі*.

7. Мяккі знак не пішацца:

пасля шыпячых (*ж*, *дж*, *ч*, *ш*), *р*, *ц* (не з *т* мяккага) і *д*, *т*, а таксама пасля губных *б*, *в*, *м*, *п*, *ф*: *дождж*, *ноч*, *мыш*, *цар*, *купец*, *голуб*, *п'едэстал*, *сям'я*, *В'етнам*, *верф*;

пасля *з*, *с*, *ц*, *дз* перад мяккімі зычнымі, калі пры змене формы таго ж слова (або пры замене яго другім словам таго ж кораня) нельга паставіць гэтыя *з*, *с*, *ц*, *дз* перад цвёрдым зычным: *песня — песні — песнямі*, *звер — зверам — звяроў*, *свет — свяціць — асвятленне*, *дзверы — дзвярэй*, *чацвер — чацвяргом*, *чацвёрты — чацвярціна — чацверыком*, *цвёрды — цвярджаць*; *схіліцца*, *скінуць*, *ёсць*, *Дзвіна*, *Дзмітрый*;

пры падаўжэнні зычных: *насенне*, *ралля*, *галлё*, *калоссе*, а таксама падваенні: *ззяць*;

у прыметніках з суфіксам *-ск-*, утвораных ад назоўнікаў на *-нь*: *коніскі* (конь), *астраханскі* (Астрахань), *любанскі* (Любань), *плзенскі* (Плзень), *чань-чунскі* (Чань-Чунь), *цянь-шанскі* (Цянь-Шань).

§ 19. Раздзяляльны мяккі знак і апостраф

1. Раздзяляльны мяккі знак пішацца пасля зычных *л*, *с*, *ц* (з мяккага *т*), *дз* і непрыставачных *н* і *з* перад *е*, *ё*, *і*, *ю*, *я* ў словах іншамоўнага паходжання: *вальера*, *рэльеф*, *калье*, *мільён*, *медальён*, *павільён*, *більярд*, *дасье*, *канферансье*, *манпансье*, *пасьянс*, *парцье*, *парцьера*, *ранцье*, *Фацьян*, *Тэнардзье*, *Дзююі*, *мадзьяры*, *кастаньеты*, *Тэньер*, *каньён*, *Тасіньі*, *Авіньі*, *Сеньі*, *Нью-Ёрк*, *каньяк*, *Карбюзье*, *Лавуазье*, *разьянскі*.

2. Ва ўласных імёнах і назвах, утвораных ад імён на *-ій* (*-ый*), пасля зычных *л*, *с*, *ц*, *дз*, *н*, *з* перад суфіксальным *-еў-* (*-ев-*) пішацца мяккі знак: *Васільеў*, *Васільевіч*, *Васільеўка*, *Васільеўскі востраў*, *Арсеньеў*, *Арсеньевіч*, *Афанасьевіч*, *Кандрацьеў*, *Кандрацьевіч*, *Аркадзьеў*, *Аркадзьевіч*.

3. Пасля *г*, *к*, *х* і збегу зычных, акрамя *нц*, перад суфіксальным *-еў-* (*-ев-*) пішацца *і* (ы): *Георгіеў*, *Георгіевіч*, *Яўціхіеў*, *Яўціхіевіч*, *Іракліевіч*, *Яўлампіевіч*, *Ануфрыеў*, *Ануфрыевіч*, *Ануфрыеўка*, *Дзмітрыеў*, *Дзмітрыевіч*; але: *Вікенцьеў*, *Вікенцьевіч*, *Лаўрэнцьеў*, *Лаўрэнцьевіч*, *Кліменцьевіч* і інш.

4. Апостраф пішацца пры асобным вымаўленні зычных з наступным галосным:

пасля прыставак, якія заканчваюцца на зычную, перад *е*, *ё*, *ю*, *я* і націскным *і*: *ад'ёзд*, *аб'ём*, *аб'ява*, *аб'яднацца*, *пад'ёмны*, *раз'юшыцца*, *між'ярусны*, *аб'інець*, *уз'яднáнне*, *ад'ютáнт*, *ін'якцыя*, *кан'юнктýра*;

у сярэдзіне слова пасля губных *б*, *в*, *м*, *п*, *ф*, заднеязычных *г*, *к*, *х*, зубных *д*, *т* і дрыжачага *р* перад літарамі *е*, *ё*, *і*, *ю*, *я*: *б'ецца*, *вераб'і*, *В'етнам*, *інтэрв'ю*, *сям'я*, *Дзям'ян*, *Камп'ен*, *куп'ё*, *куп'істы*, *п'юць*, *саф'ян*, *Пракоф'евіч*, *Мантэг'ю*, *Лук'ян*, *Х'юстан*, *Аж'е*, *Ч'япа*, *Буш'е*, *Д'еп*, *бар'ер*, *надвор'е*, *Грыгор'еў*, *Юр'ёў*, *Мар'іна Горка*;

у складаных словах з першай часткай *двух-*, *трох-*, *чатырох-*, *шмат-* перад літарамі *е*, *ё*, *ю*, *я*: *двух'ярусны*, *трох'ярусны*, *шмат'ядзерны*, *шмат'ёмісты*.

5. Апостраф не пішацца:

пасля *ў* (у нескладовага) перад літарамі *е*, *ё*, *і*, *ю*, *я*: *абаўецца*, *саўюць*, *салаўі*;

у складаных і складанаскарочаных словах на мяжы састаўных частак, у тым ліку калі іх часткі пішуцца праз злучок: *цэхачэйка*, *дзяржюрвыдавецтва*, *трэд-юніёны*.

ГЛАВА 4
Правапіс абрэвіятур

§ 20. Правапіс абрэвіятур

1. У абрэвіятурах скарочаныя часткі пішуцца так, як у адпаведных поўных словах: *гарсавет* (*гарадскі*), *прафсаюз* (*прафесійны*), *дзяржцырк* (*дзяржаўны*), *прамкамбінат* (*прамысловы*), *галоўурач* (*галоўны*), *генплан* (*генеральны*), *Еўрасаюз* (*еўрапейскі*), *заапарк* (*заалагічны*), *музвучылішча* (*музычнае*), *Белдзяржрэпраект* (*беларускі*, *дзяржаўны*), *Беллітфонд* (*беларускі*, *літаратурны*), *райбудкантора* (*раённая*, *будаўнічая*), *педфак* (*педагагічны факультэт*), *камбат* (*камандзір батальёна*), *ваенкамат* (*ваенны камісарыят*), *эсмінец* (*эскадраны мінаносец*), *прафкам* (*прафсаюзны камітэт*), *ваенкам* (*ваенны камісар*), *гарвыканкам* (*гарадскі выканаўчы камітэт*), *член-кар.* (*член-карэспандэнт*), *лясгас* (*лясная гаспадарка*), *рыбгас* (*рыбная гаспадарка*), *інтэрпал* (*інтэрнацыянальная паліцыя*), *лінкар* (*лінейны карабель*).

2. Літарныя, гукавыя абрэвіятуры і абрэвіятуры змешанага тыпу звычайна пішуцца вялікімі літарамі без кропак, злучкоў і апострафаў: *БДУ* (*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*), *ВНУ* (*вышэйшая навучальная ўстанова*), *ЗША* (*Злучаныя Штаты Амерыкі*), *РВУ* (*рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова*), *УА* (*установа адукацыі*), *ЖЭС* (*жыллёва-эксплуатацыйная служба*), *СНД* (*Садружнасць Незалежных Дзяржаў*), *НАН Беларусі* (*Нацыянальная акадэмія навук Беларусі*), *ЗАТ* (*закрытае акцыянернае таварыства*), *СМІ* (*сродкі масавай інфармацыі*), *МАЗ* (*Мінскі аўтамабільны завод*), *МТЗ* (*Мінскі трактарны завод*), *ЦУМ* (*цэнтральны ўніверсальны магазін*), *УП* (*унітарнае прадпрыемства*), *ГА* (*грамадскае аб'яднанне*), *ТАА* (*таварыства з абмежаванай адказнасцю*), *ААН* (*Арганізацыя Аб'яднаных Нацый*).

Калі да абрэвіятуры дадаецца літба, то яна пішацца праз злучок: *ВАЗ-21*, *МАЗ-200*, *МТЗ-82*.

Калі абрэвіятура скланяецца, канчаткі пішуцца разам малымі літарамі: *у нашым ЖЭСе*, *пра цаваў на МАЗе*, *рамонт ЦУМа*, *дысертацыя ў ВАКу*.

Дапускаецца напісанне малымі літарамі агульнавядомых абрэвіятур, калі слова ўспрымаецца як простае: *схадзіў у жэс* і інш.

Малыя літары могуць уваходзіць у камбінаваныя абрэвіятуры: *ЛіМ*, *БелТА*, *УП «Белкніга»*, *БелНДВІ* (*Беларускі навукова-даследчы ветэрынарны інстытут*).

3. Напісанне няўласнабеларускіх (запазычаных) абрэвіятур вызначаецца па слоўніку; поўны сэнсавы беларускі адпаведнік перадае значэнне такіх запазычанняў, а не расшыфроўвае іх: *заўгас* (загадчык гаспадарчай часткі), *завуч* (намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце), *спецназ* (атрад спецыяльнага прызначэння), *АСУ* (аўтаматызаваная сістэма кіравання), *ЮНЕСКА* (Камісія Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры).

4. У некаторых абрэвіятурах напісанне можа не адлюстроўваць вымаўленне вымаўленне: *ТЮГ* — Тэатр юнага гледача (вымаўляецца [ц'ух]), *РІВШ* — дзяржаўная ўстанова адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы» (вымаўляецца [рыўш]).

5. Літарныя абрэвіятуры не трэба блытаць з умоўнымі графічнымі скарачэннямі, якія ўжываюцца на пісьме, але заўсёды чытаюцца поўнасцю.

Скарачэнне слоў рэгламентуецца наступнымі правіламі:

нельга скарачаць на галосную літару, на *ь*, на *й* і на *ў*;

пры спалучэнні дзвюх аднолькавых зычных скарачэнне робіцца пасля першай зычнай: *насен. фонд*;

пры збегу дзвюх або некалькіх зычных скарачэнне робіцца на апошнюю зычную: *народн. творчасць*;

калі імя або імя па бацьку пачынаецца з дыграфа *Дз*, то ініцыялам выступае толькі літара *Д*: *Дзмітрый Дзмітрыевіч — Д.Д.*

Пры графічных скарачэннях ставіцца кропка і захоўваюцца тыя ж знакі і пачатковыя літары, якія ўласцівы поўнаму напісанню: *В.-Д. к.* (*Волга-Данскі канал*), *с.-д. партыя* (*сацыял-дэмакратычная партыя*), *чл.-кар.* (*член-карэспандэнт*).

6. Стандартныя скарочаныя абазначэнні метрычных мер пішуцца без кропак: *га* (*гектар*), *см* (*сантыметр*), *кг* (*кілаграм*), *км* (*кіламетр*) і інш.

Ніжэй прыводзяцца агульнапрынятыя скарачэнні, якія не патрабуюць спецыяльнага тлумачэння.

Напрыклад:

акад. — *акадэмік*;
б. — *былы*;
бухг. — *бухгалтэрыя*;
в. — *вёска*;
в.а. — *выконваючы абавязкі*;
в-аў — *востраў*;
вобл. — *вобласць*;
воз. — *возера*;
г. — *год*;
г. — *горад*;
гг. — *гады*;
г.зн. — *гэта значыць*;
гл. — *глядзі*;
гр. — *грамадзянін*;
дац. — *дацэнт*;
заг. — *загадчык*;
зб. — *зборнік*;
і г.д. — *і гэтак далей*;
і да т.п. — *і да таго падобнае*;
і інш. — *і іншае*;
і пад. — *і падобнае*;
нам. — *намеснік*;
напр. — *напрыклад*;
н.ст. — *новы стыль*;
н.э. — *наша эра*;
параўн. — *параўнай*;
п-аў — *паўвостраў*;
праф. — *прафесар*;
р. — *рака*;
р-н — *раён*;
руб. — *рубель*;
с. — *старонка*;
с.-г. — *сельскагаспадарчы*;
сс. — *старонкі*;
с/с — *сельскі савет*;
ст. — *стагоддзе*;
стст. — *стагоддзі*;
ст.ст. — *стары стыль*;
т. — *том*;
таў. — *таварыш*;
т-ва — *таварыства*;
т.зв. — *так званы*;
тт. — *тамы*.

ГЛАВА 5
ПРАВАПІС НЕКАТОРЫХ МАРФЕМ

§ 21. Аднамарфемныя прыназоўнікі

1. Прыназоўнікі *аб*, *над*, *пад*, *перад* пры спалучэнні з формамі асабовага займенніка *я*, што пачынаюцца збегам зычных, пішуцца з дадатковым *а*: *аба мне*, *нада мной*, *перада мной*. Прыназоўнік *з* замяняецца ў падобных выпадках на *са*: *са мной*; але: *з мяне*. Прыназоўнік *у* набывае форму *ва* ў спалучэннях са словамі з пачатковым *у*: *ва ўніверсітэце*, *ва ўрачыстасцях*, *ва ўрочышчы*.

2. Варыянт *са* прыназоўніка *з* згодна з вымаўленнем пішацца перад збегам зычных, калі першы з іх — шыпячы або свісцячы: *са школы*, *са шкіперам*, *са свавакамі*, *са смеху*, *са зброяй*, *са старых часоў*, *са сваімі сябрамі*, *са звонам*, *са здымка*, *велічыней са шраціну*, *са знічкай*; але: *з братам*, *з праўдай*, *з пляча*, *з грукатам*, *з цвіком*, *адно з двух*.

§ 22. Прыстаўкі

1. Да прыставак *аб-*, *ад-*, *над-*, *пад-*, *раз-* (*рас-*), *с-* (*з-*), *уз-* (*ус-*) пры спалучэнні з марфемамі, якія пачынаюцца збегам зычных, далучаецца дадатковае *а*: *абагравáць* (*абрываць*), *абагнаць* (*абганяць*), *адаспаць* (*адсыпацца*), *адапхнуць* (*адпіхваць*), *забрацца* (*збяру*), *сарваць* (*зрываць*), *надагнуць* (*надгінаць*), *падаспець*, *сатлелы*, *абамлець*. Дапускаецца напісанне ўстаўнога *а* для раздзялення двух губных гукаў: *абабягаць*, *абаперціся*.

2. Прыстаўка *су-* пішацца:

у назоўніках, дзе *су-* выдзяляецца толькі гістарычна: *сусед*, *сувой*, *сувязь*, *супын*, *супынак*, *сутаргі*, *сумятня*, *супастат*, *супоня*, *суткі*, *сутокі*, *суцяга*, *сумёт*, *сустаў*;

у новых утварэннях, калі ёсць слова і без *су-*: *суграмадзянін*, *супалімер*, *сукрэдытор*, *сукіраўнік*, *супастаўшчык*, *сучлен*, *суапякун*, *супрацоўнік*, *суродзіч*, *сунаймальнік*, *суспадчыннік*, *суадказчык*, *сузабудоўшчык*, *сувыканаўца* і інш.;

у словах, якія без *су-* не ўжываюцца: *суквецце*, *сузор'е*, *сулад-дзе*, *сугучча*, *суглінак*, *супесак*, *сукравіца*, *сузіральнік*, *сумежжа*.

3. Прыстаўка *су-* пішацца:

у дзеясловах: *суадносіць*, *супадпрадкоўваць*, *сумяшчаць*, *сіснаваць*, *сустракацца*, *сутыкацца*, *супярэчыць*, *супастаўляць*, *супадаць*;

у прыметніках: *сумежны*, *сукупны*, *суладны*, *сугучны*, *сучасны*, *сувымірапарцыйны*, *супольны*, *сумесны*, *суцэльны*;

у прыслоўях: *су́праць* (*супро́ць*).

4. Прыстаўка *су-* захоўваецца ў лексемах, словаўтваральна звязаных са словамі, што маюць прыстаўку *су-*: *сутачны* (*суткі*), *суцяжнічаць* (*суцяга*), *сурэдактарстваваць* (*сурэдактар*), *суапякунства* (*суапякун*), *сузіранне* (*сузіраць*), *сумяшчальнік* (*сумяшчаць*), *сустрэчны* (*сустрэча*), *супярэчлівасць* (*супярэчлівы*), *сумежнасць* (*сумежны*), *супольнасць* (*супольны*), *сумесна* (*сумесны*), *насупраць* (*супраць*) і інш.

5. Прыстаўка *са-* пішацца:

у некаторых назоўніках, дзе прыстаўка выдзяляецца толькі гістарычна: *сасуд*, *савет*, *сабор*, *саюз*, *саслоўе*;

у запазычаннях і кальках (пераважна з рускай мовы): *саіскальнік*, *сакурснік*, *садружнасць*, *сатрапезнік*, *сачыненне*, *састаў*, *саслужывец* і інш.

6. Прыстаўка *са-* захоўваецца:

у лексемах, словаўтваральна звязаных са словамі з прыстаўкай *са-*: *саўдзел* (*саўдзельнік*), *саслоўны* (*саслоўе*), *састыкоўванне* (*састыкаваць*), *састаўляць* (*састаў*), *сашчэпка* (*сашчапіць*), *сапраўды* (*сапраўдны*) і інш.;

у дзеясловах, калі *са-* з'яўляецца варыянтам *с-* (перад збегам зычных): *садраць* (*здзяру*), *сагнаць* (*зганяю*), *саскочыць*, *сажмурыць*, *сасмажыць*, *саслабець*, *сасвататься*, *састроіць*, *сашмаргнуць*, *сашпіліць*, *сашпурхнуць*, *сасмягнуць*, *сагнуць*, *сагрышыць*, *сашчыкнуць*, *сашчапіць* і інш.;

у прыметніку *сапраўдны* і вытворных ад яго.

Напісанне прыставак *су-* і *са-* ў іншых выпадках вызначаецца па слоўніку.

7. Калі апошняя зычная літара прыстаўкі і першая літара кораня супадаюць, то пішуцца абедзве літары: *аддача*, *аддалены*, *Наддзвінне*, *наддаць*, *бяззорны*, *ззаду*, *ззелянелы*, *ссадзіць*, *ссівелы*, *бессардэчны*, *паддопытны*, *рассыпаць*, *раззлавацца*, *рассаднік* (тое, што з'яўляецца крыніцай чаго-небудзь), *уссадзіваць*, *контрразведка*, *звышштатны*, *транссібірскі*.

Словы-тэрміны іншамоўнага паходжання часткова падпарадкоўваюцца гэтаму ж правілу (асабліва тады, калі ёсць словы і без прыстаўкі, а прыстаўка далучаецца і да іншых каранёў): *сюррэалізм*, *аддукцыя* (*рэалізм*, *індукцыя*).

У некаторых выпадках, калі слова ўспрымаецца як невытворнае ў беларускай мове, літары не падвойваюцца: *інавацыя*, *ірыгацыя*, *ірэальны*, *іміграцыя*, *акамадацыя*, *карэляцыя*, *аперацыя*, *дысідэнт*, *імартэль*, *анігіляцыя*, *інервацыя*, *акорд*, *карэспандэнт*. Напісанне такіх слоў-тэрмінаў вызначаецца па слоўніку.

У словах *расол*, *расольнік*, *расада*, *расаднік* (месца, скрынка для вырошчвання расады) адбылося сцяжэнне гукаў, і таму яны пішуцца з адной літарай *с*.

8. Да прыставак на *з-* адносяцца: *з-*, *із-*, *уз-*, *раз-*, *без-*, *небез-*, *абез-*, *праз-*, *цераз-*, а таксама *дыз-* і *дэз-*. У пэўных пазіцыях літара *з* замяняецца літарай *с*.

У прыстаўках *з-*, *із-*, *уз-*, *раз-*, *без-*, *небез-*, *абез-*, *праз-*, *цераз-* літара *з* пішацца перад звонкімі, санорнымі зычнымі і ётаванымі галоснымі (перад апострафам): *збіць*, *здаць*, *знесці*, *ізноў*, *узняць*, *узбіцца*, *розгалас*, *бязмежны*, *небеззаганны*, *небяз-грэшны*, *абезгалосець*, *абязгрошыць*, *празмерны*, *цераззерніца*; *раз'есці*, *раз'езд*, *абяз'ёдаваны*, *з'інець*, *раз'юшаны*, *без'языкі*, *бяз'ядзерны*, *з'ялчэць*, *з'явіцца*, *уз'юрыцца*. У слове *разявіць* і вытворных ад яго, а таксама ў словах *узлавáць* і *ўзлавацца* адбылося сцяжэнне [з] — прыстаўкі і [з] — кораня.

У гэтых жа прыстаўках замест літары *з* пішацца літара *с* перад глухімі зычнымі: *скінуць*, *схапіць*, *іспыты*, *усхваляць*, *раскідаць*, *росліс*, *беспадстаўны*, *небескарысны*, *абяскроівіць*, *абяскішкодзіць*, *цераспалосіца*, *росшукі*, *росчырк*.

Калі корань слова пачынаецца з галосных *а*, *у*, *э* або ненаціскнога *і*, якое пераходзіць у *ы*, замест прыстаўкі *з-* пішацца прыстаўка *с-*: *сарганізаваць*, *сумысна*, *сэканоміць*, *сыграць*; але: *зымправізаваць*, *зыначыць*.

9. У словах, утвораных ад дзеясловаў *ісці*, *хадзіць*, прыстаўкі на *з-* пішуцца ў залежнасці ад лексічнага значэння: *зысці* — *сысціся* — *сысцісця*, *зыходзіць* — *сыходзіць*, *зыходзячы* — *сыходзячы*, *зыходны* — *сходны*, *сыходны*, *зыход* — *сход*.

10. У прыстаўцы *дыз-* перад галоснымі (у тым ліку ётаванымі) пішацца *з*, а перад зычнымі — *с*: *дызасацыяцыя*, *дызартыя*, *дыз'юнкцыя*, *дысгармонія*, *дысграпорцыя*, *дысквалівікаваць*, *дысфункцыя*, *дыскрэдытаваць*, *дыскамфорт*.

11. Прыстаўка *дэз-* пішацца нязменна: *дэзактывацыя*, *дэзарыентацыя*, *дэзынфекцыя*, *дэзынтэграцыя*, *дэзурбанізацыя*.

12. Спалучэнні літар *сч*, *сш*, *сыч*, *зж*, *здж* на стыку прыстаўкі і кораня перадаюцца нязменна: *расчахліць*, *расчэсваць*, *расчыніць*, *счысціць*, *счапіць*, *счэп*, *усчаць*, *счакацца*, *бесчалавечны*, *бясчулы*, *расчапіць* (*раз'яднаць*), *усчапіць* (*павесіць*); *расшыць*, *расшыпрэнне*, *сшытак*, *сшарэлы*, *расшумецца*, *расшпілены*, *бяс-шкодны*, *бясшлюбны*; *расшчапіць* (*раскалоць*), *расшчапленне* (*расколванне*), *расшчэп* (*раскол*) (не блытаць *счапіць* і *шчапаць*), *расшчаміць* (*разняць*), *расшчодрыцца*, *расшчоўкацца*; *зжыцца*, *разжаць*, *разжаліць*, *разжаніць*, *разжыва*, *бязжурботна*, *бязжыццёвы*; *зджаліць*.

Выключэнні: *рашчыніць* (паставіць цеста), *ушчуваць*, *нішчымны*, а таксама вытворныя ад іх: *рошчына*, *ушчуванне*, *ушчунак*, *нішчымніца*.

13. Пры спалучэнні прыставак (*аб-*, *ад-*, *над-*, *пад-*, *раз-*, *з-* (*с-*), *уз-*, *спад-*, *перад-*, *дэз-*, *суб-*) са словамі, што пачынаюцца з *і*, у адпаведнасці з вымаўленнем замест *і* пішацца *ы*: *абыграць*, *абынтэлігенціцца*, *зымправізаваць*, *зыначаны*, *зысці*, *сысці*, *адыграць*, *адыменны*, *адыходзіць*, *сыграцца*, *сышчык*, *узыход*, *спадылба*, *спадысправаць*, *перадынфарктны*, *падынтэграваць*, *разысціся*, *перадымперскі*, *перадыспытны*, *субынспектар*, *дэзынтэграгатар*, *дэзынфармацыя*, *дэзынфіцыраваць*.

Пасля прэфіксоідаў (*звыш-*, *між-*, *пан-*, *супер-*, *транс-*, *контр-*) *і* захоўваецца: *звышімклівы*, *звышіндустрыяльны*, *звышінфляцыя*, *міжірыгацыйны*, *міжінстытуцкі*, *панісламізм*, *контрідэя*, *контрігра*, *суперінтэлект*, *трансіндыйскі*.

У складанаскарочаных словах, першая частка якіх заканчваецца на цвёрды зычны, пачатковае *і* другога слова пішацца нязменна: *педінстытут*, *дзяржінспектар*, *палітінфармацыя*, *санінструктар*, *цяжіндустрыя*, *медінструменты*, *спецінструктаж*, *гарінспекцыя*, *гасінвентар*.

Прэфіксоід *экс-* пішацца праз злучок, і *і* не пераходзіць у *ы*: *экс-інжынер*, *экс-імператар*.

Некаторыя словы з коранем *-ход-* маюць варыянтныя формы: *адыходлівы* — *адходлівы*, *адыходнае* — *адходнае*, *адыходы* — *адходы*, *адыходнік* — *адходнік*.

§ 23. Суфіксы

1. Пераважная большасць запазычаных дзеясловаў ужываецца з суфіксам *-ава-* (*-ява-*): *дэградаваць*, *фальсіфікаваць*, *арыентаваць*, *прагназаваць*, *балансаваць*, *цытаваць*, *аналізаваць*, *іранізаваць*, *культываваць*, *кантактаваць*, *планаваць*, *групаваць*, *нацыяналізаваць*, *прыватызаваць*, *дэкларацыяваць*, *ліквідаваць*, *акліматызаваць*, *перафразаваць*, *кваліфікаваць*, *інфармаваць*, *урбанізаваць*, *каталізаваць*, *функцыянаваць*, *вакцінаваць*, *кантраляваць*, *тыпізаваць*, *паразітаваць*, *фінансаваць*, *тыражаваць*, *ігнараваць*, *рэагаваць*, *кансультаваць*, *прафілявать*, *ангажаваць*, *нервавать*, *абстрагаваць*, *імпартаваць*, *дэбатаваць*, *дэбютаваць*, *інспектаваць*, *экспартаваць*, *рэканструяваць*, *дыскутаваць*, *правакаваць*, *фінішаваць*.

2. Дзеяслоўны суфікс *-ірава-* (*-ырава-*) ужываецца:

калі без гэтага суфікса ўзнікае аманімія дзеясловаў з дзеясловамі з суфіксам *-ава-* (*-ява-*): *буксіраваць* — *буксаваць*, *парадзіраваць* — *парадаваць*, *візіраваць* — *візаваць*, *будзіраваць* — *будаваць*, *газіраваць* — *газаваць*, *камандзіраваць* — *камандаваць*, *пазіраваць* — *пазаваць*, *пасіраваць* — *пасаваць*, *тушыраваць* — *тушаваць*, *парыраваць* — *паравать*, *паніраваць* — *панаваць*, *фарміраваць* — *фармаваць*, *апаніраваць* — *апанаваць*;

калі дзеяслоў без *-ір-* (*-ыр-*) губляе сваю фармальную і семантычную акрэсленасць: *шакіраваць*, *бісіраваць*, *бравіраваць*, *гарманіраваць*, *драпіраваць*, *лабіраваць*, *грасіраваць*, *курыраваць*, *лавіраваць*, *дэкарыраваць*, *сервіраваць*, *фантазіраваць*, *лакіраваць*, *штудзіраваць*, *мусіраваць*, *татуіраваць* і інш.;

калі дзеяслоў мае вузкатэрміналагічнае значэнне: *манціраваць*, *пасіраваць*, *аксідзіраваць*, *зандзіраваць*, *дэкаціраваць*, *сталіраваць*, *дэмпфіраваць*, *юзіраваць*, *юсціраваць*, *парафіраваць*, *дыфундзіраваць*.

У некаторых выпадках паралельна ўжываюцца дзве формы: *дэмаскіраваць* — *дэмаскаваць*, *акупіраваць* — *акупаваць*, *курсіраваць* — *курсаваць*, *калькіраваць* — *калькаваць*, *базіраваць* — *базаваць*.

3. Суфікс *-ава-* (*-ява-*) пішацца ў незначальнай форме і формах прошлага часу тых дзеясловаў, якія ў першай асобе адзіночнага ліку губляюць гэты суфікс і заканчваюцца на *-ую* (*-юю*): *галасую* — *галасаваць*, *галасаваў*, *галасавала*, *галасавалі*, *начую* — *начаваць*, *чаргую* — *чаргаваць*, *малюю* — *маляваць*, *камандую* — *камандаваць*, *пакутую* — *пакутаваць*, *даследую* — *даследаваць*, *будую* — *будаваць*, *рэкамендую* — *рэкамендаваць*, *характарызую* — *характарызаваць*.

4. Суфікс *-іва-* (*-ыва-*) пішацца ў незначальнай форме і асабовых формах цяперашняга часу дзеяслова, а таксама ў формах прошлага часу незакончанага трывання пасля зычных, апошні з якіх *л*, *р* або *н*: *падкрэсліваць*, *падкрэсліваю*, *падкрэсліваў*, *падкрэслівалі*; *падтрымліваць*, *адыгрываць*, *выветрываць*, *запэўніваць*, *адрозніваць*.

5. Суфікс *-ва-* пішацца ў асатніх выпадках: *выконваць*, *выконваю*, *выконваў*, *выконвалі*; *адказваць*, *вымешваць*, *адмерваць*, *заканчваць*, *загадваць*, *адорваць*, *разбэшчваць*, *падстрэльваць*, *раздумваць*, *завaёўваць*, *зацяружваць*, *дагульваць*, *размяркоўваць*, *забінтоўваць*, *распілоўваць*.

У дзеясловах *выйграваць* і *прайграваць* пішацца суфікс *-ава-*.

6. Калі неазначальная форма дзеяслова заканчанага трывання заканчваецца на *-іць* або *-яць* з папярэдняй галоснай, то ў незаканчаным трыванні перад суфіксам *-ва-* пішацца *й*: *утаіць* — *утойваць*, *супакоіць* — *супакойваць*, *засвоіць* — *засвойваць*, *узброіць* — *узбройваць*, *напаіць* — *напойваць*, *склеіць* — *склейваць*, *абнадзеіць* — *абнадзейваць*; *засеяць* — *засейваць*, *абсмяяць* — *абсмейваць*, *запаяць* — *запайваць*, *настаяць* — *настойваць*.

7. Суфікс *-ен-* пішацца ў дзеепрыметніках, утвораных ад дзеясловаў на *-іць*, *-ці*: *адчынены*, *выбелены*, *згублены*, *супакоены*, *споены*, *накормлены*, *куплены*, *спаганены*, *скрыўлены*

ЗАЦВЕРДЖАНА
Закон Рэспублікі Беларусь
23.07.2008 № 420-3

ПРАВІЛЫ
БЕЛАРУСКАЙ АРФАГРАФІІ І ПУНКТУАЦЫІ

(Працяг. Пачатак у нумары за 26 ліпеня.)

ГЛАВА 12
ШМАТКРОП'Е

§ 45. Правілы пастаноўкі шматкроп'я

1. Шматкроп'е ставіцца ў канцы апавядальнага сказа для абазначэння незакончанасці выказвання.

Напрыклад:

Няма Хатыні... Звоняць толькі званы (Р. Мачульскі).

І змоўклі абодва надоўга, думалі кожны пра сваё... (Б. Сачанка).

Беларусь, Беларусь, ні канца, ні краю... (Я. Брыль).

Направа будзе лісцвяны лясок. За ім вёска Ямшчына. За Ямшчынай проста дарога на поўдзень. Адлічыш па дарозе дзве першыя вёскі... (К. Чорны).

Людзі ездзяць, а ты… (Я. Брыль).

2. Шматкроп'е ставіцца пасля апошняга слова пералічэння, калі яно абрываецца.

Напрыклад:

У гэтым кутку міжрэчча некалькі вёсак маюць назву Рудня: Рудня Марымонава, Рудня Каменева... (І. Шамякін).

Ёсць кулямёты, ёсць аўтаматы. І шаблі, карабіны... (Б. Сачанка).

Чуецца гоман мне спелае нівы, ціхая жальба палёў, лесу высокага шум-гуд шчаслівы, песня магутных дубоў... (Я. Колас).

3. Шматкроп'е ставіцца для абазначэння нечаканых перапынкаў, перарывістасці ў маўленні, што ўзнікаюць у выніку перажыванняў, хвалявання чалавека або пошуку спосабу выражэння думкі.

Напрыклад:

— Я... так... хлопец... падарожны, праз сябе сам... Я... нічый! — і пры гэтым асцярожна ён [Сымон] *зірнуў на дзедаў кій* (Я. Колас).

Я хацеў сказаць, што мы… сёння... не сустракаемся... (І. Мележ).

Чакай, як жа я зе [настаўніцу] *звалі... Гм, Людміла Рыгораўна... Людміла Рыгораўна Капуцкая... Здаецца, зусім нядаўна тое ўсё было... А колькі чаго перажыта!..* (Б. Сачанка).

А Сава сказаў коратка і проста: «Для мяне, хоць зараз...» — «Нічога...— перабіў Паддубны. — Толькі канспірацыя... прашу... Асцярожна. Вывучайце сваіх людзей...» (П. Пестрак).

— Антоська!.. родны мой! канаю… перагарэў, адстаў, знікаю... Вядзі ж ты рэй, вядзі... адзін... як лепшы брат, як родны сын (Я. Колас).

— Я спужаўся?! — разгарачыўся Лявон. — Я спуж... (З. Бядуля).

4. Шматкроп'е ставіцца ў пачатку, у сярэдзіне, у канцы цытаты, каб паказаць, што ў гэтых месцах прапушчаны словы.

Напрыклад:

К. Крапіва, раскрываючы сутнасць сатырычных твораў, адзначае: «...рэзананс сатырычнага твора... залежыць ад значнасці аб'екта, на які гэты твор накіраваны».

Доўгі час сяброўскія адносіны звязвалі І. Шамякіна з І. Мележам. «Безумоўна, жывучы па-суседску, — успамінае ён, — мы часта заглядвалі адзін да аднаго і вялі цікавыя літаратурныя размовы, больш спакойныя, глыбокія, чым нашы калектыўныя дыспуты...».

І. Шамякін успамінае: «Пленум... надзвычай узбагаціў мяне» (В. Каваленка).

5. У лексікаграфічных працах пры пропуску часткі цытаты-ілюстрацыі звычайна ставяцца дзве кропкі.

Напрыклад:

БАРВЕ́ЦЬ, -веме; незак. Тое, што і б а р в а в е ц ь (у 2 знач.). *Грывы канчаліся трохі наводаль, а за імі.. барвелі ў густой зелені плямы ўжо чырвоных асінак.* Караткевіч (Тлумачальны слоўнік беларускай мовы).

6. Калі скарачаецца цытата, у канцы якой павінен стаяць пытальнік або клічнік, то гэтыя знакі ставяцца пасля дзвюх кропак.

Напрыклад:

Гэй! узвейце сваім крыллем, арляняты, буйна, бурна..! (Я. Купала).

Параўн.: *Гэй! узвейце сваім крыллем, арляняты, буйна, бурна, на мінулых дзён магіле, над санлівасцю хаўтурнай!*

7. Шматкроп'е ставіцца ў дыялогу, каб перадаць маўчанне замест адказу на зварот суразмоўцы.

Напрыклад:

— Дык што, пайшлі?— запыталася дзяўчынка.

— ...

— Ну, чаго ты маўчыш?

8. Шматкроп'е ставіцца паміж абзацамі пры нечаканым пераходзе ад аднаго плана апавядання да другога.

Напрыклад:

Яна была яшчэ зусім маладая, але на твары яе ляжаў адбітак перажытага. Цесненькія маршчынкі сабраліся на яе лбе і каля рота, сінія кругі былі пад вачыма, твар увесь быў запэцканы зямлёй. Кароценькі рваны кажушок на ёй таксама быў у зямлі...

Часавы раздзеўся, набраў у кварту вады і стаў умывацца. За ім памыліся яшчэ два. Кабета падняла галаву і папрасіла дазвалення памыцца (К. Чорны).

Калі пераход ад аднаго плана апавядання да другога мае больш рэзкі характар, то шматкроп'е ставіцца ў канцы першага абзаца і ў пачатку другога.

Напрыклад:

Ці помніць яна, што гаварыла вясною? Тады ў садзе белай пенай з ружовымі прасветамі цвілі яблыні... Цвілі, каб за ўсё лета антонаўкі выраслі, паспелі, сталі такімі, як некалі яна казала...

...Успомніла! Зірнула на Антона, усміхнулася, узяла самы большы яблык і паднесла да губ (І. Грамовіч).

9. Шматкроп'е можа ставіцца пасля «назоўнага тэмы».

Напрыклад:

Хатынь... Мала хто чуў, мусіць, гэтую назву да вайны. Мала хто ведаў і самую вёску, якая згубілася сярод лясоў і пагоркаў Лагойшчыны.

Максім Багдановіч... Кароткі быў яго жыццёвы век. Ён вымяраецца дваццаццю пяццю гадамі. Многія літаратары ў такім узросце толькі пачынаюць творыць. Ён жа — закончыў (А. Бачыла).

ГЛАВА 13
КОСКА Ў ПРОСТЫМ СКАЗЕ

§ 46. Коска паміж аднароднымі членамі сказа

1. Коскай раздзяляюцца аднародныя члены сказа, якія не звязаны паміж сабой злучнікамі.

Напрыклад:

Згінулі сцюжы, марозы, мяцеліцы (Я. Купала).

Наўкола гуў, гаманіў, мітусіўся салдацкі натоўп (В. Быкаў).

Молада, хораша, звонка спяваў гарманіст (Я. Брыль).

Не з'яўляюцца аднароднымі членамі і не аддзяляюцца адзін ад аднаго коскай два дзеясловы ў аднолькавай форме, якія стаяць побач, утвараючы ў сэнсавых адносінах адно цэлае тыпу: *Пайду вазьму. Пайсці даведацца. Вазьмі аднясі. Сядзем абмяркуем. Устань паглядзі.*

2. Раздзяляюцца коскамі два або некалькі прыметнікаў-азначэнняў, якія адносяцца да аднаго і таго слова ў сказе і характарызуюць прадмет з аднаго боку, г.зн. называюць падобныя прыкметы аднаго прадмета.

Напрыклад:

Мяккія, ласкавыя гукі стройным сугалоссем паліліся па пакоі (Я. Колас).

Беларусь, твой народ дачакаецца залацістага, яснага дня... (М. Багдановіч).

Раздзяляюцца коскамі азначэнні, якія абазначаюць адметныя адзнакі розных прадметаў.

Напрыклад:

Навучэнцы гімназій маюць магчымасць вывучаць нямецкую, французскую, іспанскую, англійскую літаратуры.

Не раздзяляюцца коскамі неаднародныя прыметнікі-азначэнні.

Напрыклад:

Над далёкімі лясамі звісала тонкая блакітная смуга (Я. Колас).

Я гляджу на зялёнае рослае жыта, на крутыя мурожныя ў лузе стагі (С. Грахоўскі).

Плыве над верасам хваёвы душны пах (П. Панчанка).

Насталі кароткія туманныя асенніе дні (Я. Колас).

3. Коскай аддзяляюцца аднародныя члены сказа, якія звязваюцца паміж сабой злучнікамі *а*, *але*, *ды* (у значэнні «але»), *аднак*, *хоць*, *толькі* і інш.

Напрыклад:

Паўлюк толькі зірнуў, але нічога не сказаў (Я. Колас).

Сонца толькі што ўзышло, аднак прыгравала ўжо даволі горача (Э. Самуйлёнак).

Голас яго ўжо быў амаль звычайны, толькі хрыпеў... (І. Шамякін).

І дзядзька быў рыбак выдатны, хоць больш урыўкавы, прыватны... (Я. Колас).

Дождж быў моцны, ды кароткі.

4. Коскай аддзяляюцца аднародныя члены сказа, якія звязваюцца пры дапамозе парных злучнікаў *як ... так і*; *не толькі ... але (а) і*; *калі не ... то (дык)*; *хоць ... але (а)*; *хоць і не ... затое (аднак)*; *не то што ... але і* і інш.

Напрыклад:

Яна была яшчэ на стол, так і застыла з ёю на паўдарозе (І. Шамякін).

Каб не то што сказаць, але і падумаць ніхто кепскага не мог... (І. Мележ).

Якуб Колас — паэт, і паэт не толькі ў сваіх паэмах, але і ў прозе (Б. Сачанка).

5. Коскай аддзяляюцца адзін ад аднаго аднародныя члены сказа, якія звязваюцца пры дапамозе паўторных злучнікаў *і ... і*, *ды ... ды*, *то ... то*, *ні ... ні*, *не то ... не то*, *ці ... ці*, *ці то ... ці то*, *або* (*альбо*) *... або* (*альбо*) і інш.

Напрыклад:

Я рад і сонцу, і вясне, і дожджыку (Я. Пушча).

Пазбіраць іх [людзей] *толькі трэба ды на добрую дарогу наставіць, ды даць ім добрага камандзіра* (Я. Колас).

Касцы ідуць то грамадою, то шнурам цягнуць, чарадою, то паасобку, то па пары... (Я. Колас).

Ні далеч, ні час не заслоняць мне родных бароў (Я. Колас).

Потым чуваць ці то птушыны шчэбет-перасвіст, ці то веснавое бульканне ручаін (Я. Брыль).

6. Калі паўторныя злучнікі *і ... і*, *ні ... ні*, *то ... то* звязваюць словы як аднародныя часткі ўстойлівых (фразеалагічных) выразаў, то ў іх перад гэтымі злучнікамі коска не ставіцца.

Напрыклад:

і днём і ноччу, *і туды і сюды*, *і смех і грэх*, *і смех і слёзы*, *і смех і гора*, *і скокам і бокам*, *і так і сяк*, *і так і гэтак*, *і тут і там*, *і вашым і нашым*, *і такі і гэтакі*, *і ў хвост і ў грыву*;

ні так ні гэтак, *ні бэ ні мэ*, *ні сёе ні тое*, *ні з таго ні з сяго*, *ні ўзад ні ўперад*, *ні жывы ні мёртвы*, *ні рыба ні мяса*, *ні кала ні двара*, *ні даць ні ўзяць*, *ні многа ні мала*, *ні больш ні менш*, *ні адтуль ні адсюль*, *ні свет ні зара*, *ні стаць ні сесці*, *ні села ні пала*, *ні слуху ні духу*, *ні складу ні ладу*, *ні гневу ні ласкі*, *ні канца ні краю*, *ні сват ні брат*, *ні к сялу ні к гораду*, *ні ў кола ні ў мяла*, *ні ў пяць ні ў дзесяць*, *ні грозьбай ні просьбай*, *ні спору ні ўмалоту*, *ні дому ні лому*;

то скокам то бокам, *то сюды то туды*, *то ўзад то ўперад*, *то тое то сёе*, *то так то сяк* і інш.

7. Не аддзяляюцца коскай два аднародныя члены сказа, якія звязваюцца паўторнымі злучнікамі, калі яны паводле сэнсу і інтанацыі ўтвараюць адзінства.

Напрыклад:

Як хмары закрылі і сонца і зоры, пайшоў [Каліна] *партызаніць да бору...* (П. Броўка).

Вітаю цябе я і соллю і хлебам! (Я. Купала).

І дзень і два яны ў дарозе (Я. Колас).

Ці вясною ці ўлетку шмат народу на палетку (А. Русак).

8. Коскай раздзяляюцца ўсе аднародныя члены сказа, калі папярэднія з іх звязаны паміж сабой без злучнікаў, а наступныя — пры дапамозе паўторнага злучніка *і*.

Напрыклад:

Жыццё чулася ў траве, у гаёчку, і лясочку, на палях, і на лугах, і ў зялёненькім лужочку, і ў крынічных берагах (Я. Колас).

*Дзень іграе на жалейцы, на трубе, і на ражку, і на сінім трысняг*у (М. Танк).

9. Калі паўторны злучнік *і* стаіць пасля першага аднароднага члена, перад злучнікам таксама ставіцца коска.

Напрыклад:

У песнях жа родны край, родныя словы жылі, і жывуць, і жыць будуць (Я. Купала).

10. Коскай аддзяляюцца аднатыпныя пары аднародных членаў сказа, звязаных паміж сабой злучнікам *і*. (У сярэдзіне пар коска не ставіцца.)

Напрыклад:

Паэтам сваёй справы павінен быць кожны: каваль і інжынер, матэматык і гісторык, географ і выкладчык літаратуры (В. Вітка).

Сосны і вязы, дубы і асіны вакол возера вартай пасталі (Я. Купала).

11. Калі злучнік *і* звязвае больш як дзве пары аднародных членаў сказа, то перад ім ставіцца коска. (У сярэдзіне пар, звязаных паміж сабой злучнікам *і*, коска не ставіцца.)

Напрыклад:

Лясы ў нашай краіне можна сустрэць вялікія і малыя, і густыя і рэдкія, і хвойныя і змешаныя.

12. Калі злучнік *і* звязвае неаднатыпныя пары аднародных членаў сказа, паміж імі коска не ставіцца.

Напрыклад:

Удзень і ўночы над палямі і лясамі чуліся выбухі снарадаў і аўтаматная страляніна (І. Мележ).

§ 47. Коска паміж словамі, якія паўтараюцца

1. Коскай раздзяляюцца аднолькавыя словы і радзей — спалучэнні слоў, не звязаныя паміж сабой злучнікамі (за выключэннем *і*, *ды*), якія пераважна стаяць побач і паўтараюцца для сэнсавага падкрэслівання працягласці, бесперапыннасці дзеяння, для колькаснага або эмацыянальнага выдзялення прадмету, з'яў, асоб, для ўзмацнення прыкметы і ступені якасці, сцвярджэння або адмаўлення і інш.

Напрыклад:

Плыве, плыве за хмарай хмара... (П. Трус).

Не веру, не веру і не веру. Гэтага не магло быць (К. Крапіва).

Ніколі, ніколі нідзе не забыць, як хлопцы выходзяць адранкам касіць (П. Броўка).

І рэчка ёсць. А рыбы, рыбы! (Я. Колас).

2. Калі перад словам, якое паўтараецца, стаіць слова *толькі* або *і толькі* ці *іменна*, то коскамі выдзяляецца разам усё гэта спалучэнне.

Напрыклад:

Перад Лабановічам усплыў вобраз Ядзівсі, і зноў аб ёй, толькі аб ёй, пачаў ён думаць (Я. Колас).

Значыць, ты з ім, іменна ты з ім, а не ён з табою (А. Куляшоўскі).

У яго, і толькі ў яго, хацела б яна вучыцца мужнасці, высакародству, адданасці справе (А. Васілевіч).

3. Калі перад кожным словам, якое паўтараецца, стаіць злучнік *і*, то перад ім ставіцца коска.

Напрыклад:

І гудуць, і гудуць па азімай раллі трактары (М. Танк).

Глуха шэпча лес зялёны, і шуміць ён, і шуміць (Я. Колас).

Коска ставіцца перад далучальнымі злучнікамі *і*, *ды*, якія стаяць пры паўтораным слове з удакладненнем.

Напрыклад:

Я пакахаў цябе з дзяцінства, і пакахаў да слёз (П. Трус).

4. Коскай не раздзяляюцца пры паўторным ужыванні словы, якія стаяць побач:

два словы, звязаныя адзіночнымі злучнікамі *і*, *ды* (у значэнні *і*): *Хваля паветра дрыжыць і дрыжыць* (Я. Колас). *Кругом была вада і вада* (Я. Маўр). *Дні бягуць ды бягуць* (Я. Колас);

два аднолькавыя або аднаканёвыя словы, калі наступнае слова ўжываецца з адмоўем *не*: *было не было*, *прасі не прасі*, *хочаш не хочаш*, *дагоніш не дагоніш*, *купіў не купіў*, *злавіў не злавіў*, *дрэва не дрэва*, *брат не брат*, *і ён не ён*, *насіць не пераносіць*, *вазіць не перавазіць*, *прасіць не дапрасіцца*, *чакаць не дачакацца*, *капаць не дакапацца*, *сказаць не скажаш*, *зрабіць не зробіш* і інш.;

два аднолькавыя словы, калі наступнае слова ўжываецца з часціцай *дык* і паўтараецца для ўзмацнення меры дзеяння, ступені якасці: *закінуў дык закінуў*, *падскочыў дык падскочыў*, *скакаць дык скакаць*, *страсянуў дык страсянуў*, *вецер дык вецер*, *паводка дык паводка*, *чалавек дык чалавек*. *Калі самалёт крута пайшоў уніз*, *Сашка не спалохаўся: скакаць дык скакаць* (М. Лынькоў).

§ 48. Коска пры параўнальных зваротах

1. Параўнальныя звароты, якія пачынаюцца злучнікамі *як*, *бы*, *як бы*, *нібы*, *нібыта*, *быццам*, *як быццам*, *што*, *як і*, *чым*, выдзяляюцца коскамі.

Напрыклад:

Па небе хмары, як палотны, паўночны вецер рассцілае (Я. Колас).

Дзяўчаты, нібы русалкі, карагоды водзяць (П. Панчанка).

Поле, нібыта падковай, акружана лесам (І. Навуменка).

Над возерам устае, быццам белая воўна, пахучы туман (З. Бядуля).

Зоры высыпаюць, бы іней... (Я. Колас).

2. Выдзяляюцца коскамі спалучэнні слоў *як адзін*, *як правіла*, *як звычайна*, *як знарок*, *як цяпер*, *як заўсёды* і інш.

Напрыклад:

Мы па сігналу ваеннай трывогі ўсе, як адзін, уставалі на бой (П. Глебка).

Пажылыя людзі памятаюць, як цяпер, дзень заканчэння Вялікай Айчыннай вайны.

Каля магазіна, як заўсёды, збіраюцца вяскоўцы.

3. Пры параўнальных зваротах са злучнікамі *як*, *як быццам*, *чым* і іншых у шэрагу выпадкаў коска не ставіцца.

Коска не ставіцца перад злучнікамі *як* і *чым* у спалучэннях *больш як* (*не больш як*), *больш чым* (*не больш чым*), *менш як* (*не менш як*), *менш чым* (*не менш чым*), *не бліжэй як*, *не далей як*, *не часцей як*, *не радзей як*, *не інакчай як*, *усё роўна як* і інш., якія выражаюць абмежаванне ў прасторы, часе, колькасці.

Напрыклад:

Абоз расцягнуўся больш як на вярсту (Я. Колас).

Менш чым праз хвіліну Несцяровіч вярнуўся ў хату (К. Чорны).

У такіх спалучэннях коска перад *як* і *чым* ставіцца тады, калі яны сэнсава і інтанацыйна выдзяляюцца.

Напрыклад:

Лес патрэбен людзям не меней, чым хлеб (І. Навуменка).

Людзей у лесе было больш, як грыбоў (Я. Колас).

4. Не выдзяляюцца коскамі:

устойлівыя выразы са злучнікам *як*: *як мага*, *як след*, *як мае быць*, *як належыць*, *як не ў сябе* і інш.

Напрыклад:

Трэба як належыць рыхтавацца ў дарогу.

Не паспеў Лабановіч як мае быць разгледзець гэтыя ўбогія апартаменты вартаўніка, як зараз жа выплыла з-за дрэў яго постаць (Я. Колас);

устойлівыя параўнанні з *як: відна як днём*, *гол як сакол*, *галодны як воўк*, *злы як сабака*, *белы як палатно*, *белы як снег*, *пабялеў як палатно*, *моцны як дуб*, *здаровы як бык*, *лёгкі як пярынка*, *няўклюдны як мядзведзь*, *патрэбны як паветра*, *чорны як сажа*, *цвёрды як камень*, *чырвоны як рак*, *цёмна як ноччу*, *хітры як ліса*, *палахлівы як заяц*, *халодны як лёд*, *баяцца як агню*, *берагчы (глядзець) як вока*, *ведаць як свае пяць пальцаў*, *маўчаць як рыба*, *біцца як рыба аб лёд*, *не бачыць як сваіх вушэй*, *як рукой зняло*, *як рукой падаць*, *як кот наплакаў*, *растаў як снег*, *лопнуў як мыльны пузыр*, *прыстаў як смала*, *стаіць як укопаны*, *спаў як забіты*, *расце як на дражджах*, *адчуваць сябе як дома*, *усе як на падбор*, *як на далоні*, *як на іголках* і інш.

5. Не выдзяляюцца коскамі параўнальныя звароты, якія з'яўляюцца іменнай часткай выказніка.

Напрыклад:

Яны для мяне як бацькі (В. Быкаў).

Ты як песня тая (Я. Пушча).

Ліпа нібы цёмная хмара за акном (Я. Брыль).

6. Коска не ставіцца перад параўнальным зваротам, калі перад ім ёсць часціца *не* або прыслоўі *зусім*, *амаль*.

Напрыклад:

Міхась трымаўся не як сталы чалавек (Я. Колас).

Яны адчувалі сябе амаль як дарослыя людзі (Я. Колас).

7. Не выдзяляюцца коскамі звароты з *як*, калі яны ўжываюцца са значэннем «у якасці» або са значэннем тоеснасці.

Напрыклад:

Чмаруцьку ведаюць усе як чалавека з фантазіяй (М. Лынькоў).

Ён славіўся ў брыгадзе як выдатны падрыўнік (І. Мележ).

Я захоўваю франтавыя пісьмы братоў і сяброў як памяць аб іх.

Гэта кніга выдадзена як дапаможнік для студэнтаў.

Быў дзень як дзень.

Алесь быў хлопец як хлопец.

§ 49. Коска пры адасобленых азначальных зваротах і словах

1. Коскамі выдзяляюцца:

дапасаваныя азначэнні, выражаныя дзеепрыметнікавымі і прыметнікавымі словазлучэннямі, што стаяць пасля назоўніка, які паясняюць.

Напрыклад:

Між імён, праслаўленых на свет, былі імёны нашых блізкіх і знаёмых (П. Глебка).

Вядома, няма ўжо таго пярэстага дывана, калі бела-сінім полымем палае дол, зарослы праляскамі (І. Навуменка).

Сінявокая смуга, поўная цеплыні і ласкі, песціла далёкія лясы і купчастыя бярозы (Я. Колас);

дапасаваныя азначэнні, выражаныя прыметнікамі і дзеепрыметнікамі без паясняльных слоў, калі яны стаяць пасля назоўніка, з якім звязаны, і звычайна маюць падкрэсленую сэнсавую нагрузку.

Напрыклад:

Шуміць рака, вясёлая, жывая (А. Бачыла).

А пад поўнач пасыпаў сняжок, заложны, спорны, густы і сухі (Я. Колас).

Хата, вымытая і прыбраная, чакала гасцей.

Лабановіч, зацікаўлены, глянуў яшчэ раз на пасаду (Я. Колас);

дапасаваныя азначэнні, выражаныя прыметнікамі і дзеепрыметнікамі (з паясняльнымі словамі і без іх), калі яны стаяць перад назоўнікам і маюць дадатковае акалічнаснае адценне (прычыны, уступкі).

Напрыклад:

Узрушаны і выведзены з раўнавагі, старшыня грозна ўшчувае крыкуноў (Я. Колас).

Захоплены гэтаю новаю думкаю, Пракоп доўга не можа заснуць (Я. Колас).

Падахвочаныя, дужэйшыя хлопцы адразу ўзяліся за працу (Я. Колас);

дапасаваныя азначэнні, выражаныя прыметнікамі і дзеепрыметнікамі з паясняльнымі словамі і без іх, якія адносяцца да назоўніка (пераважна да дзейніка) і стаяць перад ім, радзей — пасля яго, але аддзеленыя ад гэтага назоўніка выказнікам ці іншымі членамі сказа.

Напрыклад:

Магутныя ў сваёй велічы, сталі старыя дубы (І. Навуменка).

Мокрая і прыціснутая асеннім холадам, цяпер гэта расліннасць усё яшчэ гусцілася і ўпарта зеленела (К. Чорны).

Ігнась вярнуўся дадому праз два тыдні, схуднелы, абарваны (У. Ліпскі);

дапасаваныя азначэнні, выражаныя прыметнікамі і дзеепрыметнікамі, адзіночныя і з паясняльнымі словамі, якія адносяцца да асабовых займеннікаў.

Напрыклад:

Пранікнёцеся любоўю да маёй Беларусі, людзі. Велічная і гордая, яна таго вартая (У. Караткевіч).

Радасная здагадка азарае мяне, і, здзіўлены, я паволі ўстаю ў акопе (В. Быкаў).

Пільны, насцярожаны, ступіў ён у хату (І. Мележ).

Калі ў склад адасобленага азначальнага звароту ўключана іншая ўдакладняльная канструкцыя, то яна выдзяляецца коскамі: *Навокал быў густы травяністы луг, усыпаны, нібы пацеркамі, расою...* (Я. Сіпакоў).

Калі дапасаваныя азначэнні не маюць выражанага акалічнаснага значэння, коска можа не ставіцца: *Працяты марозам снег хрустка скрыпеў пад нагамі дзеда Талаша і грамознага Мартына Рыля* (Я. Колас).

2. Дапасаваныя азначэнні, выражаныя прыметнікамі і дзеепрыметнікамі, адзіночныя і з паясняльнымі словамі, адасабляюцца і выдзяляюцца коскамі і ў тым выпадку, калі пры іх займеннік адсутнічае, але падразумяваецца: *Заняты думкамі,* [я] *і не заўважыў, як надышоў вечар.*

3. Калі да аднаго назоўніка або займенніка ў сказе адносяцца некалькі адасобленых азначэнняў, выражаных дзеепрыметнікавымі і прыметнікавымі словазлучэннямі або адзіночнымі азначальнымі словамі, то яны раздзяляюцца коскамі як аднародныя члены сказа.

Напрыклад:

Даніла Платонавіч смяяўся шчыра і весела, гэтак жа як і яны, маладыя, бадзёрыя (І. Шамякін).

Ён [дзік]*, натапыраны, раз'юшаны, раз'ятраны, стаяў непадалёку ад толькі што вырытай ямкі і цяжка дыхаў — бакі яго хадзілі ходырам* (Б. Сачанка).

4. Не адасабляюцца і не выдзяляюцца коскамі дапасаваныя азначэнні, выражаныя адзіночнымі прыметнікамі і дзеепрыметнікамі з лохматэгі: *шчасце ў працы знайшоўшы, добра ў полі араць* (П. Броўка).

Нізкія сонечныя прамяні, яшчэ не абласкаўшы зямлю, знаходзілі беласнежную кіпень яблынь і запальвалі яе ружовым святлом (В. Карамазаў).

2. Акалічнасці, выражаныя дзеепрыслоўнымі зваротамі, якія з'яўляюцца ўстойлівымі выразамі, коскамі не аддзяляюцца.

Напрыклад:

Яны працавалі не пакладаючы рук (З. Бядуля).

І слухаюць яго вушы развесіўшы (А. Макаёнак).

Растуць яны [дзеці] *тут у нас на лес гледзячы* (Я. Брыль).

3. Выдзяляецца коскамі акалічнасць, выражаная адзіночным дзеепрыслоўем пры дзеясловевыказніку.

Напрыклад:

Раз-пораз стукалі, падаючы, спілаваныя дрэвы (П. Галавач).

Успыхвалі, трапечучы, белыя ракеты (І. Мележ).

І нечакана над самай галавою раскалоўся гром, затрашчала, ломячыся, дрэва (В. Адамчык).

4. Акалічнасці, выражаныя адзіночнымі дзеепрыслоўямі, не адасабляюцца і не выдзяляюцца коскамі, калі стаяць пасля дзеяслова-выказніка і сваім значэннем набліжаюцца да прыслоўя спосабу дзеяння ці часу.

Напрыклад:

Бацька доўга сядзіць задумаўшыся, і я не чапаю гэтых дум (Я. Скрыган).

Лена бегла не азіраючыся (М. Лынькоў).

Не хваліся сеўшы, а хваліся з'еўшы (Прыказка).

Людзі хутка ўстаюць, спяшаючыся апранаюць сваё скураное адзенне (Э. Самуйлёнак).

5. Перад злучнікам *і*, які звязвае дзве акалічнасці, выражаныя адзіночнымі дзеепрыслоўямі або дзеепрыслоўнымі зваротамі, а таксама прыслоўем з дзеепрыслоўем, коска не ставіцца, як пры аднародных членах сказа.

Напрыклад:

Смеючыся і жартуючы, дзеці ішлі да рэчкі (Я. Колас).

Крушынскі гаварыў ціха і не пазіраючы на госця (З. Бядуля).

Пры бяззлучнікавай сувязі паміж такімі акалічнасцямі коска ставіцца.

Напрыклад:

Ганна, не азіраючыся, не слухаючы нічога, пералазячы платы, напрасткі праз мокрыя, па-асенняму голыя агароды паляцела да Васілёвага селішча (І. Мележ).

Конь выцягнуў воз на цвярдзейшую дарогу і пайшоў раўней, не спяшаючыся (К. Крапіва).

Панізіўшы голас, шэптам дзед сказаў з узрушэннем: «У лес трэба перабірацца...» (Я. Колас).

6. Калі акалічнасць, выражаная адзіночным дзеепрыслоўем або дзеепрыслоўным зваротам, знаходзіцца паміж аднароднымі дзеяслоўнымі выказнікамі, звязанымі злучнікам *і*, то яны выдзяляюцца коскамі без злучніка.

Напрыклад:

Сонца апусцілася зусім нізка і, стаміўшыся, пачало хіліцца на захад (Б. Сачанка).

Стараста слухаў, прыплюшчыўшы вочы, і толькі згаджаўся (Я. Колас).

7. Не аддзяляюцца коскай акалічнасць, выражаная дзеепрыслоўем або дзеепрыслоўным зваротам, перад якой стаіць узмацняльная часціца *і*.

Напрыклад:

Штосьці трэба рабіць і не атрымаўшы звестак (А. Куляшоўскі).

Антон умее гаварыць і не падумаўшы як след (П. Галавач).

8. Калі спалучальны злучнік, што звязвае два аднародныя дзеяслоўныя выказнікі, стаіць паміж адасобленымі акалічнасцямі, выражанымі дзеепрыслоўнымі зваротамі ці адзіночнымі дзеепрыслоўямі, якія адносяцца да розных выказнікаў, то коска ставіцца перад злучнікам і пасля яго.

Напрыклад:

Іван зацяў дыханне, стараючыся як найлепей пацэліць, і, трошкі не падпусціўшы сабаку да каменя, стрэліў (В. Быкаў).

Удвух з Андрэем неслі яны сетку на бераг, трымаючы вусцем угору, і, толькі адышоўшыся далей ад вады, перавярнулі яе кулём на дол (Я. Колас).

9. Калі акалічнасць, выражаная дзеепрыслоўным зваротам або адзіночным дзеепрыслоўем, стаіць пасля злучніка і злучальнага слова, якое звязвае часткі складанага сказа, то яна аддзяляецца коскай без гэтага злучніка.

Напрыклад:

Чуеш ты, як звоняць ціха, як, палі вітаючы свае, недзе ўнучка слуцкае ткачыхі пра вясну шчаслівая пяе (М. Танк).

Жанчына сядзела перабіраючы фартух. А потым паглядзела ў акно і, не чакаючы маёй просьбы, ціха пачала сваё апавяданне (А. Васілевіч).

Сонца, зрабіўшы свой штодзённы кругабег, апусціласа зусім нізка і, стаміўшыся, пачало хіліцца на захад (Б. Сачанка).

10. Выдзяляюцца коскамі акалічнасці, выражаныя дзеепрыслоўным зваротам, і адзіночнае дзеепрыслоўе ў пазіцыі пасля злучніка *а*, які звязвае два аднародныя дзеяслоўныя выказнікі з супрацьлеглым значэннем.

Напрыклад:

Лабановіч не спыніўся, а, выбраўшы больш зручнае месца, смела рушыў наперад (Я. Колас).

Ён не гаварыў, а, махаючы кулакамі, крычаў (П. Пестрак).

11. Калі злучнік *а* па сэнсе непасрэдна звязаны з акалічнасцю, выражанай дзеепрыслоўем, тады пасля яго коска не ставіцца.

Напрыклад:

Рыгор доўга шукаў выхад, а знайшоўшы, весела ўсміхнуўся і выйшаў з кватэры (Ц. Гартны).

Садзілася [сонца] *на хвалі велізарным чырвоным кругам, а сутыкнуўшыся з вадою, увачавідкі змяніла форму* (А. Кулакоўскі).

12. Акалічнасць, выражаная адзіночным дзеепрыслоўем або дзеепрыслоўным зваротам, пры якіх стаяць часціцы *толькі*, *нават*, разам з імі аддзяляецца коскай.

Напрыклад:

Толькі прайшоўшы амаль паў-

§ 50. Коска пры адасобленых акалічнасцях і акалічнасных зваротах

1. Коскай выдзяляюцца акалічнасці, выражаныя дзеепрыслоўнымі зваротамі, незалежна ад іх месца ў сказе.

Напрыклад:

Шчасце ў працы знайшоўшы, добра ў полі араць (П. Броўка).

Нізкія сонечныя прамяні, яшчэ не абласкаўшы зямлю, знаходзілі беласнежную кіпень яблынь і запальвалі яе ружовым святлом (В. Карамазаў).

2. Акалічнасці, выражаныя дзеепрыслоўнымі зваротамі, якія з'яўляюцца ўстойлівымі выразамі, коскамі не аддзяляюцца.

Напрыклад:

Яны працавалі не пакладаючы рук (З. Бядуля).

І слухаюць яго вушы развесіўшы (А. Макаёнак).

Растуць яны [дзеці] *тут у нас на лес гледзячы* (Я. Брыль).

3. Выдзяляецца коскамі акалічнасць, выражаная адзіночным дзеепрыслоўем пры дзеясловевыказніку.

Напрыклад:

Раз-пораз стукалі, падаючы, спілаваныя дрэвы (П. Галавач).

Успыхвалі, трапечучы, белыя ракеты (І. Мележ).

І нечакана над самай галавою раскалоўся гром, затрашчала, ломячыся, дрэва (В. Адамчык).

4. Акалічнасці, выражаныя адзіночнымі дзеепрыслоўямі, не адасабляюцца і не выдзяляюцца коскамі, калі стаяць пасля дзеяслова-выказніка і сваім значэннем набліжаюцца да прыслоўя спосабу дзеяння ці часу.

Напрыклад:

Бацька доўга сядзіць задумаўшыся, і я не чапаю гэтых дум

дарогі, [дзед] *запытаў: — Ну, а як у цябе ў школе?* (П. Броўка).

Нават узяўшы кнігу першы раз у рукі, разумееш, як табе пашасціла.

З краю на лясных прагалах стаялі маладыя бярозкі, толькітолькі выпускаючы пахучыя лісточкі і надаючы лесу асаблівую чароўнасць (Я. Колас).

13. Калі адасобленая акалічнасць, выражаная адзіночным дзеепрыслоўем або дзеепрыслоўным зваротам, звязана з астатняй часткай сказа злучнікамі *нібы*, *як бы*, *быццам* і інш., то коска ставіцца перад адпаведным злучнікам.

Напрыклад:

Яна [машына] *то бегла весела, жвава, калі было роўна, то гула і стагнала, быццам злуючыся, што яе не пускаюць* (Я. Скрыган).

Бушмар правёў рукою па твары, як бы знімаючы з яго штосьці чужое і непрыемнае (К. Чорны).

Леначка прыпала тварам да маіх грудзей, нібы хаваючы яго і ад мяне і ад сябе (Я. Брыль).

14. Пры адасобленай акалічнасці, выражанай дзеепрыслоўем або дзеепрыслоўным зваротам, замест коскі можа ставіцца працяжнік, калі дзеепрыслоўе выразна выдзяляецца сэнсава.

Напрыклад:

Не шукаючы — не знойдзеш (Прыказка).

І памагаць яму трэба — умеючы (Я. Брыль).

15. Выдзяляецца коскамі акалічнасці, выражаныя назоўнікамі ва ўскосных склонах з прыназоўнікамі *насупраць*, *у адпаведнасці*, *са згоды* і іншымі са значэннем прычыны, умовы, уступкі, спосабу дзеяння.

Напрыклад:

Насуперак ліхой стыхіі, на гэтай згрудзанай жарстве, узняўшы вежы залатыя, прыгожы горад расцвіце (П. Глебка).

Максіма ў ваенна-марское вучылішча не прынялі, і ён, наперакор жаданню бацькоў, на злосць усім, паехаў у марскі тэхнікум (І. Шамякін).

Дваццаць восьмага ліпеня, у выніку абыходнага манеўру і баявой атакі, войскі Першага Беларускага фронта авалодалі Брэстам (У. Карпаў).

У выпадку якой патрэбы, звяртайцеся па дапамогу (І. Шамякін).

Нягледзячы на трывожны час, рынак жыў сваім звычайным жыццём (А. Якімовіч).

У адпаведнасці з законам, кожны мае права на працу.

Пры такіх акалічнасных канструкцыях з некаторымі прыназоўнікамі дапускаецца адсутнасць коскі, калі яны сэнсава і інтанацыйна не выдзяляюцца.

Напрыклад:

А млын — добры пункт, дзе можна ў выпадку патрэбы схавацца (З. Бядуля).

У адпаведнасці з надвор'ем гэтак жа часта змяняе свой колер і возера (В. Вольскі).

16. Коскамі выдзяляюцца інфінітыўныя звароты, калі яны далучаюцца да выказніка пры дапамозе злучнікаў *каб*, *для таго каб*, *з тым каб*, *замест таго каб* і інш.

Напрыклад:

На тое ён і лес, каб шумець (К. Крапіва).

Зрабілі б што-небудзь карыснае, замест таго каб гуляць.

17. Не выдзяляецца коскамі інфінітыўны зварот з *каб*, калі ён уваходзіць у пытальную сінтаксічную канструкцыю з пачатковым *што*: *Што каб пайсці ў адпачынак? А што каб сказаць? А што каб запрасіць іх у госці?* і інш.

18. Коскамі могуць выдзяляцца акалічнасці, выражаныя прыслоўямі або прыслоўнымі зваротамі, што адносяцца да выказніка і маюць значэнне заўвагі.

Напрыклад:

Хведар бег, аслабела і няўцямна, ужо не выбіраючы шляху (В. Быкаў).

Сабака ўсё брахаў, заложна і аднатонна (К. Крапіва).

§ 51. Коска пры словах і спалучэннях слоў, якія ўдакладняюць або абмяжоўваюць значэнне іншых слоў у сказе

1. Коскамі выдзяляюцца акалічнасці, выражаныя словамі і спалучэннямі слоў са значэннем месца, часу, спосабу дзеяння і інш., якія стаяць побач і ўдакладняюць, канкрэтызуюць ці ўзмацняюць сэнс папярэдніх слоў, што маюць больш шырокае значэнне.

Напрыклад:

Тут, на высокай і даволі прасторнай пляцоўцы, і знайшло сабе ціхі прыпынак сяло Верхань (Я. Колас).

За дваром, на бярозах, была пасека — больш за дзясятак ліпавых вулляў (М. Лупсякоў).

Адтуль, недзе з-за ўзгорка, даносіліся невыразныя, як бы прыглушаныя, гукі (К. Крапіва).

А было гэта тыдзень таму, у нядзелю, пад вечар (Я. Брыль).

2. Калі другая акалічнасць мае больш шырокае значэнне, чым папярэдняя, то яна не ўдакладняе, а толькі паясняе папярэднюю і коскамі не выдзяляецца.

Напрыклад:

Зусім інакш ішло жыццё ў сасняку за горадам, дзе быў штаб фронту (І. Мележ).

Яшчэ зранку на другі дзень па вёсцы панеслася чутка пра гэта здарэнне.

3. Калі другая акалічнасць у адносінах да папярэдняй мае больш вузкае значэнне, але па сэнсе і інтанацыйна не выдзяляецца, то паміж імі коска не ставіцца.

Напрыклад:

А там за возерам, як струнка, пралегла роўненька чыгунка (Я. Колас).

На балоце паабапал дарогі раслі кусты лазы і алешніку (Я. Колас).

Дзялілі лужок найчасцей у нядзелю пад вечар (Я. Брыль).

4. Калі ў сказе стаяць побач адна за адной тры і больш акалічнасці, з якіх наступная ўдакладняе папярэднюю, але апошняя не мае ўдакладняльнага значэння, то пасля яе коска не ставіцца.

Напрыклад:

Там, на ўзлессі, на высокім дрэве з разгалістай кронай у гняздзе шчабяталі птушаняты.

5. У творах мастацкай літаратуры і ў перыядычным друку пры выдзяленні ўдакладняльных акалічнасцей з узмацняльным значэннем часам ужываецца працяжнік.

Напрыклад:

Стрэлы чутны толькі недзе далёка — у лесе (Я. Скрыган).

6. Коскамі выдзяляюцца акалічнасці, выражаныя словамі і спалучэннямі слоў, якія ўдакладняюць, падкрэсліваюць значэнне папярэдняга прыметніка, займенніка і інш.

Напрыклад:

З яснага, без адзінай хмурынкі, глыбокага неба россыпам зорак свяціў поўны месячык (І. Шамякін).

Крыху далей стаяла невялікая, хат на дзесяць, вёсачка (Я. Сіпакоў).

Хвалістыя, доўгія, ледзь не ў пояс, валасы... былі незвычайнага, попельнага колеру (Т. Бондар).

7. Коскамі выдзяляюцца спалучэнні слоў і асобныя словы, якія ўдакладняюць або абмяжоўваюць, выдзяляюць ці ўзмацняюць сэнс папярэдніх ці наступных слоў, далучаючыся да іх непасрэдна або пры дапамозе выразаў *у тым ліку*, *у тым ліку і*, *апрача* (*апроч*), *акрамя*, *амаль*, *за выключэннем*, *галоўным чынам*, *па прозвішчы* (*па мянушцы* і інш.), *гэта значыць*, *так званы*, *або*, *ці* (у значэнні «гэта значыць»), *асабліва*, *нават*, *напрыклад*, *як*, *у прыватнасці*, *і ў прыватнасці*, *і прытым* і інш.

Напрыклад:

Усе палешукі, у тым ліку і стараста, пісаць не ўмелі (Я. Колас).

Вада ў Нёмане, нават каля берага, не ідзе, здаецца, а бяжыць (Я. Брыль).

Усе птушкі, і нават непаседлівыя крыклівыя вераб'і, схаваліся ад навальніцы (Я. Маўр).

Добра памагае падбел супроць падагры, ці, як цяпер кажуць, адкладання солі (В. Вольскі).

8. Калі спалучэнні слоў з *апрача*, *акрамя* і іншымі маюць пры сабе ўзмацняльную часціцу *і*, то яны звычайна коскамі не выдзяляюцца.

Напрыклад:

Пабываў ля крыніцы нехта і казвае зусім не так, як я думаў (А. Асіпенка).

Як на грэх, лоў быў шчаслівы (Я. Колас).

Нават сорам на хатніх зірнуць: ці не ўцямілі, хвароба на іх, ад чаго мой тварык смяецца, ад чаго маё сэрцайка б'ецца (М. Багдановіч).

4. Коскамі выдзяляюцца словы, спалучэнні слоў і сказы, якія паказваюць на прыніцу паведамлення, на прыналежнасць выказанай думкі: *па-мойму*, *па-твойму*, *па-ягонаму*, *па-вашаму*, *па-іхняму*, *маўляў*, *здаецца*, *на мой погляд*, *з пункту гледжання* (каго-небудзь), *на думку* (каго-небудзь), *як вядома*, *як кажуць*, *як людзі кажуць*, *як той казаў* і інш.

Напрыклад:

Гэта, па-мойму, і ёсць сапраўдная сувязь з жыццём (К. Чорны).

Выходзіць, па-ягонаму, што ледзь не самі мы вінаваты, а не той, што наша дабро крадзе (Я. Брыль).

Яшчэ, як той казаў, не ўсё скончана (Я. Брыль).

5. Коскамі выдзяляюцца словы, спалучэнні слоў і сказы, якія перадаюць адносіны да спосабу выражэння думкі, матывацыю спосабу выказвання ці выбару стылістычных сродкаў мовы: *адным словам*, *словам*, *што называецца*, *скажам*, *як гаворыцца*, *як гэта гаворыцца*, *інакш кажучы*, *карацей кажучы*, *уласна кажучы*, *прасцей кажучы*, *шчыра кажучы*, *не пры вас кажучы*, *праўдзівей сказаць*, *папраўдзе сказаць*, *так сказаць*, *з дазволу сказаць*, *я сказаў бы* і інш.

Напрыклад:

Скажам, аб вадзе гамонкі не было спрадвек, бо хапала нам заўсёды і азёр, і рэк (А. Астрэйка).

Шчыра кажучы, я толькі лічуся брыгадзірам (А. Асіпенка).

6. Коскамі выдзяляюцца словы, спалучэнні слоў і сказы, што выражаюць адносіны гаворачай асобы да слухача: *бачыш* (*бач*), *прызнацца*, *кажаш*, *кажаце*, *ведаеш*, *ведаеце*, *разумееш*, *разумееце*, *паверце*, *выбачайце*, *даруйце*, *даруйце мне*, *калі ласка*, *калі хочаце ведаць*, *ці дасце веры*, *зрабіце ласку* і інш.

Напрыклад:

Але ж язык у цябе, даруй мне, як тая мянташка (М. Лынькоў).

Напішы мне, калі ласка, пісямко дахаты! (Я. Колас).

Я, шчыра прызнацца, і загад на вас падрыхтаваў (А. Асіпенка).

7. Коскамі выдзяляюцца словы і спалучэнні слоў, якія служаць сродкамі сувязі асобных частак выказвання і ўказваюць на паслядоўнасць, абмежаванне, удакладненне, супастаўленне або аб'яднанне частак тэксту, на выразжэнне выніку, заключэння і пад.: *па-першае*, *па-другое*, *па-трэцяе* і інш., *першае*, *другое*, *трэцяе* і інш., *нарэшце*, *значыць*, *дарэчы*, *наогул*, *аднак*, *прынамсі*, *наадварот*, *з аднаго боку*, *з другога боку*, *у сваю чаргу*, *разам з тым*, *у прыватнасці*, *між іншым*, *між тым*, *да таго ж*, *такім чынам*, *галоўным чынам*, *па крайняй меры* і інш.

Напрыклад:

Турсевіч — гэта мой настаўнік і мой зямляк, прынамсі, аднае воласці (Я. Колас).

Валодзька выпрасіў, нарэшце, у рэдактара дазвол паехаць на раён (Я. Брыль).

Спазніліся, аднак, на вялікае спатканне, трэба было раней (В. Быкаў).

Мікола быў, між тым, дома (К. Чорны).

З другога боку, Ядвісі было цікава паслухаць, як вёў сваю работу ў школе настаўнік... (Я. Колас).

Па крайняй меры, для яго нічога ўжо не будзе (В. Быкаў).

Такім чынам, усе няясныасці, сумненні, прынесеныя Саўкам, цяпер развеяліся (Я. Колас).

8. Калі слова *нарэшце* не выконвае функцыі пабочнага слова і выражае часавае значэнне, то яно коскамі не выдзяляецца.

Напрыклад:

Зусім не тое выйшла, зусім не тое, што трэба было нашай, значыцца, вёсцы (М. Лынькоў).

Проста, ну, сімпатызуюць адзін другому маладыя, хіба ж ім і не пагаварыць, хіба ж ім і не пасмяяцца (М. Лынькоў).

Тудэма-сюдэма, куды тут садзіцца! (Я. Купала).

Чаго яны, каліна-маліна, там? (І. Мележ).

11. Коскамі выдзяляюцца пабочныя словы і спалучэнні слоў, якія ўваходзяць у склад іншых пабочных ці ўстаўных сказаў, адасобленых зваротаў, удакладняльных ці іншых выдзеленых знакамі прыпынку частак сказа.

Напрыклад:

Немцы, як ты, мабыць, ведаеш, аднавілі завод у Гудове (Б. Сачанка).

Боты — і выцер іх, здаецца! — усё ж такі наследзіліна чыстай чырвонай падлозе (Я. Брыль).

Не будку мае Жук — палацы (*хоць не свае, вядома, працы*) (К. Крапіва).

Людзі слухалі ўважліва, баючыся, відаць, прапусціць хоць адно слова (П. Пестрак).

Мы зайшлі ў крайнюю хату, пабудаваную, напэўна, пасля вайны.

Не чакаючы, як відаць, далейшай размовы, жанчына хутка выйшла з хаты (П. Галавач).

12. Калі пабочнае слова стаіць перад адасобленым зваротам, пабочным сказам або ўдакладняльнай канструкцыяй, то яно ўваходзіць у іх склад і коскай не аддзяляецца.

Напрыклад:

Старшыня імкліва абыходзіць вакол машыны, няйначай прыглядаючыся неспакойным вокам да яе паклажы (І. Шамякін).

Плылі ў вясновую сінь за акно мяккія акорды, уздыхала мора, і, можа заслухаўшыся гэтай музычнай вясной, не падавалі свайго голасу гарматы (І. Навуменка).

Аднекуль, мабыць з печы, да іх кінулася жанчына (В. Быкаў).

13. Паміж пабочнымі словамі, спалучэннямі слоў і сказамі, якія ідуць адно за адным, ставіцца коска.

Напрыклад:

Словам, на наша шчасце, хата нейкім чынам уцалела (З. Бядуля).

Само сабой, канечне, паставілі мы і хату (Б. Сачанка).

14. Пабочныя словы, спалучэнні слоў і сказы аддзяляюцца коскамі ад папярэдніх злучнікаў, якія звязваюць члены сказа або часткі складанага сказа.

Напрыклад:

Санкоўскі з ходу далучыўся да песні, і, можа, ад таго яна загучала яшчэ энергічней (П. Пестрак).

Твае [маці] *у мяне бровы, твой лоб і нос. Твой неспакой. І, пэўна, твой лёс* (А. Вярцінскі).

Маёр спыніўся каля дзвярэй, заплюшчыў вочы і, здалося мне, пахіснуўся (І. Шамякін).

Тады спрэчкі не разлучалі іх, а, наадварот, яшчэ болей умацоўвалі (Я. Колас).

15. Злучнік *а*, калі ён складае адно цэлае з наступным пабочным кампанентам сказа, не аддзяляецца ад апошняга коскай: *а можа*, *а магчыма*, *а значыцца*, *а між іншым*, *а па-другое*.

Напрыклад:

— І штаб па кіраўніцтву партызанскім рухам будзе? — пытаў Багавік.

— Будзе. А можа, ён ужо і ёсць (В. Быкаў).

16. Не аддзяляецца коскай ад пабочных кампанентаў узмацняльная часціца *і*.

Напрыклад:

І сапраўды, гэта не кепская думка! (Я. Колас).

Дождж, і праўда, так і поўз за каўнер (Я. Брыль).

17. Коска не ставіцца паміж пабочнымі словамі і часціцамі, якія да іх адносяцца і стаяць пасля іх.

Напрыклад:

Можа б ты даў мне хоць кавалачак хлеба ў дарогу? (Я. Колас).

Ну, напэўна ж ёсць прычына, калі кпіць з цябе яна? (Я. Колас).

18. Коскамі выдзяляюцца ўстаўныя словы, спалучэнні слоў і сказы, якія выконваюць удакладняльную функцыю (тлумачэнні, заўвагі, дадатковыя звесткі і інш.).

Напрыклад:

Доўгі час Закружжа, так называлі вёску прышлыя людзі, з навакольным светам звязвала звычайная лясная сцежка (А. Асіпенка).

Віхрасты хлапчук, яму было год шэсць, штосьці мармытаў праз сон і смяяўся (К. Чорны).

§ 53. Коска пры зваротку

1. Коскамі выдзяляюцца звароткі ў пачатку, у сярэдзіне і ў канцы сказа разам са словамі, якія адносяцца да іх.

Напрыклад:

Сонца, умыйся расою на світальнай зары (А. Бялевіч).

Занімай, Беларусь маладая мая, свой пачэсны пасад між народамі!.. (Я. Купала).

Народ пранясе цябе, родная мова, свяцлом незгасальным у сэрцы сваім (М. Танк).

Дык уздымі свой голас-звон з глыбінь душы, пясняр свабоды (К. Буйло).

Відаць, па сур'ёзных справах да нас, Надзя? (М. Лынькоў).

2. Калі зваротак раздзяляецца на часткі іншымі словамі, то кожная з іх выдзяляецца коскамі.

Напрыклад:

Ой ты, мая рыбка, спі, залатая!

3. Калі паміж звароткамі-паўторамі ёсць займеннік *ты* або *вы*, то ён адносіцца да першага звароткі і коска ставіцца пасля займенніка.

Напрыклад:

Лета ты, лета прыгожа-квяцістае, колькі ты ўносіш аздобы з сабой! (І. Шамякін).

§ 54. Коска пры выклічніках і гукапераймаццях

1. Коскамі аддзяляюцца выклічнікі, калі яны не маюць падкрэсленай клічнай інтанацыі і знаходзяцца ў пачатку ці ў сярэдзіне сказа.

Напрыклад:

Ах, дружа-клён! Ну як яго не ўспомніць?.. (П. Трус).

Мілая! О, колькі радасці даеш майму ты сэрцу маладому! (Я. Купала).

Ох, нашто ж ты, ночка, так прыгожа-міла? (Я. Колас).

Я яшчэ ого які дужы! (І. Шамякін).

§ 55. Коска пры сцвярджальных, адмоўных і пытальных словах

1. Коскай аддзяляюцца сцвярджальныя, адмоўныя і пытальныя словы ў пачатку сказа, калі яны звязаны са сказам, які раскрывае, канкрэтызуе іх сэнс: *так*, *але*, *ага*, *ну*, *што ж*, *як жа*, *не*, *што*, *як* і інш.

Напрыклад:

Так, трэба прыняць гэтыя заўвагі.

Не, не такою я хацеў сустрэць цябе, сястра! (Я. Скрыган).

Што, грыбоў яшчэ няма? (Я. Колас).

Як, ты гэтага яшчэ не зрабіў?

Калі пры такіх словах стаяць узмацняльныя часціцы, то коскай яны аддзяляюцца разам.

Напрыклад:

Ой не, пакідаць таварыша ў бядзе нельга (Я. Маўр).

2. Калі сцвярджальныя, адмоўныя і пытальныя словы паўтараюцца, то яны раздзяляюцца коскамі.

Напрыклад:

Так, так, пані гаспадыня. Чалавек страляе, а чорт кулю носіць (Я. Купала).

Але, але, яго маці і мне паказвала ліст, у якім ён піша, што няйначай мусіць прыехаць на свята (Ц. Гартны).

Не, не, — адагнаў ад сябе змрочныя думкі Іван (Б. Сачанка).

Што, што ты сказаў?

3. Сцвярджальныя, адмоўныя і пытальныя словы ў сярэдзіне сказа выдзяляюцца коскамі з двух бакоў.

Напрыклад:

Работа, што ж, у лес не пабяжыць (Ц. Гартны).

Ты не паверыш, не, такой навальніцы ў нас не было ніколі!

4. У канцы сказа перад сцвярджальнымі, адмоўнымі і пытальнымі словамі ставіцца коска, а пасля — знак прыпынку ў адпаведнасці з агульнымі правіламі.

Напрыклад:

Цяпер ты пойдзеш спаць, так? (І. Мележ).

Я работы не баюся, не!

ГЛАВА 14
КОСКА Ў СКЛАДАНЫМ СКАЗЕ

§ 56. Коска ў складаназлучаным сказе

1. Коскай аддзяляюцца часткі складаназлучаных сказаў, якія аб'яднаны злучнікамі *і*, *ды* (у значэнні «і»), *дый* (*ды і*), *або* (*альбо*), *ці*.

Напрыклад:

Ідуць ад кожнага перона на ўсход і захад цягнікі, і ад апошняга вагона далёка свецяць аганькі (С. Грахоўскі).

Праплыве гук баязліва па-над лугам, па-над нівай у знямелы свет, ды зноў ціха-ціха стане (Я. Колас).

Ад завеі не было відаць агнёў нават недалёкіх вёсак, ды і блізкія ішлі ў цемры ледзь прыкметнымі мутнымі знакамі (І. Мележ).

2. Перад злучнікамі *і*, *ды* (у значэнні «і»), *або*, *ці* коска не ставіцца:

калі ў складаназлучаным сказе (звычайна ў пачатку) ёсць агульны член, які адносіцца да першай і да другой частак, або агульная часціца ці пабочнае слова.

Напрыклад:

Дзе-нідзе ў гародчыках, ля ганкаў чырванелі вясновыя кветкі і зацвітаў бэз (В. Быкаў).

Праз нейкі час вецер разагнаў хмары ў вышыні і дождж сціх (І. Мележ).

Толькі верхавіны соснаў гулі ледзь чутна ды шалясцелі трапяткія асіны (М. Лынькоў);

калі часткі складаназлучанага сказа з'яўляюцца безасабовымі (аднароднымі па значэнні), няпэўна-асабовымі або намінатыўнымі сказамі, а таксама калі маюць форму пытальных, пабуджальных ці клічных сказаў.

Напрыклад:

Цішыня і прастор (Э. Агняцвет).

Колькі радасці і колькі захаплення!

3. Коскай аддзяляюцца часткі, якія аб'яднаны ў складаназлучаны сказ злучнікамі *але*, *а*, *ды* (у значэнні «але»), *ж* (*жа*), *аж*, *аднак*, *затое*, *толькі* і інш.

Напрыклад:

Наводдалек чуліся стрэлы, але тут было ўжо ціха (І. Мележ).

Мартын астаўся ў хмызняку, а дзед Талаш знік з вачэй, расплыўся ў цемрадзі (Я. Колас).

І чужому навучайся, ды свайго не цурайся (Прыказка).

Мікіта моцна пастукаў у дзверы, аднак з кабінета ніхто не азваўся (М. Зарэцкі).

На вуліцы скрыпка грае, мяне ж маці не пускае (Народнае).

Завярнуўся [Бруй] *і хацеў ужо ісці назад, аж з печы пачуўся голас: «Хто там?»* (Я. Колас).

4. Коскай аддзяляюцца часткі, якія аб'яднаны ў складаназлучаны сказ пры дапамозе паўторных злучнікаў *і... і*, *ні... ні*, *то... то*, *не то... не то*, *або* (*альбо*)... *або* (*альбо*), *ці... ці*, *ці то... ці то*.

Напрыклад:

І хвалюецца пшаніца, і дрыжыць пяшчотна гай (П. Броўка).

Ні колас на ніве не ўскалыхнецца, ні ліст на дрэве не ўзварухнецца (Я. Колас).

Або іх [птушак] *тут не было, або яны проста не адважваліся падаваць голасу* (Я. Колас).

Ці то стогне бура, ці то вікор гуляе.

§ 57. Коска ў бяззлучнікавым сказе

Коскай аддзяляюцца часткі складанага бяззлучнікавага сказа, якія па сэнсе і інтанацыйна звязаны паміж сабой.

Напрыклад:

Цвітуць лугі, жаўцее проса, уздымае жыта каласы (С. Грахоўскі).

Неба сеяла цяпло, цёплы дождж церушыў, у думках радасна было, беглі песні ад душы (Я. Купала).

Ад зямлі да самых чубоў на дрэвах не было ніводнай галінкі, сляды ад усіх коліюніх галінак даўно заплылі жывой смалою, згладзіліся, кара над імі самкнулася (В. Карамазаў).

§ 58. Коска ў складаназалежным сказе

1. Коска ставіцца:

паміж галоўнай і даданай часткамі.

Напрыклад:

Пасаджу каля вёсак сады маладыя, каб ты вечна цвіла і ў шчасці расла, дарагая мая Беларусь (П. Панчанка).

Яны выехалі з двара, калі апошняя жоўтая палоска зары дагарала на захадзе (У. Караткевіч).

Каб любіць Беларусь нашу мілую, трэба ў розных краях пабываць... (А. Ставер).

Дзяды і бацькі нашу мову стваралі, каб звонка звінела, была як агонь (П. Броўка);

паміж даданымі часткамі, якія адносяцца да адной і больш галоўных частак.

Напрыклад:

Глянь туды, дзе машыны спяваюць, дзе палае ў горане сталь, дзе рабочыя песні складаюць пад сталёвы напеў малатка (П. Трус).

А там, дзе разам мы прайшлі, вясенні гул не моўкнуў, газоны пышна расцвілі, зазіхацелі вокны (М. Танк).

Калі даданая частка стаіць у сярэдзіне галоўнай, яна выдзяляецца коскамі з двух бакоў.

Напрыклад:

Над ускрайкам лесу, дзе пачыналіся жоўтыя пяскі, зазвінела песня ляснога жаваранка (Я. Колас).

2. Калі аднародныя даданыя часткі звязваюцца пры дапамозе адзіночных злучнікаў *і*, *ды* (у значэнні «і»), *або*, *ці*, то паміж імі коска не ставіцца.

Напрыклад:

Я люблю часіну навальніцы, калі б'е пярун па ўсіх ладах і злуюцца ў хмарах бліскавіцы (П. Панчанка).

Некаторыя ішлі далей, дзе было начальства і дзе раздаліся гэтыя нечаканыя выбухі (В. Быкаў).

Як толькі разднела і ўзышло сонца, пачалі збірацца вучні (Я. Колас).

Перад супраціўнымі злучнікамі і перад злучнікам *і*, які паўтарацца паміж аднароднымі даданымі часткамі, коска ставіцца.

Напрыклад:

Нарадзіўся я ў маі, як сады вакол цвілі, а ў наднёманскім гаі распявалі салаўі (А. Русак).

3. Коска не ставіцца перад злучнікамі *і*, *ды* (у значэнні «*і*»), *або*, *ці*, што звязваюць дзве галоўныя часткі, да якіх адносіцца агульная даданая частка.

Напрыклад:

Ужо сонца праглядвала праз вершаліны хвой і пачынала адчувацца гарачыня летняга дня, калі настаўнікі падышлі да балота (Я. Колас).

Калі наступае глыбокая восень, над зямлёй нізка сцелецца туман або імжыць дробны дождж (К. Чорны).

4. Калі даданая частка звязваецца з галоўнай пры дапамозе састаўных падпарадкавальных злучнікаў (*перш чым*, *затым што*, *пасля таго як*, *для таго каб*, *па меры таго як*, *да таго часу пакуль*, *з прычыны таго што*, *нягледзячы на тое што*, *дзякуючы таму што*, *у сувязі з тым што* і інш.), то коска ставіцца паміж даданай часткай і галоўнай, калі даданая пачынаецца такім злучнікам і стаіць перад галоўнай (злучнік не разрываецца).

Напрыклад:

З той пары як пайшлі на аблаву, цягнецца іх паляванне да сённяшніх дзён (А. Куляшоў).

Для таго каб праца давала плённыя вынікі, трэба прывучыць да сталых і сур'ёзных адносін да яе з малых гадоў (Я. Колас).

Па меры таго як неба святлела, цемра змянялася рэдкім лёгкім змрокам... (І. Мележ).

Калі даданая частка сказа стаіць пасля галоўнай, коска ставіцца або перад другой часткай састаўнога падпарадкавальнага злучніка, або перад гэтым злучнікам у поўным яго складзе ў залежнасці ад сэнсу.

Напрыклад:

Я гэту мову ўзяў сабе таму, што зашмат у ёй было гаротных песень (М. Танк).

Бабка была спагадлівая да чужога гора, таму што сама перажыла шмат пакут і нягод (Ю. Пшыркоў).

Ён паабяцаў не пакідаць галерэю да таго часу, пакуль не адкрыецца новая экспазіцыя.

5. У залежнасці ад сэнсу коска можа ставіцца пасля першай часткі састаўнога падпарадкавальнага злучніка.

Напрыклад:

Перад тым, як ісці ў поле, яна прыбірала ў хаце, мыла падлогу, лавы (Б. Сачанка).

Па меры таго, як прыпыняўся дзе ў вёсцы Ельскі са сваім атрадам, прыпыняўся і Сцяпан (П. Пестрак).

Нягледзячы на тое, што давялося несці на плячах тол і боепрыпасы, адстаючых не было (І. Мележ).

Можа нават таму, што навокал было многа прастору, хлопцу раптам стала няўтульна (І. Чыгрынаў).

6. Коска не ставіцца перад *як*, *калі*, *што* і інш., якія ўваходзяць у склад устойлівых выразаў тыпу *як не трэба лепш*, *як ні ў чым не бывала*, *калі б то ні было*, *што б там ні было* і інш.

Напрыклад:

Усё было вылічана і вымеркавана як не трэба лепш (К. Чорны).

Супакойся, прашу цябе. Што б там ні было, у нашых адносінах нічога не зменіцца (К. Крапіва).

У выразах *не хто іншы, як...*, *не што іншае, як...* перад *як* ставіцца коска.

Напрыклад:

Прыйшоў не хто іншы, як наш сусед.

Гэта не што іншае, як цяга да тае самае стыхіі, у якой жылі іх ранейшыя продкі (К. Крапіва).

7. Калі побач стаяць два падпарадкавальныя злучнікі (ці злучнік і злучальнае слова), а таксама злучальны і падпарадкавальны злучнікі (у сказах з рознымі відамі сувязі), то паміж імі ставіцца коска.

Напрыклад:

Брыгадзе рабочых сказалі, што, калі своечасова будзе закончаны аб'ект, яны атрымаюць прэмію.

Пот заліваў вочы, але, каб не выдаць сваёй слабасці, хлопец не кідаў вёслаў (І. Шамякін).

8. Перад другім злучнікам коска не ставіцца, калі галоўная частка пачынаецца словамі *дык*, *то*.

Напрыклад:

А яшчэ помніць ён [Алесь], *што калі прыходзілі жаўнеры ў вёску, дык насміхаліся з усіх, абзываючы «мужыкамі»* (П. Броўка).

Ён чалавек дарма што сур'ёзны, а калі разгаворыцца, дык люба слухаць (К. Крапіва).

Трэба было адпачыць, але Іван адчуваў, што калі ўпадзе ў снег, то напэўна болей ужо не ўстане (В. Быкаў).

9. Калі перад падпарадкавальным злучнікам ці злучальным словам стаіць адмоўе *не* або злучальны злучнік (*і*, *ці*, *або* і інш.), які звязаны з даданай часткай, то яна не аддзяляецца коскай ад галоўнай часткі.

Напрыклад:

Нам трэба ведаць не дзе ты быў, а што ты за дзень зрабіў.

Ён спакойны і калі заўзята працуе, і калі адпачывае.

10. Даданая частка ў пазіцыі пасля галоўнай, выражаная толькі адным злучальным словам або спалучэннем слоў, коскай не аддзяляецца.

Напрыклад:

Яны паехалі і не сказалі куды.

Невядома хто тут гаспадар.

ГЛАВА 15
КРОПКА З КОСКАЙ

§ 59. Правілы пастаноўкі кропкі з коскай

1. Кропка з коскай ставіцца паміж адносна незалежнымі састаўнымі часткамі сказа, якія аб'ядноўваюцца ў адзін складаны сказ без злучнікаў, а самі часткі разгорнутыя і (або) маюць свае знакі прыпынку.

Напрыклад:

Чарнеецца сажаю вечар. Дождж б'ецца аб хвалі ракі; гуляе, гудзе над ёй вецер, завадзіць, што ў полі ваўкі (М. Багдановіч).

Ручай застаўся недзе ўбаку, гоман яго прыціх; мацней і выразней сталі шумець яліны; свежы вецер скрозь гойдаў верхавінамі; сонца схавалася; змяркатнелае неба ўсё далей і шырэй абкладвала хмара (В. Быкаў).

Кропка з коскай можа ставіцца на стыку частак бяззлучнікавага сказа з адносна незалежнымі часткамі, калі паміж імі знаходзіцца пабочнае слова. У гэтым выпадку кропка з коскай паказвае, да якой з частак адносіцца пабочнае слова.

Напрыклад:

Але якое гэта запрашэнне — адзін сказ у канцы, як бы між іншым, для ветлівасці; можа, спадзявалася, што ён не адважыцца прыехаць (І. Шамякін).

2. Кропка з коскай ставіцца паміж часткамі складанага сказа,

ЦУД ДЛЯ ДОБРЫХ ЛЮДЗЕЙ

У Быхаве адзначылі прастольнае свята знакамітага старажытнага Баркалабаўскага абраза Божай Маці, які лічыцца цудатворным

ДАКРАНУЦЦА ДА СВЯТЫНІ

У Быхаўскім Свята-Троіцкім храме стоўпатварэнне. Сотні вернікаў, праваслаўныя светары з усёй Беларусі, госці і паломнікі. Усе віншуюць адзін аднаго са святам.

— Божая Маці па ўсім свеце явіла свае цудатворныя вобразы і не абышла ўвагай нашу беларускую зямлю, — сказаў Епіскап Магілёўскі і Мсціслаўскі Сафроній. — Сёння мы шануем Баркалабаўскі абраз. Праз яго Божая Маці падае нам сваю ласку і любоў.

У драўлянай царкве расчынены ўсе дзверы, але прабіцца да абраза Баркалабаўскай Божай Маці практычна немагчыма. Кожны хоча дацягнуцца да святыні. Людзі імкнуцца дакрануцца да абраза, паставіць свечку і папрасіць заступніцтва.

Ледзь не першымі ад раніцы прыйшлі да царквы жыхары Баркалабава. Дзесятак кіламетраў ад вёскі да райцэнтра вяскоўцы прайшлі пешшу, з крыжом і абразамі. Рушылі а 5-й раніцы, праз тры гадзіны маліліся перад старажытным абразом.

— Мы просім, каб Божая Маці дапамагла нам у адраджэнні царквы ў Баркалабава і манастыра, які быў вядомы ў старажытнасці, — расказаў настаўнік гісторыі Баркалабаўскай школы Алесь Сакалоў. — І яшчэ каб у нашай дзяржаве было ўзаемаразуменне і не было ніякіх канфліктаў.

НАЙПЕРШ — ЗДАРОЎЕ

У царкве ярка гараць свечкі. Беларускія епіскапы вядуць службу, пасля якой — традыцыйны хрэсны ход вакол царквы. Баркалабаўскі абраз убраны ў святочны вянок: высакародныя фарбы мігцяць у залатым аздабленні.

Столькі народу, што дыхаць, здаецца, проста няма чым. Ад спякоты людзі ратуюцца пасвяцонай вадой. Каля храма столькі дзяцей і цяжарных жанчын, што адразу верыцца ў бэбі-бум, які ахапіў краіну.

Настаўнік гісторыі з Баркалабава Алесь САКАЛОЎ прыйшоў разам з аднавяскоўцамі памаліцца аб адраджэнні царквы і ўзаемаразуменні ў свеце.

Прабіцца скрозь натоўп да абраза Баркалабаўскай Божай Маці практычна немагчыма — кожны хоча дацягнуцца да святыні.

Алена Салдаценка поіць у цяньку пад дрэвамі свайго 8-месячнага сына Максіма: у дзіцячую бутэлечку наліла пасвяцонай вады.

— Мы хочам да абраза прыхінуцца, бо пра яго гавораць, што ён цудатворны, — тлумачыць маці. — І дзіця прыхінуць, каб быў здаровы. Няхай на свеце мала цудаў, але ў абраз мы верым.

6-гадовы Паша стаіць з букетам кветак. Малы шчыра прызнаецца, што гэта падарунак Баркалабаўскай Божай Маці за заступніцтва: каб добра вучыцца і атрымліваць адны «дзесяткі».

— І каб здароўе было! — падказвае маці Ільда Кляймёнава. — Я сама медсястра, так што мне выпадае прасіць здароўя для ўсіх добрых людзей.

На царкоўным двары калега Ільды аказвае дапамогу тым, каму стала млосна. А сама медык, таксама як і ўсе, трымае ў руках абраз і свечы.

ЗАСТАЎСЯ І ЗАХАВАЎСЯ

Прыхаджанка быхаўскага храма Надзея Дзергачова — равесніца прастольнага свята. Яна бачыць шчаслівае супадзенне ў тым, што нарадзілася ў той самы год, калі ў Быхаве з'явіўся Баркалабаўскі абраз Божай Маці.

— Гэта здарылася роўна 55 гадоў таму, — гаворыць жанчына. — І штогод мы шануем гэты цудатворны абраз, ад якога сапраўды зыходзіць неверагодная Божая ласка. Трэба падысці да яго, каб адчуць незвычайную прыцягальную сілу. Ад абраза ідзе цеплыня і душэўнае супакаенне.

Лічаць, што Баркалабаўскі абраз быў напісаны на мяжы XVI—XVII стагоддзяў. Ёсць цікавае паданне аб яго з'яўленні ў Баркалабаве. У 1659 годзе рускі князь Пажарскі вяртаўся з Польшчы і спыніўся ў Баркалабаўскім манастыры. У абозе княскага войска і быў гэты абраз як падтрымка ваярам. Паводле легенды, фурманкі не здолелі крануцца з месца, калі прыйшоў час ад'язджаць. Нічога не дапамагала супраць таемнай сілы. І тады князь зразумеў, што трэба пакінуць абраз у Баркалабаве.

— Абраз сам вырашыў застацца на быхаўскай зямлі! — радуецца Надзея Дзергачова. — І тое, што ён захаваўся праз стагоддзі, войны і рэвалюцыі, і ёсць самы вялікі цуд.

Калі ў 1918 годзе манастыр у Баркалабаве зачынілі, то, расказваюць, абраз захоўвалі манахіні і простыя людзі. Хавалі яго і пад тынкоўкай, і нават у стагах сена. А пасля ўсіх блуканняў перадалі ў быхаўскую царкву.

ВЫРАТАВАННЕ АД ЗАХОПНІКАЎ

Дзве бабулі, ледзь выціснуўшыся са святочнага натоўпу, прыселі адпачыць прама на траву.

— Нам жа ўжо не па 17 гадоў! — з усмешкай тлумачыць быхаўская пенсіянерка Марыя Чэркінская. — Мы тут просім здароўя. А што нам яшчэ болей трэба?

Сястра бабулі Марыі Ларыса прыехала паглядзець на Баркалабаўскую Божую Маці з вёскі.

— Уражанне ў мяне добрае, прыемнае, — расказала яна. — Прыгожы абраз, і ўсе гавораць пра яго цуды. Я таксама прашу здароўя, каб трошкі працягнулася маё жыццё. Хоць я і шмат пажыла, але, калі шчыра, хочацца яшчэ трошкі.

Марыя пераконвае ў тым, што абраз сапраўды дапамагае людзям. У доказ яна расказвае сястры гісторыю.

— Мая сваячка жыла ў Баркалабаве, — гаворыць бабуля. — Жанчына хавала абраз у сваёй хаце, але нікому ў гэтым не прызнавалася. І толькі калі прыйшлі немцы і людзям пагражала знішчэнне, яна расказала аднавяскоўцам пра цудатворны абраз. Яны вынеслі абраз, і калі паліцаі ўчынілі аблаву, баркалабаўцаў не сталі зганяць і забіваць. Вось так Баркалабаўская Божая Маці выратавала вёску.

ЦУД ДАБРЫНІ

Вернікі адзін аднаму распавядаюць гісторыі пра цудоўнае вылячэнне ад страшных хваробаў, у тым ліку і ад ракавых. Расказваюць пра спрыянне ў розных справах — сямейных і службовых.

Протаіерэй Мікалай, настаяцель Свята-Троіцкага храма, пацвярджае, што калі людзі з верай просяць дапамогі ў Баркалабаўскага абраза, то атрымліваюць дапамогу і суцяшэнне. Па яго словах, сапраўды здараюцца і выпадкі паслаблення хваробаў і нават вылячэння.

— І яшчэ Баркалабаўская Божая Маці дапамагае ў нараджэнні дзяцей, — працягвае быхаўскі бацюшка. — У аднаго светара былі адны дочкі, а калі памаліўся каля нашага абраза — нарадзіліся два сыны! Дзве бяздзетныя пары, з Магілёва і Жлобіна, на маёй памяці замаўлялі малебен. І праз некалькі гадоў прывялі за рукі дзяцей — прыехалі зноў у Быхаў дзякаваць Баркалабаўскай Божай Маці!

Айцец Мікалай нагадаў, што ў жыццёвых сітуацыях, калі патрэбна дапамога з неба, Божая Маці абавязкова падасць яе: але толькі калі людзям гэта дапамога на карысць, дабро і ўратаванне.

— Я папрасіла б у Баркалабаўскай Божай Маці, каб мы былі больш добрыя, чулыя, спагадлівыя, — сказала Надзея Дзергачова. — Хоць бы ў поглядзе! Людзі такія хмурыя і сур'ёзныя. Дык няхай у іх будзе больш дабрыні і цярплівасці. Я зычу людзям любові і міру ў гэтым свеце.

Ілона ІВАНОВА.

г. Быхаў.

Інфарм-укол

Антыаксіданты: мужчынам — у першую чаргу

Пэўныя дозы антыаксідантаў здольныя знізіць рызыку развіцця раку, асабліва ў мужчын, сцвярджаюць французскія вучоныя.

Лічыцца, што прэпараты, якія валодаюць антыаксідантнымі вартасцямі, у склад якіх уваходзяць бэта-каратін, аскарбінавая кіслата, вітамін Е, селен і цынк, здольныя папярэджваць шкоднае ўздзеянне свабодных радыкалаў — хімічна актыўных малекул, якія ўтвараюцца ў працэсе метабалізму. Нізкае ўтрыманне антыаксідантаў у ежы прыводзіць да павелічэння рызыкі развіцця анкалагічных і сардэчна-сасудзістых хваробаў.

Падчас даследавання вучоныя перакананыся, што аборончы эфект антыаксідантаў для асобаў мужчынскага полу значна больш выражаны, чым для жанчын, што можа быць звязана з больш нізкім базавым узроўнем антыаксідантаў у арганізме мужчын.

Японскія даследчыкі сцвярджаюць, што біяфенолы, якія з'яўляюцца антыаксідантамі і ўтрымліваюцца ў агародніне, садавіне і арэхах, дапамагаюць папярэдзіць рак страўніка, печані, тоўстай кішкі і ротавай поласці.

Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

на право заключения договоров аренды земельных участков для размещения объектов строительства

Наименование предмета аукциона	Право заключения договора аренды земельного участка под строительство объектов придорожного сервиса (пункт питания, охраняемая стоянка, станция технического обслуживания автомобилей, мойка)	Право заключения договора аренды земельного участка под строительство объектов придорожного сервиса (пункт питания, стоянка, станция технического обслуживания автомобилей и площадки отдыха)	Право заключения договора аренды земельного участка под строительство объектов придорожного сервиса (пункт постоя и охраняемая стоянка)	Право заключения договора аренды земельного участка для размещения объекта придорожного сервиса
№ лота	1	2	3	4
Арендодатель земельного участка	Барановичский районный исполнительный комитет, Брестская область, г. Барановичи, ул. Советская, д. 79, Тел. 8(01634) 2 13 69	Кобринский районный исполнительный комитет, Брестская область, г. Кобрин, пл. Ленина, д. 3 Тел. 8 (01642) 2 32 82	Ивановский районный исполнительный комитет, Брестская область, г. Иваново, пл. Октября, д. 2 Тел. 8 (01652) 2 13 69	Барановичский районный исполнительный комитет, Брестская область, г. Барановичи, ул. Советская, д. 79 Тел. 8 (01634) 42 37 57, 42 33 98
Адрес земельного участка/ кадастровый номер	213 км (лево) автомобильной дороги М-1/Е-30 Брест (Козловичи)—Минск—граница Российской Федерации (Редьки)/ № 120486000001000080	86 км (право) автомобильной дороги М-1/Е-30 Брест (Козловичи)—Минск—граница Российской Федерации (Редьки), восточнее дер. Илосск/ № 123400000001000709	454 км (лево) автомобильной дороги М-10 граница Российской Федерации (Селище)—Гомель—Кобрин/ № 123083700001000028	250 км автодороги М-1/Е30 Брест—Минск—граница Российской Федерации/ № 120488700001000004
Размер (площадь) земельного участка, га	1,00 га	1,3796	1,5796	5,0
Срок аренды земельного участка, лет	99 лет	50 лет	50 лет	99 лет
Целевое назначение земельного участка	под строительство объектов придорожного сервиса (пункт питания, охраняемая стоянка, станция технического обслуживания автомобилей, мойка)	под строительство объектов придорожного сервиса (пункт питания, стоянка, станция технического обслуживания автомобилей и площадки отдыха)	под строительство объектов придорожного сервиса (пункт постоя и охраняемая стоянка)	для размещения объекта придорожного сервиса
Характеристика земельного участка	Установлены ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в водоохраной зоне р. Мышанка на площади 1,00 га.* Подъезд к земельному участку предусматривается по существующей дорожной сети. Земельный участок свободен от застроек.	Подъезд к участку будет осуществляться по автодороге Брест—Минск—граница РФ. Земельный участок свободен от застроек.	Земельный участок граничит с землями СПК «Лясковичи-Агро». Подъезд к земельному участку предусматривается по примыкающей полевой дороге. Земельный участок свободен от застроек.	Подъезд к земельному участку предусматривается по существующей уличной сети. Земельный участок свободен от застроек.
Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона, иные условия	- возмещения победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, убытков и упущенной выгоды в сумме 1716,731 тыс. рублей, причиненных РСУП «Брестплемпредприятие» изъятием земельного участка; - заключения победителем аукциона с Барановичским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществления в 2-месячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; - получения победителем аукциона в установленном порядке разрешения Барановичского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта; - осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.	- внесения победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка; - возмещения победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка и убытков в сумме 487,796 тыс. рублей, причиненных РСУП «Племенной завод Дружба» изъятием земельного участка; - заключения победителем аукциона с Кобринским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществления в 2-месячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; - получения победителем аукциона в установленном порядке разрешения Кобринского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта; - осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; - предоставления права вырубки древесно-кустарниковой растительности и реализации древесины государственным опытным ЛУ «Кобринский опытный лесхоз» в установленном порядке.	- внесения победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка; - возмещения победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка и упущенной выгоды в сумме 1955,042 тыс. рублей, причиненной СПК «Лясковичи-Агро» изъятием земельного участка; - заключения победителем аукциона с Ивановским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществления в 2-месячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; - получения победителем аукциона в установленном порядке разрешения Ивановского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта; - осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией. Победителю аукциона возместить потери сельскохозяйственного производства в сумме 34322300 руб., вызванные изъятием сельскохозяйственных земель.	- изменения категории земель; - внесения победителем аукциона в установленные сроки платы за право заключения договора аренды земельного участка; - возмещения победителем аукциона убытков и упущенной выгоды, причиненных изъятием земельного участка ООО «Агрофирма «Петковичи» в сумме 18905063 руб.; - возмещения расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка; - снятия победителем аукциона плодородного слоя почвы и использования его на благоустройство территории и улучшение малопродуктивных земель Петковичского сельисполкома; - заключения победителем аукциона с Барановичским райисполкомом договора аренды земельного участка и осуществления в 2-месячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; - получения победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающих 2-х лет; - осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией. Условия РУП «Минскавтодор-центр»: размещение капитальных зданий и сооружений предусмотреть на расстоянии не ближе 50 м от края проезжей части автомобильной дороги М-1/Е30; победитель аукциона в обязательном порядке должен получить тех. условия на проектирование объекта придорожного сервиса, в т.ч. устройства подъездных путей, инженерных коммуникаций в РУП «Минскавтодор-Центр».
Начальная цена предмета аукциона, руб.	57 596 000	5 476 440	4 594 680	8 493 110
Размер задатка, руб.	5 759 600	547 640	459 460	849 310
Организатор аукциона	***Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, д.11, тел. (0162) 23 44 06, 23 12 63, 20 87 85 www.brest-region.by, e-mail: fond@brest-region.by***			

* Положение о порядке установления размеров и границ водоохранных зон и прибрежных полос водных объектов и режиме ведения в них хозяйственной деятельности, утвержденное постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 21 марта 2006 г. № 377.

Аукцион состоится **5 сентября 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе приглашаются юридические лица всех форм собственности и индивидуальные предприниматели. Участнику необходимо подать заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество». **Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают:** заверенные банком копии платежных поручений:

- о внесении суммы задатка на р/с 3642202530011 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538;

- о внесении специального сбора за подачу заявления на участие в аукционе в размере 4 базовых величин и платы за регистрацию участников аукциона в размере 0,5 базовой величины на р/с 3600201000015 филиал № 100 ОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 246, назначение платежа 03107, УНН 200300543, получатель платежа – финансовое управление Брестского облисполкома;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе индивидуальные предприниматели, представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Предоставляется возможность осмотра земельных участков. Осмотр земельных участков обеспечивает арендодатель.

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому выставленному лоту признается участник, предложивший наибольшую цену. Предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

Участник, ставший победителем аукциона, после проведения аукциона обязан: подписать протокол о результатах аукциона в день аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы в случае предоставления рассрочки), возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, формированием земельного участка для размещения объекта строительства, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка, после чего, но не позднее 2 рабочих дней, заключить с местным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договора аренды земельных участков», утвержденного Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462 с учетом требований Указа Президента Республики Беларусь от 27 декабря 2007 г. № 667 «Об изъятии и предоставлении земельных участков».

Заявления на участие в аукционе с необходимым пакетом документов принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, фонд «Брестоблимущество», с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30 по рабочим дням с 28 июля 2008 г. по 1 сентября 2008 года включительно.

УНП 200020538

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

по продаже объекта, находящегося в республиканской собственности, и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества

Фонд «Могилевоблимущество» 2 сентября 2008 г. в 15.00 проводит аукцион по продаже объекта, находящегося в республиканской собственности, и на право заключения договоров аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества.

Место проведения аукциона: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.

Организатор аукциона: фонд «Могилевоблимущество», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 62.

Продавец недвижимого имущества: республиканское унитарное предприятие «Учебно-опытное хозяйство Белорусской государственной сельскохозяйственной академии», 213426, Могилевская обл., Горецкий р-н, д. Паршино, ул. Горецкая, 9, тел. (8 0222) 35 116, 35 122.

Заявки принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 104. Последний день подачи заявок 29 августа 2008 г. до 17.00. Заключительная регистрация участников аукциона 2 сентября 2008 г. с 14.00 до 14.50.

Контактные телефоны организатора аукциона: 31 11 85, 31 12 16.

№ лота	Сведения о предмете аукциона					
	Информация о недвижимом имуществе			Информация о земельном участке		
	Наименование и краткая характеристика	Место нахождения	Начальная цена продажи недвижимого имущества, тыс. руб.	Площадь, га	Срок аренды, лет	Начальная цена продажи права заключения договора аренды земельного участка, тыс. руб.
1	**Капитальное строение (склад запчастей)** одноэтажное здание площадью 627,4 м², фундамент шлаковый, бетонные столбы; стены шлаковые, блочные; полы бетонированные; перекрытия – ж/б плиты, кровля совмещенная.	г. Горки, ул. Иванова, 3а	52 193,102	0,2331	50	10 593,670

Начальная цена продажи предмета (лота) аукциона 62 786,772 тыс. руб.

Сумма задатка 6000,0 тыс. руб.

Условия для победителей аукциона: в двухмесячный срок со дня государственной регистрации договора аренды земельного участка получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия на инженерно-техническое обеспечение объекта строительства (в случае изменения назначения приобретенных на аукционе зданий и сооружений).

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3642900001315 в филиале № 700 – Могилевское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 536, УНП 700052050 фонда «Могилевоблимущество».

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в фонд «Могилевоблимущество» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;

индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенная копия свидетельства о государственной регистрации;

иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский (русский) язык;

представителем иностранного юридического лица или иностранного гражданина, лица без гражданства – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский (русский) язык;

представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, перечисленные выше, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Аукцион проводит аукционист, определяемый организатором аукциона.

Аукцион по конкретному предмету аукциона признается несостоявшимся, если:

заявление на участие в нем по конкретному предмету аукциона подано менее чем двумя участниками;

ни один из его участников после трехкратного объявления первой цены не поднял аукционный номер;

ни один из его участников в соответствии с решением комиссии по проведению аукциона не был признан победителем.

Перед началом аукциона организатор аукциона проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в аукционе. Заключительная регистрация представляет собой замену организатором аукциона билетов участников аукциона на аукционные номера, под которыми участники аукциона будут участвовать в аукционе. После аукциона его участники обязаны вернуть аукционные номера организатору аукциона.

Аукцион начинается с объявления аукционистом порядка проведения аукциона, начальной цены предмета аукциона, его наименования, места нахождения и краткой характеристики недвижимого имущества, условий, с которыми продается данный предмет аукциона (в случае продажи на аукционе с условиями), шага аукциона.

Не допускается продажа предмета аукциона по начальной цене. Торги начинаются по цене, сформированной с учетом шага аукциона, определяемого аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от начальной цены предмета аукциона. Очередная цена также определяется и объявляется аукционистом с учетом шага аукциона от предыдущей названной цены предмета аукциона. После объявления очередной цены аукционист называет номер участника аукциона, который первым поднял аукционный номер, и указывает на этого участника аукциона. Затем аукционист в соответствии с вышеназванным порядком и шагом аукциона объявляет новую цену. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет предмет аукциона проданным словом «продано», а участника аукциона – победителем аукциона по соответствующему предмету аукциона.

При отсутствии участников аукциона, готовых приобрести предмет аукциона по названной аукционистом новой цене, аукционист называет эту цену три раза. Аукцион по данному предмету аукциона завершается, если после трехкратного объявления новой цены предмета аукциона ни один из участников аукциона не поднял своего номера. Комиссия (организатор аукциона) снимает предмет аукциона с торгов.

Споры, возникшие в ходе проведения аукциона, разрешаются комиссией по проведению аукциона.

Результаты аукциона по конкретному предмету аукциона могут быть аннулированы организатором аукциона в случаях, установленных нормативными правовыми актами.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

Срок заключения (государственной регистрации) договора купли-продажи и договора аренды земельного участка не позднее 20 рабочих дней с момента утверждения организатором аукциона протокола о результатах аукциона.

Оплата за предмет аукциона осуществляется денежными средствами по безналичному расчету.

Победитель аукциона возмещает фактические затраты на подготовку и проведение аукциона.

УНП 700052050

БЕЛАРУСКІЯ ПРЫВАТНЫЯ ГЕРБЫ

Герб князёў Друцкіх

У чырвоным полі срэбны меч з залатым тронкам лязом уніз, справа ад мяча два залатыя паўмесяцы рогамі адзін да аднаго, тое ж злева ад мяча.

Герб Забэлаў

Чатырохчастковы сямейны герб. Поле чырвонае, у першай частцы — «Тапор», у другой — «Ліс», у трэцяй — «Ліс», у чацвёртай — «Тапор».

Герб Заслаўскіх

Пяцічастковы сямейны герб. У шыльдзе — «Самсон», у першай частцы — «Рагаля», у другой — «Газдава», у трэцяй — «Суліма», у чацвёртай — «Бонча».

Рубрыку вядзе Уладзімір КРУКОЎСКІ.

Выпрабавана на сабе

ВЯРТАННЕ Ў... АРМІЮ

У жыцці мужчыны бывае так — ці адзін раз дэмбель, ці ўвогуле ніводнага. Аднак у карэспандэнта «Звязды», напрыклад, гэтая прыемная падзея адбылася ўжо два разы. Першы быў летась, і не так даўно вярнуўся ён ужо з другога дэмбелю. І на чарзе застаўся яшчэ адзін — у наступным годзе. Як так? Зараз зразумееце...

Тэрміновую армейскую службу прынята падзяляць на тры перыяды. Так лягчэй у любым сэнсе, асабліва калі падлічваць, колькі засталося да запаветнага звальнення. Спачатку шэсць месяцаў, потым яшчэ столькі ж, і, глядзіш, да доўгачаканага дэмбелю «ўсяго-нічога», паўгода застаецца. Ну, бясспрэчна, згадзіцеся, што і на грамадзянцы гэта не зусім малы кавалак. Можна за гэты час паспець усё жыццё памяняць. Але ўсё роўна пачатак службы з яе заканчэннем параўноўваць складана. Карэспандэнт «Звязды» ведае гэта на ўласным вопыце. Бо адтаптаў ён днямі другі перыяд сваёй армейскай службы.

...Праўда, не тэрміновай, а службы ў рэзерве. Той самай, што ў народзе нехта пачаў ужо называць ці «завочнай арміяй», ці «вайсковымі канікуламі». Ну, напэўна, гэта таму, што не зусім ведаюць усе асаблівасці. Сапраўды ж служба ў рэзерве набывае папулярнасць, ахвотнікаў трапіць на яе ўсё больш. Таму і з кожным годам набор будучых рэзервістаў расце. Задумана гэтая служба такім чынам: замест таго, каб засвойваць ваенную навуку год ці паўтара, юнакі прыязджаюць у вайсковыя часці на зборы на працягу некалькіх гадоў. Напрыклад, у карэспандэнта газеты летась першы збор цягнуўся 41 дзень, сёлетні — 55 дзён, і застаўся яшчэ адзін, у наступным годзе. У выніку ўсяго ў арміі, за тры зборы, я правяду ў суме каля чатырох месяцаў.

Але пакуль гэта справы будучага, таму задумвацца аб іх ранавата. Бо яшчэ знаходжуся я пад уражаннем свайго «другога» па ліку службы ў рэзерве. Аб чым і падзялюся з вамі, паважаныя чытачы.

Працоўны водпуск у... арміі

Не буду хлусіць, калі скажу, што ехаць на другі збор не хацелася. Ну зусім. Не было жадання адрывацца ад родных, сяброў, работы, і амаль на два месяцы мяняць звыклы лад жыцця. Тым больш (гэтую недарэчнасць заўважаюць усе) час, за які праходзяць чарговыя зборы, не аплачваецца. Я, напрыклад, узяў на гэты перыяд звычайны працоўны водпуск. Для таго, каб за два месяцы сваёй адсутнасці хоць якія грошы ў сям'ю прынесці.

Але з іншага боку, паважаныя, такі вось «адпачынак», гэта дакладна, запомню назаўжды. Калі яшчэ давядзецца правесці яго ў арміі? За мяжой, я чуў, для асабліва спешных кліентаў у турфірмаў існуюць спецыяльныя прапановы. Каб правесці два-тры тыдні ў войску, людзям не шкада вялікай сумы. Чым мы горшыя? З гэтай думкай я, разам яшчэ з 19 удалымі рэзервістамі, пад'язджаў да славутага горада Віцебска, каб накіравацца да варотаў вайсковай часці 14848, у якой знаходзіцца 77-ы асобны Чырванасцяжны маставы чыгуначны батальён. Дзе і прызначана нам — і ў першы раз, і цяпер — служыць.

Такім чынам, апошні глыток «свабоднага» паветра, і мы, амаль ужо як бывалыя салдаты, накіроўваемся да КПП. Тым больш, што і месца знаёмае, і нават сяржант, які сустрэў нас, быў «сваім». Калі на першым зборы ён хадзіў у «малодшых», то зараз таварыш Фралоў ужо меў адну шырокую паласу на пагонах: ні больш, ні менш — старшы сяржант. Мы паспелі з ім пасябраваць. Таму вітаўся ён з намі амаль як з роднымі.

«Ну што, гатовыя да службы?» — спытаў ён. Вароты расчыніліся, і... Здаецца, не прайшло і года, але некаторыя рэзервісты паспелі заручыцца шлюбам, памяняць працу, нават змяніць месца жыхарства. У кожнага свае заняткі і характар, жывуць яны ў розных гарадах. Але раз у год абавязкова сустракаюцца тут, у часці. Вось гэта сапраўды лёс. І нічога не змянілася, здаецца. Можа толькі, крыху пасталелі.

І калі ў першы раз усё было нязвыкла — ваенная форма, кірзавыя боты, анучы, казарма, бліскучая бляха рэменя... то зараз мы ўжо ведалі некаторыя рэчы. Хутка пераапрануліся ў выдадзенае, наша, якое засталося з мінулага разу, адзенне, і — прывітанне, армія! Як доўга мы не бачыліся!

Ужо ў першы дзень стала зразумела, што служыць будзе лягчэй. У тым сэнсе, што ты ўжо ведаеш, а дакладней, хутка ўзгадаў, што такое армейскі распарадак дня, рэжым, якім чынам трэба выконваць распараджэнні камандзіра. Гэта было пазітыўным момантам. Мы ўжо былі не «зялёнымі», як мінулым разам, хатнімі хлопцамі, якіх навучалі кожнай дробязі і якія на ўласным вопыце спасцігалі армейскія мудрасці. Таму і адчувалі мы сябе зараз больш упэўнена.

Згадзіцеся, чалавек найбольш палохаецца невядомага. І калі на першым зборы ўсё было ўпершыню, то цяпер мы ўжо прыблізна ўяўлялі, што такое армія, і чаго яна чакае ад нас, і што нам чакаць ад яе. Таму першы дзень прайшоў пад знакам упэўненасці. І, так здалося, служыць нам будзе больш цікава. Бо другі перыяд — гэта ўжо не азнаямленне з арміяй, санатоўванне яе мудрагелістых правілаў, а сапраўдная сярэдзіна службы, калі і з ваеннай спецыяльнасцю будуць знаёміць вельмі шчыльна. Але аб усім падрабязней.

Першы збор цягнуўся 41 дзень, сёлетні — 55 дзён, і застаўся яшчэ адзін, у наступным годзе. У выніку ўсяго ў арміі, за тры зборы, давядзецца правесці ў суме каля чатырох месяцаў.

Рэзерв ганаровай варты

Але армія, паважаныя, гэта не толькі вучоба, але і выкананне абавязковых для ўсіх салдатаў спраў. Прынамсі, так я і пісаў у штотыднёвым «Баявым лістку», які мне (усё ж такі журналісту) даверылі рэдагаваць. «Служба ў сутачным нарадзе прайшла без заўваг і здарэнняў», — было між іншым зазначана. І сапраўды, без здарэнняў, нават больш за тое. Мы, рэдкія з рэзервістаў краіны, хто за адзіны збор узяў удзел адразу ў двух парадах. Адзін адбыўся ў гонар вызвалення Віцебска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, наступны — на ным» жыцці часу не хапіла б завітаць. Напрыклад, хацеў я даўно паслухаць нашага вядомага скрыпача Арцёма Шышкова. Ды як заўсёды, то пятае перакладжала гэтаму, то дзесятае. А не паспеў прыйсці ў армію — і амаль адразу ж павезлі нас у віцебскую філармонію. Дзе якраз і выступаў беларускі талент. Таму па выхадных нам сумаваць не давалі — і ў музеі паспелі пабываць, і ў кіно, і яшчэ адзін канцэрт паслухалі, і проста прайшліся па цудоўным горадзе. Ён якраз рыхтаваўся да «Славянскага базару», таму паглядзець было на што.

Скажаце, што ў тым такога асаблівага... Ну, павялі на экскурсію, ну, музыку паслухалі. А вось і не, паважаныя. Калі салдат з раніцы да вечара заняты службай, калі ён пастаянна знаходзіцца ў адным і тым жа калектыве, жыве ў адной і той жа прасторы, то нават такая ў жыцці звычайная рэч, як прагулка па горадзе, успрымаецца як цудоўная магчымасць адпачыць. Вось такая псіхалогія. І вельмі гэта дапамагае хлопцам, як кажуць, мужна пераносіць усе выпрабаванні вайсковай службы.

Прыблізна пад сярэдзіну нашага збору мы ўжо зусім прызвычаіліся. І нават ранішні пад'ём з абавязковай зарадкай успрымаўся нормай. І ўвогуле, разумна распланаваныя фізічныя нагрузкі, якія былі ў нас, пайшлі толькі на карысць. Хлопцы нашы, хоць і старэйшыя мы за вайскоўцаў тэрміновай службы гадоў так на пяць-сем, відавочна, падужэлі і сталі больш моцнымі.

...І ўвогуле, за пяцьдзесят пяць дзён у жыцці нашага ўзвода адбылося шмат падзей. Па-першае, амаль пятая частка рэзервістаў упершыню ў жыцці адзначыла ў арміі свае дні нараджэння. Таксама заўсёды будуць яны памятаць гэтыя адчуванні. Па-другое, у аднаго з нашых, пакуль ён быў у арміі, нарадзілася дачка. Па-трэцяе, пакуль мы служылі, нашым сяржантам прысвоілі чарговыя вайсковыя званні. Малодшаму сяржанту Бастуну — сяржанта, старшаму сяржанту Ўнуковічу — старшыны. А пад канец яшчэ і старшаму сяржанту Фралову далі таксама званне старшыны. Якраз за два тыдні да яго дэмбелю. І яны справядліва заслужылі, бо вучыць нас ваеннай навуцы ім было нялёгка. А яшчэ па выніках месяца мы былі прызнаныя лепшым узводам у батальёне. За дысцыпліну і службу. Дзякуючы нашаму камандзіру, таварышу старшаму лейтэнанту, Максіму Казакевічу, які быў нам дарадцам, памочнікам і сапраўды вельмі добрым кіраўніком. Бо служыць мы стараліся, і не падвесці яго намагаўся кожны з рэзервістаў.

Таму з'язджалі мы з лёгкім сэрцам — служба ў арміі амаль пройдзена. У наступным годзе застаўся яшчэ адзін збор, трэці, але ён будзе кароткім. І, спадзяёмся, свой другі дэмбель мы заслужылі прававерна, і шлях да трэцяга будзе не горшым.

Дзмітрый АЛЬФЕР,
Віцебск—Мінск.

Цясляр асобнага ўзвода...

Мы — цесляры. Не звычайныя, а самыя што ні ёсць вайсковыя. Цесляры асобнага ўзвода рэзерву, радавыя першага (другога) аддзялення. Можа, назва гэтай ваеннай спецыяльнасці, якую мы атрымлівалі, гучыць не зусім важка. Не спецназ, не дэсант, не артылерыя. Але ж... Але яшчэ можна паспрачацца, што больш важнае на вайне. Паспрабуйце без цясляра зрабіць якія-небудзь будаўнічыя работы. Хоць бы невялікі мост для пераправы тэхнікі і войска.

Зараз, дзякуй Богу — у мірны час, батальён, у якім мы праходзілі службу, забяспечвае дзейнасць транспартнай сеткі па ўсёй краіне. Будуе масты, рамантуе дарогі, пракладвае рэйкі. За час праходжання службы мы паспелі з'ездзіць у камандзіроўку — як гэта называецца, «на мост», у Дуброўна. Рака падзяляе раённы цэнтр амаль пасярэдзіне. Без моста тут ніяк не абысціся. Дык вось, менавіта салдаты тэрміновай службы нашай вайсковай часці спачатку ўзвялі, а зараз займаюцца пастаянным абслугоўваннем свайго «аб'екта». Дзень і ноч праязджаюць машыны па ім, і дзень і ноч, мяняючы адзін аднаго, стаяць вайскоўцы на варце. Сочаць за рухам. Іх лагер разбіты тут жа, на беразе. І ў лік тых, хто займаецца абслугоўваннем моста, увахо-дзяць і цесляры. Праходзяць людзі па мосце, і часам пачуеш — «Дзякуй, хлопцы, за службу».

Таму і вучылі нас прафільным навыкам. Спачатку тэорыі — пісалі канспекты. Усё як ва ўніверсітэце, па шэсць—восем вучэбных гадзін, а потым практыку здавалі. І палі мы рабілі, і бярвенні, як трэба, пілавалі, і свідравалі іх, і з рознымі электрычнымі інструментамі знаёміліся. Рэзервісты нават экзамен здавалі па спецыяльнасці, білеты цягнулі, у кожным — па шэсць пытанняў. Таму магу з упэўненасцю і гонарам казаць, што цясляр — гэта гучыць горда.

Філармонія і псіхалогія

Да распарадку дня ў арміі трэба прызвычаіцца. Час там для кожнай справы распісаны па гадзінах і хвілінах, і загадзя ты ведаеш, што чакаць наступным днём. Напрыклад, заняткі фізкультурай. Ці, як правільна гэта называецца, спартыўна-масавая работа, таксама як і страявая падрыхтоўка, і гаспадарчы дзень (калі па суботах карпатліва прахо-дзіць уборка казармы) — гэта тыя неабходныя дзеянні, без якіх армія жыць не можа. Аднак сустракаюц а і выключэнні, гэта калі вайскоў-цаў па выхадных адпускаюць ці ў звальненне, ці арганізоўваюць ім нейкія цікавыя мерапрыемствы.

Ну, у звальненні ў кожнага гіс-торыя свая. Да мяне, напрыклад, прыязджала жонка. Пачуцці, скажу я вам, незабыўныя, калі пасля некалькіх тыдняў, у час якіх вельмі сумуеш па дому, да цябе прыязджае родны чалавек. І калі гуляеш з ім па летнім горадзе, ты — у вайсковай форме, яна — у лёгкай сукенцы, а людзі глядзяць на шчаслівую пару і самі мімаволі ўсміхаюцца. Думаюць, што вось салдацік з дзяўчынай радаснай ідзе, ёсць, напэўна, яшчэ каханне на свеце.

Ну гэта так, лірычнае адступленне. Да чаго я гэта ўсё кажу — акрамя таго, што аддавалі мы свой абавязак Радзіме, я, напрыклад, яшчэ і трапіў туды, куды ў «воль-

Дзень Незалежнасці. Усё ж такі нездарма кожны аўторак праходзілі заняткі па страявой падрыхтоўцы. Бо ў белых пальчатках, з баявой зброяй — аўтаматам, прайсціся ў ваенным страі перад святочна апранутымі жыхарамі было прыем-на. У гэты час, калі сотні вачэй хлапцоў, дзяўчат, дарослых і ма-лых глядзяць з захапленнем на прыгожы строй, адчуваеш, што са-прауды ты маеш дачыненне да вя-лікай, мужчынскай, вельмі нялёг-кай, але гераічнай і рамантычнай справы. І гэтае адчуванне ў душы падхопліваюць усе, хто глядзіць на цябе. Напэўна, таму ваенныя па-рады заўсёды будуць адным з са-мых відовішчных мерапрыемстваў.

Фізкультхвілінка

Дзяўчына ў магазіне выбірае маску для навагодняга балю-маскараду:

— А вунь тая маска шэрага кракадзіла колькі каштуе?

— 10 долараў!

— А вунь тая, зялёнага?

— Дзяўчына, ідзіце так! 10 долараў эканоміце!

☺

Насамрэч Малевіч разгадваў японскую крыжаванку, проста ў яго нічога не атрымалася.

☺

Сустракаюцца дзве акулы:

— Слухай, учора з'ела дайвера, дык дагэтуль у роце смак гумы.

Усміхнёмся!

— Дурніца! Іх жа чысціць трэба!

☺

Калі мужчына адчыняе дзверы машыны жонцы, значыць, гэта або новая машына, або новая жонка.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.14	21.18	16.04
Віцебск —	4.57	21.13	16.16
Магілёў —	5.04	21.08	16.04
Гомель —	5.08	20.57	15.49
Гродна —	5.27	21.35	16.08
Брэст —	5.30	21.32	16.02

Месяц

Апошняя квадра.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. *Антона, Гаўрылы, Івана, Сцяпана, Юльяна.*
К. *Ганны, Гражыны, Міраславы, Аўхіма, Лаўрэнція.*

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА	+24..+26°C	КІЕЎ	+23..+25°C
ВІЛЬНЮС	+24..+26°C	МАСКВА	+20..+22°C
РЫГА	+23..+25°C	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+19..+21°C

Дзве даты

26 ліпеня

1852 год — у маёнтку Кухцічы на тэрыторыі сучаснага Уздзенскага раёна нарадзіўся Ян Казімір Завіша, вядомы беларускі археолаг. Член Маскоўскага археалагічнага таварыства. У 1868—77 гг. падарожнічаў з мэтай фіксацыі помнікаў археалогіі, наносіў іх на ўласную карту рэгіёна, праводзіў раскопкі. Даследаваў стаянкі каменнага веку ў Навагрудскім раёне, гарадзішча і каменныя магілы каля возера Свіцязь і інш. На тэрыторыі нашай рэспублікі яго цікавілі першым чынам засяленні старажытным чалавекам берагоў Віліі, Дняпра, Нёмана, міграцыйныя шляхі, якія звязвалі насельніцтва з Балтыйскім морам, і сувязі славянскіх плямёнаў з культурай Рыма і Грэцыі. Навуковец выступаў на Міжнародных канграсах археолагаў у Венецыі і Будапешце па праблемах вывучэння каменнага веку на тэрыторыі Беларусі. Заснаваў і выдаваў навуковы часопіс «Археалагічныя ведамасці».

1953 год — ліпеньская рэвалюцыя на Кубе. Сотня байцоў Фідэля Кастра зрабіла спробу штурму казармаў Манкада.

Цытата дня:

«Як толькі дурань пахваліць нас, ён ужо не здаецца нам такім дурным».
Франсуа дэ Ларошфуко (1613—1680), французскі пісьменнік-мараліст.

АЛЕСЯ

У песнях застанёмся мы

Верш Аркадзя Куляшова «Бывай» вельмі прыдатны для перадачы асабістых перажыванняў. Колькі разоў даводзілася Ігару Лучанку захапляцца мілавіднымі равесніцамі, паклонніцамі, адчуваць прыцягненне да іх, а пры сустрэчы бянтэжыцца. Як толькі з'яўляліся рослыя хлопцы, дзявочая ўвага адразу ж скіроўвалася на мужчынскую самасць... І ў душы кампазітара палыхалі віхуры, набатам гулі ўзрушэнні — і ўзнікалі мелодыі. Светлыя. Пяшчотна-летуценныя. З тужлівым адценнем.

Гэта пазней, пасля знаёмства з Сашай Чаканавай, якая падчас навучання ў Брэсцкім музычылішчы прыехала летам адпачыць у пушчавіцкія мясціны, пачуцці ўраўнаважацца і народзяцца новыя мелодыі (на іх будуць грунтавацца песні «Зачараваная мая», «Мой лёс — каханне» і іншыя). Сямейнае жыццё — таксама таямнічая вандроўка ў будучыню. Аднак у памяці назаўсёды застануцца памкненні, парыванні, перажыванні...

І паэзія Аркадзя Куляшова, вабная мяккай лірычнасцю, філасофскімі развагамі і высновамі, надзвычай блізкая светаўспрыманню Ігара Лучанка. Паводле яго твораў кампазітар напісаў песні «Ты ўспомні ўсё», «Балада пра маці», раманс «Спакойнага шчасця не зычу нікому». Але найбольш папулярнай стала песня «Алеся». Дзякуючы «Песнярам» яна абляцела ўсю нашу планету.

Міхась ШАВЫРКІН.

МУЗЫКА Ігара ЛУЧАНКА
ВЕРШ Аркадзя КУЛЯШОВА

Бывай, абуджаная сэрцам, дарагая.
Чаму так горка, не магу я зразумець?
Шкада заранкі мне, што ў небе дагарае
На ўсходзе дня майго, якому ружавець.
Прыпеў:

Пайшла, ніколі ўжо не вернешся, Алеся.
Бывай, смуглявая, каханая, бывай.
Стаю на ростанях былых, а з паднябесся
Самотным жаўранкам звініць і плача май.

Пайшла, пакінуўшы мне золкі і туманы,
Палынны жаль тугой ахутаных дарог,
Каб я хвілінаю нанесеныя раны
Гадамі ў сэрцы заглушыць сваім не змог.
Прыпеў.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ДА ВАШАГА СТАЛА

Нарыхтоўкі з агуркоў

Няма смачнейшай закускі, чым салёныя ці марынаваныя агурочкі ў хатніх закатках! Такія кансервы, калі гатаваць іх правільна, дакладна вытрымліваючы тэхналогію, прастаяць год—два і застануцца такімі ж сакавітымі, хрусткімі, са свежым смакам і прыемнай вастрынёй.

Для нарыхтоўкі бярыце толькі свежасарваныя, не пераспелыя, ярка-зялёнага колеру плады. Выбар гатункаў вялікі, аднак самыя ранніе і цяплічныя не падыходзяць: яны хутка становяцца мяккімі і кіслымі. Падбірайце агуркі аднолькавага памеру і аднаго гатунку, калі дапусціць «разнабой», працэс пойдзе нераўнамерна, кансервы могуць сапсавацца. Прамыйце халоднай вадой кожны агурок паасобку, апаласніце праточнай вадой. Буйныя накаліце ў некалькіх месцах упоперак плода, адрэжце пладаножкі з часткай мякаці (5—10 мм). Прыпраў павінна быць у агульнай колькасці 6—10 працэнтаў ад усёй вагі агуркоў. Якія іменна ўзяць? Тут усё залежыць ад вашага смаку, аднак, як правіла, гэта кроп, лісце дубу, вішні і чорных парэчак, корань хрэну, горкі чырвоны перац, часнок, сельдэрэй, пятрушка, эстрагон, лаўровы ліст.

САЛЁНЫЯ АГУРКІ

Падрыхтуйце слоікі, агуркі і прыправы. *На дно 3-літровага слоіка пакладзіце па 4—5 лісточкаў вішні і чорных парэчак, 2—3 парасончыкі кропу, 5—6 кружочкаў кораня хрэну, 4—5 зубкоў часнаку, 2—3 шт. лаўровага лісту, 5—6 гарошын чорнага перцу, трэць стручка горкага перцу. Агуркі пастаўце вертыкальна ўздоўж сценак слоіка; у адзін 3-літровы слоік уваходзіць прыкладна 1,5—1,7 кг невялікіх агуркоў.*

Заліце расолам да самага верху слоіка (1 ст. лыжка з верхам буйной солі на 1 л вады), накрыйце марляй, вытрымайце 3—5 дзён для праслолі (пры пакаёвай тэмпературы хопіць і 3 дзён, хочаце, каб агуркі былі больш вострыя, — няхай 5 дзён стаяць). Цяпер зліце расол праз марлю, пастаўце на агонь, а ў слоік наліце халодную ваду, страсяніце, каб прамыць агуркі ад белага налёту (вынік малочна-кіслага браджэння). Аперацыю паўтарыце 2—3 разы, затым прамытыя агуркі заліце кіпячым расолам і адразу закатайце ці закрыйце шчыльнымі пластмасавымі накрыўкамі. Перавярніце, пакіньце астываць.

МАЛАСОЛЬНЫЯ

Гэта вельмі смачныя агурочкі, але нарыхтаваць іх у запас нельга: ці перасоляцца, ці скісноць. Тым не менш паласавацца імі ў сезон вельмі прыемна.

Маласольныя агуркі гатуем гэтак жа, як і салёныя, аднак ёсць і некаторыя асаблівасці:

- патоўшчаны кончык агуркоў зрэжце на 0,5—1 см;
- у расол дадайце адвар прыпраў, выбраных па сваім жаданні;
- солі бярыце больш: на 1 л вады — 1,5—2 ст. лыжкі;
- кіпячы салёны раствор заліце ў слоікі. Не закатвайце! Праз суткі непараўнана смачныя агурочкі гатовыя.

МАРЫНАВАНЫЯ АГУРКІ

На 3-літровы слоік спатрэбіцца каля 2 кг агуркоў, па 2 ст. лыжкі солі і цукру, 10 г лімоннай кіслаты, 50 г гарэлкі, 1,5 л вады.

Невялікія вымытыя агуркі абліце кіпенем і адразу апусціце ў вельмі халодную ваду. Шчыльна ўлажыце ў слоікі, мяжуючы з прыправамі. У кіпячай вадзе растварыце соль, цукар і лімонную кіслату, заліце гэтым растворам агуркі, вытрымайце пад накрыўкай 5 хвілін. Зліце раствор, давядзіце да кіпення, зноў заліце агуркі і пакіньце яшчэ на 5 хвілін (зрабіце так тройчы), дадайце ў кожны слоік па 50 г гарэлкі і закатайце.

-2519-

САКРЭТЫ ПРЫГАЖОСЦІ

Далікатны догляд

У разгары доўгачаканае лета. Настрой на вышыні: хочацца як мага больш знаходзіцца на сонцы, свежым паветры, рухацца, займацца спортам. Адзінае, што іншы раз перашкаджае нам атрымліваць асалоду ад гарачага лета, дык гэта моцнае потавыдзяленне...

Сам па сабе пот не мае паху. Непрыемны пах узнікае тады, калі пот працяглы час застаецца на скуры і пачынае раскладацца пад уздзеяннем шматлікіх бактэрый, якія прысутнічаюць на яе паверхні. Калі вы штодня прымаеце ванну ці душ, рэгулярна мыняеце адзенне і карыстаецеся дэзадарантамі, то такой праблемы ў вас быць не павінна.

РЭГУЛЯРНАЕ АЧЫШЧЭННЕ

У час мыцця пот змываецца са скуры і не паспявае раскласціся. Добрае мыла і махровая сурвэтка — гэта тое, што неабходна для штодзённага мыцця. Аднак рэгулярнае выкарыстанне антыбактэрыяльнага мыла можа разбурыць натуральную мікрафлору скуры і яе ахоўнае кісларoднае покрыва, якое дапамагае змагацца з мікробамі.

ШТО СКАРАЧАЕ ПОТАВЫДЗЯЛЕННЕ?

Антыперспіранты, што змяшчаюць алюмініевыя галуны, трапляючы на скуру, абязводжваюць потавыя залозы і тым самым памяншаюць выдзяленне поту амаль на 50 працэнтаў. У складзе большасці антыперспірантаў прысутнічаюць і рэчывы, якія дэзадаруюць, запавольваюць працэс раскладання поту.

СПРЭЙ, КРЭМ ЦІ РОЛІК?

Дэзадаранты і антыперспіранты выпускаюцца ў выглядзе крэмаў, алоўкаў, аэразоляў і бутэлечак з шарыкамі, якія круцяцца. Найбольш эфектыўнымі з'яўляюцца крэмы, найменш эфектыўныя — аэразолі. Вядома, адрозніваюцца яны і сваім складам. Выбіраць трэба тое, што найбольш прыдатнае для вас. Не бойцеся карыстацца адным і тым жа прэпаратам доўгі час. Спецыялісты сцвярджаюць, што гэта не паніжае яго эфектыўнасці.

ПУДРА ДАПАМОЖА ПРЫ АСАБЛІВАЙ ПАТЛІВАСЦІ

Калі ў вас часта пацее цела, вам дапаможа пудра для цела. Аднак яе выкарыстанне ў летні перыяд можа быць апраўдана толькі ў тым выпадку, калі яна змяшчае сонцаахоўныя рэчывы, якія абараняюць скуру ад ультрафіялету. Такая пудра добра ўсмоктвае пот і аднасова бяражліва даглядае скуру.

ШТО РАБІЦЬ, КАЛІ МОЦНА ПАЦЕЮЦЬ РУКІ?

Пры патлівасці канечнасцяў добра дапамагае ванначка са звычайнага аптэчнага рамонку. Заліце 6 ст. лыжак кветак 2 л кіпеню, накрыйце, дайце настояцца на працягу гадзіны. Працадзіце, падагрэйце, парце ў настоі рукі ці ногі, пакуль ён не астыне. Працэдуру рабіце 3—4 разы на тыдзень.

У КОЖНАГА ПРЭПАРАТА СВАЁ ПРЫЗНАЧЭННЕ

- *Антыперспіранты, якія змяшчаюць алюмініевыя галуны, прыглушаюць потавыдзяленне.*
- *Дэзадаранты заглушаюць пах поту духмянымі рэчывамі.*
- *Пудра ўсмоктвае пот і абсарбіруе пах.*
- *Сурвэткі, вырабленыя са стопрацэнтнай віскозы, забяспечваюць трайны эфект: ачышчэнне, свежасць і мяккі догляд.*

-2520-

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

Блізнятам варта рэальна разлічваць сілы, а Стральцы не павінны эканоміць на сне

ВАЕН. З панядзелка настройцеся на дзеянні, якія накіраваны на перабудову вашага жыцця на новы, больш высокі ўзровень. Пачынайце паступова вучыцца таму, чаго вам не хапае. У чацвер варта падрыхтаваць сябе да сюрпрызаў — Фартуна можа звярнуць на вас увагу. У канцы тыдня даўнія мары нарэшце пачнуць здзяйсняцца дзякуючы цярпенню і стараннасці, памножаным на працаздольнасць.

ЦЯЛЕЦ. Пачатак тыдня сустрэнеце з прыўзнятым настроем: яшчэ б, вашы поспехі ў прафесійнай дзейнасці варты зачаравання. Але захапленне работай можа адбіцца на іншых галінах жыцця — на іх проста не хопіць ні часу, ні сілаў. Пажадана распланаваць тыдзень, інакш ён будзе празмерна хаатычным.

БЛІЗНЯТЫ. Вы робіце добрае ўражанне на навакольных: ім падаецца, што вы можаце ўсё. Але ніхто не здагадваецца, як цяжка вам гэта даецца. Давярайце сваёй інтуіцыі — яна падкажа правільнае рашэнне, якое вам так неабходна. Рэальна разлічвайце сілы, не даводзьце сябе празмернай нагрузкай да нервовага зрыву.

РАК. Спакой на гэтым тыдні вам толькі сніцца. Пастарайцеся заняць пазіцыю чакання, назапасіць сілы і ўзброіцца ведамі і мудрасцю. Тады ваш раптоўны рывок наперад прывядзе да перамогі над абставінамі. Трымайце ў парадку важныя дакументы і не цягніце з праблемамі, якія неабходна вырашыць.

ЛЕЎ. Лепш не спрабуйце пачынаць штосьці новае і арыгінальнае. Поспеху падобныя прадпрыемствы мець не будуць, а часу і сілаў аднімуць масу. Завяршайце тое, што пачата, будуйце планы і ўспрымайце ўсё спакойна. Непажадана пашырэнне галіны дзейнасці на рабоце. Справы, якія пачняце ў суботу, будуць удавацца і парадуюць сваімі вынікамі.

ДЗЕВА. Даведаецеся шмат новага пра сваю работу. Пастарайцеся не змяняць нічога вакол, перачакайце буру, якая прыбліжаецца, інакш проста напалохаеце сваіх калег, і на вас усе будуць глядзець коса. Стан нявызначанасці можа працягнуцца некалькі дзён, але пакуль не наступіла яснасць, не прымайце нічый бок.

ШАЛІ. Неабдуманыя дзеянні катэгарычна недапушчальныя. Нават у дробязях і ў тых выпадках, калі дзейнічаеце па звычцы. Можаце разлічваць на вопыт і падтрымку блізкіх людзей. Не вельмі спрыяльны час для таго, каб вырашаць праблемы па рэцэпце Аляксандра Македонскага. Інфармацыю, якая будзе паступаць у чацвер і пятніцу, неабходна дакладна правяраць.

СКАРПІЁН. Пастарайцеся хоць на гэтым тыдні разгрузіць сябе ад лішніх і чужых спраў. У панядзелак нечаканыя праблемы могуць стаміць і практычна давесці да стрэсу. Не апускайце рук — у вас усё атрымаецца, але спатрэбіцца на парадак больш намаганняў. У сераду варта кінуць усе намаганні на вырашэнне старых праблем.

СТРАЛЕЦ. Справы могуць пайсці не зусім так, як вы чакалі, перспектывы будуць даволі туманнымі. Калі не ўпэўненыя ў сваіх дзеяннях, лепш не спяшацца. Гэта прадбачлівасць дазволіць пазбегнуць многіх праблем у далейшым. Не эканомце час на сне, каб да іншых фактараў не дадалася яшчэ і рассеянасць. У пятніцу скарыстайце да мінімуму зносіны з сусядзямі і роднымі.

КАЗЯРОГ. З'явіцца шанц пакарыць чарговую завоблачную вяршыню, якая недаступная для тых, хто схільны цвяроза ацэньваць свае магчымасці. У панядзелак ці аўторак спіс вашых прамых абавязкаў можа папоўніцца новымі пунктамі. У канцы тыдня акуняецеся ў паток важных і неадкладных спраў — выбірайце першачарговыя.

ВАДАЛЕЙ. Рызыкуеце вельмі позна ўспомніць адзін з жыццёвых урокаў, які мог бы вам дапамагчы. Асцерагайцеся неабдуманых учынкаў, нават калі дзеля таго, каб іх абдумаць, давядзецца не спаць начамі. У суботу давядзецца самастойна выкручвацца з сітуацыі, у якую вы ўцягнулі сябе і блізкіх людзей.

РЫБЫ. Калі вы стараецеся зрабіць «як лепш», а атрымліваецца «як заўсёды» — гэта знак таго, што вы не заўсёды разумееце, што насамрэч робіце. Не распыляйцеся — пастаўце сабе канкрэтную мэту. У аўторак дзелавыя партнёры запатрабуюць выканання заказаў. Не выключана, што ў суботу давядзецца папрацаваць, затое ў нядзелю павесяліцеся ад душы.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК,